№ 29 (435) 5 жніўня 2005

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы



**Мікола Статкевіч**
у беларускім Шушанскім.
Старонка 6

**ЭГУ пачынае беларускамоўнае навучаньне**
Інтэрвію з Ігарам Бабковым.
Старонка 15

**Капітан Нэма быў каліноўцам**
Таемнае жыцьцё Жуля Вэрна.
Старонка 19

# Савецкія палякі супраць беларускіх

**«Асобныя беларусы пахваляюць: добра дае гэтым палякам!»** Рэпартаж з Горадні — старонка 12. Апытаньне «НН»: ці можна ў Беларусі атрымаць палітычныя дывідэнды, гуляючы на антыпольскіх пачуцьцях? Старонка 13. Чаму частка СПБ падтрымала Лукашэнку? **Тадэвуш Кручкоўскі (на фота)** у «Дом Польскі» ўвайшоў на АМАПаўскіх штыхах. Старонка 14. Марыюш Машкевіч: «Гэта палітыка эўрапейскага маштабу. Для Масквы важна паказваць, што новыя сябры Эўразьвязу безадказныя, што яны ствараюць небясьпеку для старых сяброў Эўразьвязу». Старонка 14.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## ГРАМАДЗТВА

**Падарунак Яна Паўла Менску**

У Менск прывезьлі абраз Найсьвяцейшай Панны Марыі, падораны архікатэдральнаму касьцёлу Янам Паўлам II незадоўга да ягонай сьмерці і напісаны адмыслова італьянскім мастаком. Абраз увышкі больша за два мэтры. На ім — Божая Маці, над галавой у яе — 12 зорак, а ад рук разыходзяцца промні. У жніўні абраз будзе зьмешчаны ў абноўленым галоўным алтары менскай катэдры. Іншыя навіны — **старонка 3.**

## КУЛЬТУРА

**LLL-мульты выходзяць на CD і DVD**

«Мульт-клюб» у Інтэрнэце наведалі 160 тысяч чалавек. Адначасова флэш-аніматарам, які малюе Лукашэнку, зацікавіліся спэцслужбы. **Старонка 9.**

## СЭЛЕКТАР

**Мікрафон уласьці**

З падслуханага на беларускім радыё. Старшыня сельсавету пра адраджэньне вёскі: «Дэмаграфічная сытуацыя ў нас стабільная, на тэрыторыі сельсавету пражывае дваццаць адзін вэтэран і тры інваліды». Запісы Тацяны Барысік. **Старонка 20.**

## ГУТАРКА

**Дарус Куоліс: «Радзіма — гэта не зямля і межы, а правы і свабоды»**

«Татальнае наступленьне рэклямы, фармаваньне грамадзтва спажываньня перашкаджае стварэньню грамадзянскай супольнасьці, навязвае зусім іншыя сыстэмы каштоўнасьцяў. Як у пачатку 1990-х, мы павінны ісьці супраць гэтай плыні». **Старонка 2.**

**Дык падпісвайся!**

На любой пошце можна аформіць падпіску на верасень—сьнежань. Падпісны індэкс газэты «Наша Ніва» 63125. Падпіска для прыватных асобаў будзе каштаваць 4510 рублёў на месяц, для арганізацыяў — 5631 рубель. Падпіска на шапікі «Белсаюздруку» таньнейшая: 3340 рублёў на месяц. «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень.

## Дэмакраты адолелі экватар

Адбыліся 75 раённых сходаў дэмакратычных сілаў з 146-ці. Найбольш дэлегатаў ад АГП.

Раённыя сходы дэмакратычных сілаў перайшлі экватар: абрана 150 дэлегатаў з 300, якія вылучаныя для прадстаўніцтва мясцовых суполак. Да канца ліпеня адбыліся 84 сходы па выбарах дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў: 75 паўнацэнных (25 удзельнікаў і больш) і 9 зь недастатковай колькасьцю ўдзельнікаў (ад 15 да 24). Агулам у сходах узялі ўдзел 3140 чалавек.

**Працяг на старонцы 3.**

## Саюз труса і ўдава

Партнэрства зь Беларусьсю цікавіць Кітай не само сабою. Яно разглядаецца ў кантэксьце стратэгічнай задачы ўцягваньня Расеі ў антыамэрыканскі сардэчны саюз. Чацьверты візыт Аляксандра Лукашэнкі ў Кітай абяцае быць цікавым. Піша **Раман Якаўлеўскі.**

**Працяг на старонцы 5.**

## Аляксандраўская бібліятэка

Аляксандар Лукашэнка папрасіў перанесьці адкрыцьцё Нацыянальнай бібліятэкі бліжэй да прэзыдэнцкіх выбараў. А яшчэ — каб у тым будынку прадугледзелі ягоны «прэзыдэнт-цэнтар» для сустрэч на найвышэйшым узроўні. Піша Сяргей Харэўскі.

Раней вялося, што функцыянаваць навюткая Нацыянальная бібліятэка будзе зь 1 студзеня, але цяпер прэзыдэнт сказаў, што сыпшацца ня трэба. «Галоўнае, каб усё было добра зроблена».

**Працяг на старонцы 3.**

## 50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

### Савецкія палякі супраць беларускіх

«Лукашэнка даў палякам па руках» — такое пасланьне закідаюць у масавую сьвядомасьць гэтымі тыднямі. «НН» прагназавала сем месяцаў таму, што ўлады паспрабуюць зглуміць на антыпольскіх настроях. Цяпер наш журналіст шукае адказу на пытаньне, ці прынясе такая гульня палітычныя дывідэнды. **Старонка 13**.

Лукашэнка душыць беларускіх палякаў і падтрымлівае савецкіх палякаў. Тых, на чале з Кручкоўскім. Якія лічаць толькі расейцаў і палякаў «сапраўднымі народамі», а беларускую грамаду — сваім галоўным ворагам. Кручкоўскі зараз будзе, як Козік у прафсаюзах. Нават прызы для найлепшых камбайнёраў-палякаў, мусіць, установіць. Гэныя савецкія палякі нагадваюць мне савецкіх габрэяў, якія асуджалі сіяністаў. Мы бачым, што канфлікт зусім ня ў тым, што «адны палякі супраць другіх», як кажа пасол Латушка. Адных арыштоўваюць, не даюць газэты надрукаваць. Другім АМОН нагамі адчыняе дзьверы ў Дамы Польскія. Беларускім палякам, частцы шматэтнічнай беларускай нацыі, «Наша Ніва» пасылае словы вітаньня і салідарнасьці. Словы Крыштофа Радзівіла: радзіма — гэта ня межы, ня землі, а свабоды і правы.

### Я жонкі ў бардэль не прадам!

Лукашэнкаўцы запэўніваюць, што гандаль сувэрэнітэтам не вядзецца. Гэта як калі б мужчына запэўніваў сваю жонку, што ён яе ў бардэль не прадасьць. Сама пастаноўка пытаньня выдае, што ў мужчыны ў галаве. Ці можаце ўявіць, каб прэзыдэнт Літвы, кароль Нарвэгіі ці султан Аману запэўнівалі, што сувэрэнітэту краіны не перапусьцяць? Такая дзяржаўная палітыка прыцягвае ўвагу сатырыкаў. Яны шчэ ёсьць! Пра LLL-мульты чытайце **на старонцы 9**.

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

Запрашаем валанцёраў далучыцца да аднаўленьня **замку ў Любчы з 16 да 26 жніўня**. Даведкі праз тэл. 646-54-56.

# Дарус Куоліс: «Радзіма — гэта не зямля і межы, а правы і свабоды»

Пра пэрспэктывы разьвіцьця літоўскае дзяржавы, фармаваньне сучаснай грамадзянскай супольнасьці і ролю ў ёй нацыянальных меншасьцяў Літвы гутараць дырэктар Інстытуту грамадзянскай супольнасьці доктар **Дарус Куоліс** і журналістка **Тацяна Ясінская**.

**— Выступ на навуковай канфэрэнцыі ў Віленскім унівэрсытэце, прысьвечанай захаваньню малых культур Эўропы, Вы пачалі з цытаты: «Радзіма — гэта не зямля і межы, а правы і свабоды». Каго Вы цытавалі?**

— У XVI—XVII стагодзьдзях нашы суайчыньнікі на пытаньне «Хто такі літовец?» адказвалі: «Той, хто любіць свабоду», а Крыштоф Радзівіл пісаў: «Радзіма — гэта ня межы, ня сьцены, ня землі, а свабоды і правы». Перш за ўсё — грамадзянскія правы.

### Наша традыцыя ідзе ад Рыму

**— Ці далёка адышлі мы сёньня ад такога разуменьня Радзімы?**

— Мы яшчэ не прыйшлі. І літоўская большасьць, і меншасьць усё яшчэ пачуваюцца ў літоўскай дзяржаве не раўнапраўнымі грамадзянамі, а асобнымі этнічнымі групамі. Асабліва насьцярожвае, што ідэнтытэт сёньняшняга літоўца мала чым адрозьніваецца ад ідэнтытэту літоўца савецкіх часоў. Усюды этнічнае разуменьне літоўца пераважае над грамадзянскім і палітычным.

А ў XVI—XVIII ст. літоўскае грамадзтва аб'ядноўвала менавіта гэтая *асобная прастора* грамадзянскіх правоў і каштоўнасьцяў. Тое самае было і ў 1920-х — у літоўскім урадзе былі міністры габрэйскага, беларускага паходжаньня, ствяралася супольная прастора нацыянальнай дзяржавы. У XVI—XVIII ст. мы мелі Першую Рэспубліку (Рэч Паспалітую), спачатку асобную, затым разам з польскім народам, якая выключалася ў агульнаэўрапейскім кантэксьце. На зьмену свабодным рэспублікам прыходзілі абсалютысцкія манархіі, а Літва і Польшча яшчэ доўга захоўвалі традыцыю Рымскай Рэспублікі. Так што дэмакратычны лад жыцьця і формы грамадзянскага жыцьця ня толькі пераносяцца да нас з Захаду — яны нам гістарычна ўласьцівы.

**— А як іх зноў актуалізаваць?**

— Вывучаць гісторыю і ўважліва чытаць кнігі.

### Паралельны сьвет

**— Як жывецца сёньня ў Літве прадстаўнікам нятытульных нацый?**

— На апошніх выбарах у Сойм грамадзяне польскага і расейскага паходжаньня практычна не галасавалі за прадстаўнікоў правых партый. Гэта гаворыць як пра тое, што ў расейцаў і палякаў няма ўсёй паўнаты палітычнага спэктру, так і пра тое, **што правыя сілы Літвы не знаходзяць глебы для дыялёгу зь імі.**

**Працяг на старонцы 11.**




**Як стала вядома агенцтву «Інтэрфакс» з крыніцы, блізкай да расейскага МЗС, Дзьмітры Аяцкаў захварэў. Прычым так сур'ёзна, што, магчыма, менскі клімат яму будзе супрацьпаказаны. Паводле зьвестак крыніцы, сытуацыя можа быць вырашаная двума спосабамі: або Аяцкаў прынясе прабачэньні за выказваньні на адрас А.Лукашэнкі, або ягонае прызначэньне будзе адмененае. «Цяпер гэта ўсё абмяркоўваецца. Ня выключана, што Аяцкаў зусім не паедзе ў Менск, напрыклад, на падставе хваробы: ляжа ў бальніцу, а паслом паедзе іншы чалавек», — патлумачыла крыніца. Скандал учыніўся пасьля панібрацкіх выказваньняў пасла на адрас А.Лукашэнкі ў інтэрвію саратаўскім СМІ.**
**На фота: паведаміць, дзе Аяцкаў, не змагла нават праваднiца вагону №2 цягніка «Масква—Менск», якім гора-пасол мусіў прыехаць у Беларусь.**

## Сьвежы нумар часапісу «ARCHE»

Найтаўсьцейшы за апошнія гады — мае 376 старонак. Ён апісвае тэхналёгію стварэньня афіцыйнай беларускай прапаганды.

Літоўскі палітоляг Нерус Прэкявічус і яго беларускія калегі Андрэй Казакевіч ды Пётра Рудкоўскі разглядаюць ня толькі звычайны «газэтны», але і тэлевізійны прапагандысцкі дыскурс, па костачках разьбіраючы сумнавядомыя «шэдэўры» апошняга часу — сэрыялы «Найноўшая гісторыя», «Канспіралёгія», а таксама драбнейшыя прапагандысцкія рэпартажы і ролікі накшталт «Дарогі ў нікуды» і сакрэты падрыхтоўкі матэрыялаў газэтай «Беларусь сегодня».

Адкрываюць нумар аналізы сёньняшніх палітычных працэсаў — Уладзімера Мацкевіча і Андрэя Ягорава «Перамога над рэжымам або сьмерць нацыі: дылема будучых прэзыдэнцкіх выбараў» і палітычнага аглядальніка *The International Herald Tribune* Уільяма Пфафа «Што засталося ад Эўрапейскага зьвязу?». Гвозд нумару — аналіз японскага палітоляга Кімітакі Мацузаты «Рэжым Лукашэнкі як выспа папулізму ў акіяне кланавай палітыкі».

Віталь Сіліцкі крытыкуе апошнюю кніжку Аляксандра Фядуты, Даніла Жукоўскі — творчасьць Барыса Пятровіча, амэрыканскі гісторык Тэадор Уікс — сьвежыя публікацыі аб ідэнтычнасьці ў позьнеімпэрскай Расеі.

Палітолягі Тымаці Гартан Эш і Дамінік Арэль разважаюць пра парадоксы Аранжавай рэвалюцыі. Філёзафы Эрык Гобсбаўм і Фрэнсіс Фукуяма пішуць пра самыя небясьпечныя ідэі ў сьвеце.

Увагу аматараў айчыннай літаратуры безумоўна прыцягне падборка тэкстаў пра Анатоля Сыса, а айчыннай гісторыі — дасьледаваньне Алеся Пашкевіча і Андрэя Чарнякевіча пра нямецкую агентуру ў беларускім нацыянальным руху.

У нумары таксама публікуецца апошняя маштабная праца нядаўна памерлага перакладчыка Карласа Шэрмана — пераклад раману Габрыеля Гарсіі Маркеса «Каханьне падчас халеры». Аматары




паэзіі без сумневу атрымаюць вялізную асалоду ад твораў двух паэтаў зь непаўторнымі галасамі — Аляксея Знаткевіча і Андруся Храпавіцкага.

### Нашэсьце мурашоў

Днямі Менск атакавалі эскадрыльі крылатых мурашак. Яны лёталі па вуліцах, кідаліся на галовы мінакоў, абляпілі роем клямкі. Напалоханыя менчукі, у сваю чаргу, атакавалі гарадзкі цэнтар гігіены і эпідэміялёгіі. Але там займаюцца толькі тымі вусякамі, што маюць мэдычнае значэньне, — крывасмокамі.



У Інстытуце заалёгіі НАН Беларусі сказалі, што нічога надзвычайнага тут няма. Падобныя вылеты назіраюцца штогод і не нясуць небясьпекі. Аднак растлумачыць, чаму сёлета мурашак аж столькі многа, не змаглі. Маўляў, былі спрыяльныя ўмовы для размнажэньня, «вінаваты» тэмпэратурны скачок. Як высьветлілася, у краіне сёньня няма навукоўца-спэцыяліста па мурашках.

**ТН**



МАЛЮНАК ГЭНІКА ЛОЙКІ

# Хто інтрыгуе на «Нямецкай хвалі»

Мяркую абсалютна неабходным зноў зьвярнуцца да тэмы будучай перадачы «Беларускія хронікі» на «Нямецкай хвалі» і яе мовы. У перадапошнім нумары «НН» (№27, 22 ліпеня 2005) старшыня ТБМ А.Трусаў выклаў свой погляд на нежаданьне расейскай рэдакцыі радыё рабіць перадачу па-беларуску. Як высьветлілася, супраць ня толькі рэдакцыя.

26 ліпеня ў перадачы «Сутнасьць справы» расейскай «Нямецкай хвалі» прагучала гутарка аўтара перадачы Аляксандра Сакалова з А.Лябедзькам, С.Калякіным і журналістам М.Маркевічам. Аўтар і палітыкі завочна палемізавалі з сп.Трусавым як падпісантам ліста ТБМ на «Нямецкую хвалю», а таксама з сп.Маркевічам, які падтрымаў пазыцыю ТБМ.

Працяг на старонцы 15.

ПРЭЗЫДЭНТ-2006

## Дэмакраты адолелі экватар

Працяг з старонкі 1.

«У кожнай вобласьці ёсьць месцы, дзе іх правесьці ня ўдасца, — напрыклад, ва Ўзьдзе, — прызнаецца намесьнік старшыні Партыі БНФ Віктар Івашкевіч. — Але я думаю, што 2/3 дэлегатаў мы выберам. Неўзабаве павінны прайсьці сходы ў Віцебску, Воршы, Наваполацку, Полацку, Слуцку, Салігорску — гэта з буйных гарадоў», — тлумачыць ён.

Партыйная прыналежнасьць дэлегатаў на сёньня выглядае так:

АГП — 37;
ПБНФ — 36;
ПКБ — 23;
БСДП (Г) (Казулін) — 6;
«Малады фронт» — 5;
Партыя працы — 4;
БСДП (НГ) (Статкевіч) — 3;
БСДГ — 1;
КХП-БНФ — 1;
беспартыйныя актывісты, прадпрымальнікі з «Пэрспэктывы» ды інш. — 34.

На мінулых выхадных сходы адбыліся ў Паставах і Лепелі.

На нядзельны сход дэмакратычнай грамадзкасьці азёрнага краю сабраліся 26 чалавек. Перад імі выступілі давераны прадстаўнік Аляксандра Мілінкевіча Вінцук Вячорка, кіраўнікі віцебскіх абласных арганізацыяў Партыі БНФ, АГП і БСДП (НГ) Кастусь Смолікаў, Алена Залеская й Аляксей Гаўруцікаў. Сход вёў знаны краязнаўца Міхась Гіль; у паседжаньні ўзяў удзел легендарны змагар за незалежную Беларусь, вязень ГУЛАГу Антось Фурс.

Дэлегатамі на Кангрэс дэмакратычных сілаў ад Пастаўшчыны шляхам таемнага альтэрнатыўнага галасаваньня выбраныя двое сяброў БСДП (Грамады).

Пасьля сходу В.Вячорка, сябар Сойму БНФ Аляксей Кавалец і мастак Алесь Цыркуноў наведалі мясьціны, зьвязаныя з жыцьцём і творчасьцю мастака й паўстанца 1863 году Альфрэда Ромэра. Яны ўшанавалі й упарадкавалі магілу сябра нацыянальна-вызвольных арганізацыяў, паўстанца 1863 году Флярыяна Даноўскага ў Каралінаве, скульптурнае надмагільле да якой уласнаруч зрабіў спадар Цыркуноў.

На лепельскі сход, які адбыўся ў прыватным доме, сабраліся мясцовыя дэмакратычныя дзеячы, актывісты прадпрымальніцкага руху, сябры камандаў дэмакратычных кандыдатаў на апошніх выбарах. Перад імі выступілі лідэр ПКБ Сяргей Калякін, старшыня Партыі БНФ В.Вячорка, намесьнік старшыні АГП Аляксандар Дабравольскі. Прысутныя задалі гасьцям шмат вострых пытаньняў пра стратэгію й тактыку аб'яднаных дэмакратычных сілаў на пэрыяд да лета 2006 году, супольную плятформу, дачыненьні з Расеяй.

У выніку таемнага галасаваньня сход выбраў сваімі дэлегатамі на Кангрэс дэмакратычных сілаў двух беспартыйных актывістаў. Лепельскія прадпрымальнікі шчодра пачаставалі сабраных сьвежай садавінай.

**Аркадзь Шанскі**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Аляксандраўская бібліятэка

Працяг з старонкі 1.

У бібліятэцы сапраўды будзе ўсё — нават бізнэс-цэнтар з крамамі, галерэямі, канфэрэнцзаламі, рэстарацыямі, паркінгамі, саўнай й трэнажорамі. Згодна з новым штатным раскладам, у Нацыянальнай бібліятэцы будзе працаваць сама меней тысяча чалавек.

Вакол плянуецца разьбіць велізарны супэрпарк, што можа прымаць адначасова пяць тысяч чалавек. Будзе тут і «Міні-Беларусь» з макетамі гарадоў і вёсак, і «Мазаіка сьвету» зь церамамі-крэндзелямі, сярэднявечнымі замкамі ды азіяцкімі садамі. Зьмесьцяцца тут і канцэртны амфітэатар, і бульвары, і, відаць, трасы для лыжнікаў.

Шоў з адкрыцьцём бібліятэкі пяройме эстафэту сьвяткаваньняў двух шасьцідзесяцігодзьдзяў сканчэньня вайны. Выключная падзея агульнанацыянальнага маштабу напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў. Хто сумняецца ў тым, што чырвоную стужачку перарэжа менавіта Лукашэнка? 1 студзеня — гэта зарана, а вось пад самыя выбары — тое што трэба. Рыхтык як рымскія імпэратары сьпяшаліся будаваць усё новыя, сваё форумы.

Новы шкляны шматграньнік бібліятэкі з паркамі, мэмарыяламі славутых беларускіх дзеячаў з шасьціметровым Скарынам на чале стане новым цэнтрам новае сталіцы Беларусі.

Грошы на новую бібліятэку, будаўніцтва якой нібы завяршаецца, зьбіраліся па ўсім сьвеце. Нават Садам Хусэйн адшкадаваў пачак даляраў. А «добраахвотныя ахвяраваньні» склалі дастаткова значную суму — 4,5 мільярды беларускіх рублёў, больш за 500 тысяч даляраў і каля 50 тысяч эўра. Нямала, як для нашай краіны.

«Якая краіна, такая й бібліятэка», — сказаў у адным з інтэрвію генэральны дырэктар Расейскай дзяржаўнай бібліятэкі Віктар Фёдараў. Спрачацца не выпадае. Пагатоў калі ведаць, што ў той самай расейскай бібліятэцы — 400 тысяч новых паступленьняў на год. То бок за якіх 20 гадоў можна сабраць кніг столькі ж, колькі ў колішняй менскай «Ленінцы». А вось да прэзыдэнцкіх апартамэнтаў у галоўнай бібліятэцы краіны не даўмеліся нават у Маскве.

Пакуль урачыстае адкрыцьцё Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі плянуецца 1 верасьня 2006 году. А дваццаць дзьве бібліятэчныя залі, у якіх змогуць працаваць адначасова дзьве тысячы чытачоў, адчыняцца 1 студзеня 2007 году. Чакаецца, што будзе забясьпечаны й камputарны доступ карыстальнікаў да фондаў бібліятэкі, дзеля чаго падпісана дамова з Кітаем на пастаўку абсталяваньня на суму 1 млн даляраў.

Стары будынак бібліятэкі, які быў задуманы 75 гадоў таму, якім гэтак ганарыўся Менск, дзе выгадаваліся пакаленьні нашых інтэлігентаў, чакае новых гаспадароў.

СЬЦІСЛА

### Абавязковыя дэкляроцыі для ўсіх дзяржслужбоўцаў

У парлямэнце разглядаецца праект зьмяненьняў і дапаўненьняў у некаторыя законы па пытаньнях дэкляраваньня даходаў і маёмасьці. У новым законапраекце прадугледжваецца абавязковае штогадовае дэкляраваньне маёмасьці і даходаў для ўсіх дзяржслужбоўцаў і кіраўнікоў дзяржарганізацый. Паводле думкі некаторых дэпутатаў, падобная практыка павінна распаўсюджвацца і на шэраг кіраўнікоў прадпрыемстваў недзяржаўнай формы ўласнасьці, што атрымліваюць датацыі ці матэрыяльную падтрымку ад дзяржавы.

### Пэнсіянэраў большае

За апошнія 15 гадоў колькасьць пэнсіянэраў у Беларусі ў разьліку на 100 работнікаў павялічылася з 46 да 60 чалавек. Сёньня ў Беларусі налічваецца 2,5 млн пэнсіянэраў. Такія лічбы былі агучаныя на нарадзе ў прэзыдэнта па пытаньнях пэнсійнага забесьпячэньня. Штогод на пэнсійныя выдаткі расходуецца Br3 млрд.

### Экстранныя нумары з мабільніка

Правілы набору нумароў экстраннай дапамогі для абанэнтаў Velcom, МТС і «БелСел» цяпер аднолькавыя. Праўда, ня ўсе мадэлі мабільнікаў успрымаюць двухзначныя нумары. Так, пасьля адпаведнага нумару службы неабходна набраць адну ці дзьве любыя лічбы. Для выкліку «хуткай» — 033 ці 0333, міліцыі — 022 ці 0222, пажарнай службы — 011 ці 0111.

**АГ; belta.by**

# Вораг народу

Расейскія ўлады ненавідзяць ня столькі тэрор і тэрарыстаў, колькі журналістаў, якія наважваюцца расказваць праўду аб яго прычынах. Артыкул **Віталя Тараса**.

### Гістэрыя па-расейску

Дыпляматычны скандал паміж Беларусьсю й Польшчай ня выклікаў належнай увагі ў Расеі ні СМІ, ні МЗС, да якога спрабавала апэляваць Варшава. Затрымка з прыездам у Менск новага расейскага пасла Аяцкава, выказваньні якога не спадабаліся Лукашэнку, таксама ня выклікала камэнтараў расейскіх афіцыйных асобаў. Ну а тэма беларускіх зьніклых больш ужо расейскіх мас-мэдыя не цікавіць даўно…

Інтэрвію на амэрыканскім тэлеканале ABC, якое Шаміль Басаеў даў карэспандэнту расейскай службы «Радыё Свабода» Андрэю Бабіцкаму ў начным этэры, выклікала гнеўную рэакцыю расейскага замежнапалітычнага ведамства ў форме адмысловай заявы. У пятніцу 29 ліпеня большая частка галоўнай інфармацыйнай праграмы каналу РТР «Весткі» была прысьвечана асудженьню паказу інтэрвію тэрарыста.

Здавалася б, адсутнасьць рэакцыі Масквы на неўрапейскія паводзіны партнэра ў дачыненьні да Польшчы і амаль гістэрычная рэакцыя на зьяўленьне ў амэрыканскім тэлеэтэры Басаева можна калі не апраўдаць, то зразумець. Прынамсі, на гэта разьлічвалі арганізатары прапагандысцкай кампаніі, якую адразу падхапілі беларускія афіцыйныя СМІ. Басаеву прыпісваецца арганізацыя многіх тэрактаў — у тым ліку захоп тэатру на Дуброўцы ў Маскве і Беслан, дзе ў выніку штурму захопленай ваяўнікамі школы загінулі 330 чалавек, у тым ліку 186 дзяцей. А.Бабіцкі, карэспандэнт радыё «Свабода» ў Празе, такім чынам адразу ператвараўся ў несумленнага журналіста, здрадніка ды памагатага тэрарыстаў.

### Боязь праўды

Праўда, пераканаўчымі доказамі датычнасьці Басаева да злачынства ў Беслане расейская пракуратура ды іншыя органы ўлады сябе не абцяжарваюць. Яны спасылаюцца на… тэрарыста Нурпашы Кулаева, які цяпер адзін адказвае ў судзе за ўсё, што адбылося ў гэтым асецінскім мястэчку амаль год таму. А гаворачы пра Бабіцкага, расейскія калегі неяк усе разам забыліся на тое, што некалькімі гадамі раней — задоўга да Дуброўкі й Беслану — ФСБ учыніла сапраўдную правакацыю супраць журналіста. Спачатку абвясьцілі, быццам «чэкісты» вызвалілі Бабіцкага з рук «чачэнскіх бандытаў», а потым — быццам ён зьнік пры таямнічых акалічнасьцях. Тым часам яго «прасавалі» ў лягеры для ўцекачоў, трымалі яго ды ягоную сям'ю пад страшэнным псыхалягічным ціскам. І толькі рэзкія пратэсты замежных журналістаў і палітыкаў вымусілі расейскія ўлады выпусьціць карэспандэнта на волю… Тады за свайго карэспандэнта заступілася кіраўніцтва радыё «Свабода», для якога Бабіцкі рабіў рэпартажы, пачынаючы зь першай чачэнскай вайны. Цяперашняе інтэрвію, запісанае ў гарах Каўказу, кіраўніцтва радыё ў этэр выдаць не наважылася. Відаць, збаялася абвінавачаньняў Масквы ў патураньні тэрарызму.

Кампанія ABC падобных комплексаў ня мае. Вядучы праграмы «Найтлайн» напачатку нагадаў слухачам, хто такі Басаеў — «адзін з самых небясьпечных тэрарыстаў у сьвеце, лідэр чачэнскіх паўстанцаў, галоўны вораг Расеі, за галаву якога прызначана ўзнагарода ў 10 млн. даляраў».

Расейскі бок усяляк спрабаваў перашкодзіць выхаду інтэрвію ў этэр. «ABC News» прыняла рашэньне праігнараваць довады пасольства Расеі супраць паказу інтэрвію. «Сваімі дзеяньнямі «ABC News» дэманструе абуральную пагарду да ўсіх стандартаў адказнай журналістыкі, а таксама асноўных чалавечых каштоўнасьцяў», — абураецца расейскае пасольства ў Вашынгтоне. Пра стандарты журналістыкі гаворка яшчэ наперадзе.

### Двайныя стандарты Расеі

Што ж да прынятых ва ўсім цывілізаваным сьвеце стандартаў, то ўмешвацца ў праграмную палітыку незалежных мас-мэдыя іншых краін не прыходзіла ў галаву нават савецкім кіраўнікам. Адзінае, што яны маглі супрацьпаставіць заходняй прапагандзе і што сапраўды рабілі, — гэта глушыць замежныя «радыёгаласы». Такое ўражаньне, што, разграміўшы свае незалежныя тэлеканалы, паставіўшы на калені незалежную прэсу ды прылашчыўшы асобных журналістаў, цяперашняе расейскае кіраўніцтва вырашыла паспрабаваць «паставіць на месца» заходнюю прэсу. Не атрымалася.

Зразумела, фэльдфэбэльскім манерам, якім так хутка навучыліся расейскія ўлады ў Беларусі, надаюцца высакародныя матывы. Барацьба зь міжнародным тэрарызмам — што можа больш адпавядаць чалавечым каштоўнасьцям? Праўда, нешта не чуваць, каб Масква была ўстурбаваная тым, каб, напрыклад, дапамагчы Міжнароднаму трыбуналу ў Гаазе знайсьці Караджыча й Младзіча, на сумленьні якіх тысячы жыцьцяў мусульман Срэбраніцы. Што ўжо казаць пра чачэнцаў, жыцьці якіх увогуле нічога ня вартыя… Прынамсі, такая лёгіка прысутнічае ў развагах расейскіх афіцыйных асобаў і дэпутатаў Думы.

А ці можна, дарэчы, прыгадаць заявы МЗС Расеі з нагоды трансьляцыі фрагмэнтаў інтэрвію бэн Ладэна ці іншых дзеячаў «Аль-Каіды» ў заходніх СМІ?

Для таго каб падмацаваць высокамаральную пазыцыю расейскіх уладаў, у расейскім тэлеэтэры гэтым разам былі выкарыстаныя дзіцячы лекар Рашаль, брытанскі прэм'ер Тоні Блэр (ён асудзіў мусульманскіх тэрарыстаў пасьля выбухаў у лёнданскім мэтро!) і нейкі ізраільскі спэцыяліст у галіне антытэрору Ісак Штэрн, які лічыць, што тэрарыстам нельга «даваць пляцоўку» ў СМІ. Добра, што гэты спэцыяліст не вызначае палітыкі Ізраілю ў галіне свабоды слова. Інакш сьвет, у тым ліку і арабскі, ня змог бы бачыць і слухаць інтэрвію ды выступы Ясіра Арафата — чалавека, якога Ізраіль лічыў сваім ворагам нумар адзін, але які мог кантактаваць з журналістамі заходніх і ўсходніх выданьняў і тэлерадыёкампаніяў нават ва ўмовах «аблогі» ягонай рэзыдэнцыі ў Палестыне.

### Інтэрвію з д'яблам

Цікава, што расейскія журналісты на канале РТР некалькі разоў сарамліва агаварыліся — інтэрвію з Басаевым амэрыканскіх (!) законаў і канстытуцыі не парушае. Але ж гаворка, бачыце, тычыцца маральнага боку справы. Лекар Рашаль заявіў, што браць сёньня інтэрвію ў Басаева — тое самае, што некалі было б узяць інтэрвію ў Гітлера. Дапусьцім, у амэрыканскіх і брытанскіх журналістаў не было магчымасьці запісаць такое інтэрвію. Але ў Сталіна заходнія журналісты інтэрвію бралі рэгулярна! Няўжо ім нічога не было вядома пра сталінскія злачынствы — пра раскулачваньне, голад, працэсы над трацкістамі-зіноўеўцамі, ГУЛАГ? Нават калі журналісты ня мелі на руках дакладных лічбаў, наўрад ці хоць адзін разумны чалавек на Захадзе мог сумнявацца ў прыродзе сталінскага рэжыму, заснаванага на татальным тэроры й рэпрэсіях. Ахвярай сталінскіх рэпрэсій быў і чачэнскі народ. Пра што нагадаў, дарэчы, амэрыканскі журналіст, даючы этэр Басаеву. Між іншым, ні тэлевядучы, ні журналіст, які запісваў інтэрвію зь ім, не апраўдвалі й тым больш не ўсхвалялі тэрарызму. Яны проста сумленна выконвалі працу. На Захадзе журналісцкая работа палягае ў тым, каб як мага паўней падаць падзею ці асобу, якая выклікае цікавасьць, закранае пачуцьці й думкі людзей. І праз тое — ня толькі пазабавіць, але й прыцягнуць увагу грамадзтва да болевых кропак сучаснасьці. Толькі так грамадзтва можа вылечыцца ад самых страшных праблем — не адварочваючыся, але пільна ўглядаючыся, спрабуючы зразумець саму іх сутнасьць. У тым ліку праблему тэраразму. Аксіёма? Не для ўсіх.

### Параксізм нянавісьці

У Расеі, як і ў Беларусі, праца журналіста ва ўяўленьні ўладаў палягае ў тым, каб не закранаць забароненых тэм, чорнага й белага не называць, ні ў якім разе не гаварыць зь людзьмі, чые словы ці нават самі прозьвішчы могуць быць непрыемныя начальству. Сапраўды, якія эмоцыі можа выклікаць у Пуціна, Патрушава ці рознага кшталту генэралаў спэцслужбаў імя Басаева, якога столькі разоў абвяшчалі забітым, сьмяротна параненым, хворым на гангрэну і гэтак далей, а ён усё яшчэ застаецца на волі?

Што ж такога непрыемнага для расейскай улады сказаў ён у згаданым інтэрвію? Што выклікала параксізм нянавісьці ў Расеі?

«У Чачні я выкарыстоўваю мэтады, якія зьяўляюцца разумнымі і прымальнымі. Ні я, ні мае маджахеды не забівалі дзяцей. Ні тут, ні там. Не было забойстваў», — кажа Басаеў. «Мана!» — крычаць расейскія пракуроры. Гэтак сама яны крычалі пра газ, якім карыстаўся спэцназ на Дуброўцы, — газ, якога нібыта не было, а калі й быў, дык ніхто не атруціўся, а калі й атруціўся — дык гэта прымальныя страты…

А можа быць, вось гэтая цытата выклікала нэрвовую рэакцыю: «Так. Дзеці не вінаватыя. Але адказнасьць ляжыць на ўсёй расейскай нацыі»? Ці гэта: «Калі вайна ня дойдзе да кожнага зь іх, у Чачніі гэта ніколі ня скончыцца». На пытаньне, ці можа паўтарыцца трагедыя ў Беслане, Басаеў адказвае: «Канечне. Пакуль будзе працягвацца генацыд у Чачніі, пакуль гэтая разьня ня спыніцца, усё можа здарыцца». Можна ўбачыць за гэтымі словамі патураньне тэрарызму, здраду радзіме. А можна, нарэшце, задумацца над прычынамі таго тэрарызму і над пытаньнем, чым ёсьць сёньня Расея.




**Генпракуратура Расеі афіцыйна прызнала факт выкарыстаньня ў Беслане танкаў і ручных агнямётаў аб'ёмнага выбуху.**

**Прадстаўнікі ўладаў настойваюць на тым, што выкарыстаныя агнямёты не маглі выклікаць пажар.**

**Пацярпелыя ад тэракту ў Беслане падчас суду над тэрарыстам Нурпашом Кулаевым (на фота) раз за разам паўтаралі ў сваіх паказаньнях, што пры штурме школы №1 вайскоўцы ўжывалі агнямёты «Чмель» і цяжкую тэхніку, у прыватнасьці танкі.**

**Пракуратура палічыла за лепшае нічога не гаварыць пра фазу штурму, падчас якой былі ўжытыя агнямёты, — былі ў гэты час у школе закладнікі ці не. Сьведкі, што выступалі на судзе ва Ўладзікаўказе, паказвалі, што стральба з танкаў была ў той момант, калі яны ляжалі на падлозе спартзалі.**

**Пракуратура настойвае, што стралялі па школе з агнямёта «Чмель» РПО–А. Літара «А» паказвае на тое, што ў агнямёце прымяняецца зарад тэрмабарычнага дзеяньня, гэта значыць такі, які выклікае аб'ёмны выбух, што зьнішчае ўсё ў памяшканьні аб'ёмам да 90 кубічных мэтраў.**



# Саюз труса і ўдава

Працяг са старонкі 1.

Беларуска-кітайскі палітычны дыялёг захоўвае інтэнсіўнасьць. Працягнуты ў апошнія гады абмен шматлікімі візытамі дэлегацый самага рознага ўзроўню служыць пацьвярджэньнем далейшага пашырэньня дачыненьняў з КНР.

Ёсьць падставы меркаваць, што ў найбліжэйшы час кітайская тэма будзе займаць у кіраўніцтва Беларусі ня меншае месца за расейскую. Кантакты рознага ўзроўню, не гаворачы ўжо пра найвышэйшы, з краінамі Эўропы і ЗША аказаліся ў замарожаным стане. Таму чацьверты — а ў якасьці кіраўніка краіны трэці па ліку — візыт Лукашэнкі ў Кітай абяцае быць цікавым.

Асабліва ў кантэксьце збліжэньня Расеі з Кітаем, якое адбываецца на фоне абвастрэньня амэрыкана-кітайскіх дачыненьняў. Дайшло нават да заявы кітайскага генэрала пра гатоўнасьць ужыць ядзерную зброю супраць ЗША і зьнішчыць 200 амэрыканскіх гарадоў. Кітай сапраўды ў стане гэта зрабіць. І гэтая заява стала для амэрыканцаў шокам. Той антыамэрыканізм, які так старанна дэманструе стратэгічны саюзьнік Масквы ў асобе афіцыйнага Менску, вельмі нават упісваецца ў пляны Пэкіну на XXI ст. Безаглядная імкненьне менскіх стратэгаў зьліцца ў антыамэрыканскім экстазе часам нават неяк міжволі нагадвае паводзіны камуністычнай Альбаніі — некалі вернага саюзьніка Кітаю ў Эўропе 1960-х. Тады Тырана нават адгукнулася на пляны Пэкіну разьмясьціць на тэрыторыі краіны кітайскія ракеты. Сёньня кітайская экспансія на эўрапейскім кантынэнце ажыцьцяўляецца цераз навадненьне таннымі таварамі рынку краін Эўразаюзу. Усё больш кітайская экспансія закранае і краіны СНД.

Антыамэрыканізм, які старанна дэманструе афіцыйны Менск, вельмі ўпісваецца ў пляны Пэкіну на XXI стагодзьдзе.



МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

Пяць год таму з афіцыйным візытам у Менску знаходзіўся цяперашні старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Ху Цзіньтао, які ўжо тады належаў да найвышэйшага кіраўніцтва краіны, у 2001 годзе — тагачасны кіраўнік дзяржавы Цзянь Цзэмінь. Гэтыя візыты сталі пікам узаемаадносін Беларусі з Кітаем. Высьветлілася, што Беларусь і КНР займаюць падобныя пазыцыі па асноўных міжнародных праблемах. Многія назіральнікі адзначаюць правамернасьць афіцыйнага тэзісу пра вялікія посьпехі беларускага кіраўніцтва ў супрацоўніцтве з Кітаем у палітычнай сфэры. А вось што да эканамічнай, дык пакуль ніводзін зь вядомых сумесных праектаў не дазволіў гаварыць пра нейкія посьпехі.

Вярнуўшыся з апошняй паездкі ў КНР, якой кітайскі бок афіцыйным візытам не называе, а лічыць «прыпынкам беларускага прэзыдэнта па дарозе зь Віетнаму ў Рэспубліку Карэю», А.Лукашэнка згадаў пра дасягнутыя дамоўленасьці стварэньня СП у галіне тэлекамунікацый і, у прыватнасьці, выпуску тэлевізараў на віцебскім ВА «Віцязь». З таго часу так нічога і не чуваць пра гэтую ініцыятыву.

Ужо не адзін год Міністэрства прамысловасьці і БелАЗ вядуць перамовы па пытаньнях, зьвязаных з арганізацыяй зборачнай вытворчасьці кар'ерных самаскідаў у Кітаі. Працягваюць культывавацца надзеі, што ўрад КНР, магчыма, надасьць гэтаму СП статус аб'екта спэцыпрызначэньня. Але ў Кітаі ўжо зьбіраюцца досьледныя ўзоры беларускіх машын. Вельмі нечакана прагучалі нядаўнія прызнаньні гендырэктара БелАЗу пра тое, што канкурэнцыю беларускай прадукцыі на рынку збыту сёньня складаюць кітайскія вытворцы. Гэта яшчэ адно пацьвярджэньне прынцыпу кітайцаў скупляць «з трыбухамі» за мяжой узоры той ці іншай прадукцыі, а затым пераўтвараць іх ва ўласную.

Ці не для таго кітайцы скупляюць узоры беларускай прадукцыі, каб затым пераўтвараць іх ва ўласную?

Наглядным прыкладам такога падыходу можа служыць досьвед супрацоўніцтва ў вайскова-тэхнічнай сфэры. Гавораць, што быў час, калі кітайскія спэцыялісты адчувалі сябе вальней, чым нават іх расейскія калегі на некаторых беларускіх прадпрыемствах абароннага значэньня. Вынікам такіх асаблівых адносін рабілася тое, што ў бок Кітаю ішла ня толькі беларуская прадукцыя, але і тэхналёгіі. А гэта нярэдка закранала і расейскія інтарэсы. Бо з сваім стратэгічным беларускім саюзьнікам у Расеі існуюць сумесныя абаронныя заказы і спадчына дасягненьняў савецкага ВПК. Непаразуменьні і нават скандалы, што ўзьнікалі, рабіліся прадметам сур'ёзных размоў на розных узроўнях паміж саюзьнікамі. Відавочна, для таго каб неяк «разрульваць» сытуацыю зь беларускай прадукцыяй у Кітаі, і быў назначаны пасьлом у Пэкіне былы міністар прамысловасьці таварыш Харлап. Праўда, з часоў гэтых негалосных расейска-беларускіх спрэчак пра пастаўкі ў Паднябесную кітайскія спэцыялісты ўжо пасьпелі «высмактаць» усе цікавыя для сябе тэхналёгіі і страціць колішні інтарэс да адпаведных беларускіх прадпрыемстваў. Затое захоўваецца зацікаўленасьць у навучаньні кітайскіх курсантаў у Ваеннай акадэміі ў Менску. Паводле некаторых зьвестак, у асноўным іх вучаць працаваць на комплексах СПА.

Па дарозе ў Пэкін ці назад, відаць, Лукашэнка наведае Ўзбэкістан. Пэрыядычна зьяўлялася інфармацыя пра такія намеры. Пасьля крывавай бойні ў Андыжане і шараханьняў з Захаду на Ўсход напалоханы аранжавымі рэвалюцыямі правіцель Крамля ўсё-такі пайшоў на збліжэньне з Кітаем. Усё часьцей у экспарце «рэвалюцый» абвінавачваюць ЗША. І ўзбэцкі кіраўнік Карымаў таксама заручыўся падтрымкай Кітаю. Толькі пасьля гэтага ён паехаў на паклон у Маскву. Такія зрухі палітычных акцэнтаў і сталіся адной з прычын прыняцьця заявы Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС) пра неабходнасьць выводу амэрыканскіх баз з Цэнтральнай Азіі. Як вядома, кіруючыся духам гэтай заявы, Узбэкістан ужо праінфармаваў амэрыканцаў аб неабходнасьці ім пакінуць краіну праз паўгоду. Ініцыятарамі тэксту гэтай заявы ШАС заходнія назіральнікі называюць расейскага прэзыдэнта Ўладзімера Пуціна і яго кітайскага калегу Ху Цзіньтао.

Расея робіцца найбуйнейшым пастаўшчыком энэргарэсурсаў ды ўзбраеньняў для Кітаю і адмовіцца ад гэтага практычна ўжо ня можа. Ёсьць магутнае лобі ў ВПК і нафтавае лобі ўнутры Расеі, якое праводзіць гэтую палітыку. У рэчышчы гэтага разьвіцьця рухаецца і Беларусь са сваім кіраўніцтвам і эканамічным патэнцыялам. Можна чакаць, што падчас сваіх візытаў у Кітай і Ўзбэкістан кіраўнік Беларусі зробіць гучныя заявы пра сваё бачаньне шматпалярнага сьвету і новыя сілавыя цэнтры — процівагі амэрыканскай гегемоніі. Трэба меркаваць, згадае ён і ШАС як антыамэрыканскі цэнтар, што фарміруецца.

На думку непрымірымага крытыка пуцінскага рэжыму палітоляга Андрэя Піянткоўскага, шанхайскія гульні цікавяць Кітай ня самі па сабе. Нашмат важнейшае для яго вырашэньне ўскоснай стратэгічнай задачы — уцягнуўшы Расею ў жорстка артыкуляваны антыамэрыканскі блёк, перарэзаць яе палітычныя сувязі з Захадам і тым самым аблегчыць задачу яе плаўнага паглынаньня. Канфрантацыя з Захадам да курс на «стратэгічнае партнэрства» і фактычную ваенную кааліцыю з Кітаем вядуць ня толькі да маргіналізацыі Расеі, але і да падпарадкаваньня яе стратэгічным інтарэсам Кітаю і да страты кантролю над Далёкім Усходам ды Сібір'ю спачатку дэ-факта, а затым і дэ-юрэ. А саюз імпэратараў Пу і Ху, які ствараецца, — гэта саюз труса і ўдава. Ён непазьбежна і вельмі хутка прывядзе да поўнай хуізацыі маленькага Пу і нас усіх разам зь ім. Трапіць у гэты саюз марыць і правіцель Лу са сваім народам. Мы проста не заўважылі, адзначае Піянткоўскі, як ужо ператварыліся ў блізкае замежжа Кітаю.

## ГАСПАДАРКА СЬЦІСЛА

### Вайна банкаў

Справа «Джэм-банку» перададзеная ў Вышэйшы гаспадарчы суд. Банк патрабуе адмяніць дзеяньне часовай адміністрацыі, уведзенай у ім Нацыянальным банкам. «Джэм-банк» лічыць, што зрабіўся ахвярай рэпрэсіяў з боку дзяржавы.

### Мэталюргі пры грашах

Міністэрства статыстыкі і аналізу падлічыла, што самы вялікі сярэдні заробак маюць тыя, хто працуе на прадпрыемствах чорнай мэталюргіі, — Br947 тыс. «Нафтавікі» атрымліваюць 918 тыс., «хімікі» — 723 тыс. Найменш атрымліваюць тыя, хто працуе ў швейнай прамысловасьці, — 284 тыс.

### Атрутная кампэнсацыя

Прэзыдэнцкім указам пазбаўленыя спагнаньня мыта ўвезеныя ў краіну сродкі аховы расьлін. Сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, якія сёлета ўжо набылі за мяжой атруту для насякомых, атрымаюць кампэнсацыю — на гэтыя мэты зь бюджэту выдзелена Br11 млрд. Летась у Беларусь было ўвезена сродкаў абароны расьлін на суму каля $22 млн.

### Цыгарэтныя праблемы

Міністэрства гандлю прапанавала павысіць квоту на ўвоз тытунёвых вырабаў на 500 млн цыгарэт. Сёлета яна была зьніжана з 3,6 да 2 млрд цыгарэт, аднак айчынныя вытворцы пакуль ня здольныя сваімі сіламі кампэнсаваць зьмяншэньне імпарту якасных цыгарэт. «Philip Morris» ужо вядзе перамовы з гарадзенскай фабрыкай «Нёман» па арганізацыі вытворчасьці ў Беларусі сваіх цыгарэтных брэндаў, у тым ліку знакамітага «L&M», імпарт якога ў нашу краіну спынены.

### МТЗ у Туркмэністан

МТЗ заключыў дамову на пастаўку ў Туркмэністан тысячы трактараў. Сума кантракту — $18,6 млн. Партнэр МТЗ — асацыяцыя «Туркмэнобахызмат» («Туркмэнсельгастэхніка»). У плянах — прадаваць у Туркмэністан штогод дзьве тыс. трактароў, тысячу грузавікоў «МАЗ» ды 500 кар'ерных БелАЗаў.

### Эканомная цэгла

Менскі завод будматэрыялаў да канца году інвэстуе Br8,3 млрд у энэргазьберагальныя тэхналёгіі. Прадпрыемства набудзе ў чэскай фірмы «Tedom S.R.O.» газапоршневыя агрэгаты, якія будуць выкарыстоўваць для атрыманьня энэргіі на вытворчасьць цэглы і плітак. Плянуецца, што эканомія дазволіць атрымліваць $1 млн дадатковага прыбытку ў год.

**АК, АФН**

### КУРСЫ ВАЛЮТ

**на 4 жніўня:**

1 амэрыканскі даляр — 2 149 рублёў.
1 эўра — 2 631,45 рубля.
1 латвійскі лат — 3 781,12.
1 літоўскі літ — 762,08.
1 польскі злоты — 645,26
1 расейскі рубель — 75,13.
1 украінская грыўна — 428,91.

**Паводле Нацбанку**

# Эміграцыя, хімія, зона, куля

Мікола Статкевіч лічыць прысуд ня самым цяжкім варыянтам.

«Пасьля апошняга беларускага рэфэрэндуму, падзеяў ва Ўкраіне я для сябе бачу чатыры шляхі, — прамовіў Статкевіч да журналістаў ды сяброў па партыі, якія сабраліся 29 ліпеня ў офісе, каб праводзіць яго. — Першы — гэта эміграцыя, я яго адразу адкідваю, бо я ніколі ня здраджваю ні сваім ідэалам, ні сваім сябрам. Другі шлях — хімія, трэці — зона, чацьверты — куля. З тых трох, што засталіся, я іду па лёгкім варыянце. Пакуль што».

Спачатку Міколу Статкевіча разьмеркавалі ў Крупкі, райцэнтар на паўночны ўсход ад Менску, аднак яго стары бацька напісаў заяву з просьбай разьмеркаваць сына бліжэй да месца свайго жыхарства. Такім чынам, лідэр Эўрапейскай кааліцыі быў накіраваны ў Баранавічы, дзе мае правесьці два гады.

Павал Севярынец, таксама асуджаны да абмежаваньня волі, знаходзіцца ў Віцебску пад наглядам міліцыі. У яго ўжо сканфіскавалі пашпарт і вайсковы білет. На 2 жніўня месца, дзе Севярынец будзе адбываць пакараньне, яшчэ не было вызначанае.

**АК**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Баранавічы робяцца беларускім Шушанскім

Ужо другі палітычны лідэр будзе адбываць пакараньне ў Баранавічах. Будынак зь белай цэглы толькі напалову з кратамі на вокнах не пасьпеў яшчэ забыцца на намесьніка старшыні Партыі БНФ, тагачаснага рэдактара газэты «Рабочы» Віктара Івашкевіча.

Камяніца падзелена напалам. У адной частцы знаходзіцца «хімія», у другой — звычайны рабочы інтэрнат.

Статкевіча прывезьлі на машыне знаёмыя. Напачатку ён правёў шраг сустрэч з чальцамі сваёй партыі ды журналістамі і толькі пасьля накіраваўся да папраўчай установы адкрытага тыпу №2.

На ганку яго ўжо чакалі два дзясяткі журналістаў, партыйцаў і грамадзкіх дзеячаў. Акрамя бацькі, Статкевіч мае ў горадзе шмат сваякоў і паплечнікаў, таму пачуваецца адзінцом ня будзе.

Паводле слоў палітыка, ягонае перанакіраваньне ў Баранавічы зьвязана з тым, што тут спэцслужбам будзе лепш за ім назіраць, да таго ж яны папрактыкаваліся ўжо тут на Івашкевічу. Таму просьба «адправіць» яго бліжэй да старэнькага бацькі, відаць, прыйшлася даспадобы наверсе.

Паводле слоў Статкевіча-малодшага, ягонай жонцы «ў Камітэце выкананьня пакараньняў сказалі, што калі я ня буду ўдзельнічаць у палітычным жыцьці, то праз год мяне могуць адпусьціць дадому. Але ад грамадзкага жыцьця я ўхіляцца ня буду».

Пасьля паўгадзіны сустрэчы да людзей, што сабраліся на ганку, падышлі тры міліцыянты і запыталі, што гэта за несанкцыянаваны мітынг. Пасьля, разабраўшыся, накіраваліся са Статкевічам у будынак, які сама меней на год зрабіўся ягоным домам.

З панядзелка ён пачаў шукаць працу. У прыватных установах уладкавацца на працу пакуль не дазваляюць.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## СЬЦІСЛА

### Справа Клімава спыненая

Справа **Андрэя Клімава** па паклёпе й абразе прэзыдэнта (арт. 368 і 367 КК) спынена 22 ліпеня. Дзяржабвінаваўца Ліліяна Ліцьвінюк папрасіла Першамайскі суд Менску спыніць справу «ў адпаведнасьці з арт.87 КК і ч.1 арт.30 КПК». Арт.87 прадугледжвае спыненьне справы, калі «на час разгляду справы ў судзе праз зьмену абстаноўкі ўчыненае абвінавачваным дзеяньне страціла характар небясьпечнага».

### Суполку РЭП не рэгіструюць

Адміністрацыя РУП «Канструктарскае бюро дакладнага электроннага машынабудаваньня оптыка-мэханічнага абсталяваньня» 15 чэрвеня адклікала юрадрас у **суполкі прафсаюзу РЭП**. Пра адкліканьне юрадрасу старшыня суполкі **Ігар Комлік** даведаўся 30 чэрвеня, атрымаўшы папярэджаньне ад адміністрацыі Ленінскага раёну Менску. Прафсаюз РЭП падрыхтаваў зварот у Мінпрамысловасьці й гендырэктару канцэрну «Плянар», куды ўваходзіць КБДЭМ ОМА.

### Ператрус у Пінску

У Пінску 26 ліпеня затрымалі актывіста АГП **Сьцяпана Новасяльчана**: міліцыянты правялі вобшук яго машыны, заявіўшы, што там могуць быць наркотыкі.Знайшлі газэты й бюлетэні, прысьвечаныя будучай выбарчай кампаніі, і склалі пратакол за распаўсюджаньне выданьняў з парушэньнем закону.

### Суткі за Дзень незалежнасьці

У Шчучыне 26 ліпеня ўвечары затрымалі намесьніка старшыні СПБ **Юзафа Пажэцкага**, актывіста СПБ **Мечыслава Яскевіча** і рэдактара часопісу «Magazyn Polski» **Андрэя Пачобута**. Іх абвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаванай акцыі ў Шчучыне 3 ліпеня: там адбыўся канцэрт у гонар Дня незалежнасьці, арганізаваны мясцовай філіяй СПБ. Пачобута асудзілі на 15 сутак арышту, Пажэцкага й Яскевіча — на 10 кожнага.

### Штраф за летнік

26 ліпеня ў моладзевы летнік на базе адпачынку «Белае возера» (Берасьцейскі раён) прыбылі 5 міліцыянтаў і 6 чалавек у цывільным: яны правяралі «пашпартны рэжым» у памежнай зоне ва ўдзельнікаў сэмінару, арганізаванага пры спрыяньні фонду Эбэрта. На актывістаў БСДП (Г) **Ігара Маслоўскага**, **Валянціна Лазарэнкава**, дэпутатку Белаазерскага гарсавету **Натальлю Акаронка** й трох **грамадзян Украіны** склалі пратаколы за правядзеньне несанкцыянаванага сходу.

### Перасьлед за «Салідарнасць»

Дырэктар ААТ «Заслаўесьвідрвод» Аляксандар Селязьнёў 27 ліпеня адхіліў ад працы начальніка гідрагеалягічнага аддзелу, актывіста Свабоднага прафсаюзу Беларускага **Ўладзімера Феакцістава**, які раздаў рабочым 20 асобнікаў газэты «Салідарнасць».

### РНЕ ў Крычаве

У Крычаве 27 ліпеня вуліца Крупскай, дзе месьціцца рэдакцыя недзяржаўнай газэты **«Вольны горад»**, была закідана ўлёткамі ад РНЕ.

### Трасуць сваякоў Скрабца

27 ліпеня міліцыянты правялі ператрус у кватэрах **бацькоў і брата Сяргея Скрабца**. У **Аляксандра Скрабца**, брата палітвязьня, канфіскавалі сыстэмны блёк да кампутара.

### У Знаўца забралі тэлевізар…

Судовыя выканаўцы забралі 27 ліпеня тэлевізар «Гарызонт» у дэпутата Вярхоўнага Савету XIII скліканьня **Паўла Знаўца**. Гэта кампэнсацыя за штраф, які Знавец адмаўляецца плаціць, — у падатковай інспэкцыі на яго наклалі штраф за незадэклараваныя 30 даляраў прыбытку, але экс-дэпутат мяркуе, што адбыліся грубыя парушэньні заканадаўства.

### …а ў Севярынца — пашпарт

У **Паўла Севярынца** 27 ліпеня забралі пашпарт і вайсковы білет — перад адсылкай на «хімію». Асуджаны разам зь ім **Мікола Статкевіч** 29 ліпеня выправіўся да месца пакараньня — у Баранавічы, дзе жыве ягоны бацька.

### Затрыманьні на Берасьцейшчыне

У вёсцы Знаменка (Дурычы) Берасьцейскага раёну 27 ліпеня затрыманы сябры ПБНФ настаўнік **Уладзімер Красько**, студэнты **Віталь Коўш** і **Юры Асяевіч**, якія распаўсюджвалі друкаваныя выданьні. На затрыманых склалі пратаколы за парушэньне правілаў знаходжаньня ў памежнай зоне.

### Кампэнсацыя за прагул

Дырэкцыя Гомельскага абласнога краязнаўчага музэю 29 ліпеня падпісала пагадненьне са звольненай супрацоўніцай, актывісткай грамадзкага руху «Разам» **Марыяй Багдановіч**: ёй выплацяць двухмесячны заробак за вымушаны прагул і зьменяць фармулёўку прычыны звальненьня. У траўні яе звольнілі за «сыстэматычнае невыкананьне службовых абавязкаў без паважных прычын».

### «Зуброўцаў» цісനуць

27 ліпеня на дзьвярах кватэры магілёўскага актывіста незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» Валадара Цурпанава зьявіўся абразьлівы надпіс. Падпалкоўнік КДБ Анатоль Сафронаў прыходзіў «пагутарыць» зь людзьмі, на якіх зарэгістраваны кантактны тэлефон магілёўскай філіі арганізацыі.

### «Міны» ў Гомелі

30 ліпеня ў Гомелі быў сарваны сэмінар «Праблемы моладзі і шляхі іх вырашэньня», які зьбіраўся ў прыватным доме Віктара Карняенкі. Міліцыянты заявілі, што маюць зьвесткі пра мінаваньне дому. Удзельнікаў сэмінару завезьлі ў аддзяленьне для высьвятленьня асобы, хоць многія мелі з сабой пашпарты. Мінаў не знайшлі, затое канфіскавалі чатыры пачкі кніг «Выпадковы прэзыдэнт».

### Затрыманьне ў Докшыцах

У Докшыцах 30 ліпеня былі затрыманыя старшыня ПБНФ Вінцук Вячорка і актывіст партыі Аляксей Кавалец: іх абвінавацілі ў распаўсюдзе друкаванай прадукцыі. Паколькі ў іх былі толькі зарэгістраваныя выданьні, праз тры гадзіны ўсіх адпусьцілі.

### Барысаўскі футбол

У Барысаве 30 ліпеня былі затрыманы чатыры актывісты моладзевых арганізацый, што ўдзельнічалі ў футбольным турніры «Кубак Незалежнасьці»: у іх заўважылі бел-чырвона-белыя сьцягі. На Алеся Гігеля склалі пратакол.

### Завадзкай адмовілі

Сьвятлане Завадзкай 1 жніўня ў пракуратуры Цэнтральнага раёну Менску адмовілі ў завядзеньні крымінальнай справы па факце зьбіцьця, бо «не было знойдзена падстаў». Акцыя салідарнасьці з Завадзкай у Менску была перарваная менскім АМАПам.

### Папярэджаньне ў Мазыры

У пракуратуры Мазыра Ўладзімеру Целепуну зь незарэгістраванага праваабарончага цэнтру «Вясна» 27 ліпеня вынесьлі афіцыйнае папярэджаньне аб недапушчальнасьці парушэньня артыкулаў 367, 368 КК (абраза гонару й годнасьці прэзыдэнта). У ягоным кампутары міліцыянты выявілі «выявы й карыкатуры прэзыдэнта». Целяпун сьцьвярджае, што меў сканаваную передвыбарную ўлётку Лукашэнкі 1994 г.

### Скрабца перавезьлі ў Менск

2 жніўня Сяргея Скрабца даставілі ў Менск. Вагон з арыштантамі ехаў зь Берасьця да Менску пяць сутак, пры гэтым трое сутак вагон стаяў у Баранавічах.

**АШ**




**Выходнымі ў Строчыцах пад Менскам адбылася імпрэза, прысьвечаная 200-годзьдзю з дня нараджэньня Ганса Хрысьціяна Андэрсэна. Адзначалі яго ўдзельнікі сэмінару саламянага мастацтва. Яны атачылі сябе пэрсанажамі казак Андэрсэна, зьвязанымі з саломы.**

# Вяртаньне ў Залесьсе

Той, хто хоць раз пачуў шчымлівае «Разьвітаньне з Радзімай» Міхала Клеафаса Агінскага, не забудзе яго ніколі. І той, хто аднойчы завітаў у Залесьсе, што на Смургоншчыне, дзе знакаміты кампазытар напісаў свой геніяльны твор — вернецца сюды абавязкова. Да вялізных ліпаў і клёнаў старога парку, возера з млыном і палацу… Тут жыве дух старой добрай Заходняй Беларусі, яе гонару, годнасьці і шляхецтва. Дыхаецца тут вальней!

Апошні дзень ліпеня. Сьпёка на мяжы з вар'яцтвам. Маёнтак-музэй Агінскага чарговы раз прымае гасьцей. Ставіцца спэктакль «Фантазія ля-мінор» У.Драздова.

Адна справа — глядзець п'есу ў сьценах тэатру, зусім іншая — перанесьці яе дзеяньне ў будынак XIX ст. Хоць і ўзьнікае шэраг цяжкасьцяў: непрыстасаванае памяшканьне, праблемы з гукам і сьвятлом. Усё ж Менскі абласны драматычны тэатар рашыўся на такую «авантуру». І не дарма!.. У залескім маёнтку прысутнічае энэргетыка, аўра мінулых часоў: сьцежкамі старадаўняга парку хадзіў сам Міхал Клеафас, думаючы пра музыку, палітыку, асабістае жыцьцё.

Некаторыя падзеі і дыялёгі далёкіх дзён падзелаў Рэчы Паспалітай і вайны 1812 г. фантастычна супалі з сучаснымі беларускімі рэаліямі. На сцэне мы бачым трагедыю патрыёта-ліцьвіна (часам яна нагадвае шызафрэнію), які робіць усё магчымае для волі і заможнасьці свайго краю, але дасягнуць гэтага немагчыма. Найлепшым сынам айчыны не хапае рашучасьці і волі, а Кацярына II фактычна аднаасобна вырашыла палітычны лёс Рэчы Паспалітай. Чамусьці падумалася: сёньня беларусам, як і 200 год таму, не хапае рашучасьці ў адстойваньні сваіх правоў і моцы ў абароне сваёй краіны…

За жыцьцёвай трагедыяй таленавітага чалавека і патрыёта можна было сачыць на фоне маёнтку, які трымаецца з апошніх сіл, каб не разваліцца і ня стаць канчаткова гісторыяй: вокны наглуха забітыя драўлянымі аканіцамі, цэгла вылятае са сьцен, пыл і шэрае павуцiньне па кутах як прыкмета нежылога памяшканьня. Музэй у стадыі рэстаўрацыі, што цягнецца ня першы дзясятак год, — гучыць сумна і крыху безнадзейна… Ён трымаецца з апошніх сіл, яшчэ трымаецца. Мо таму, што тут жыве дух Агінскага?

**Дар'я Ліс, Залесьсе**

## СЬЦІСЛА

### Крадуць у славутасьці

Юбілейны Караткевічаў год адзначаецца ня толькі пленэрамі. Да лістападаўскіх урачыстасьцяў плянуецца адкрыць сталую экспазыцыю ў Аршанскім музэі Ўладзімера Караткевіча. Ён разьмешчаны ў самым цэнтры гораду ў прываблівым адрэстаўраваным будынку пачатку XX ст., дзе й нарадзіўся пісьменьнік (нарадзіўся ў тым сэнсе, што будынак у тыя часы выкарыстоўваўся як радзільня). Нядаўна сьцяну будынку ўпрыгожыў вялізны партрэт Караткевіча з напамінам пра сёлетні юбілей. Дзякуй богу, на яго пакуль ніхто не пакваліўся. А вось мэталічныя адлівы на падваконьнях у адну зь ліпеньскіх начэй нехта скраў.

Акты вандалізму ў дачыненьні да знакамітага земляка ў Воршы не спыняюцца. Летась была скрадзена мэмарыяльная пліта з помніка У.Караткевічу ў Прыдняпроўскім парку. Знайсьці яе не ўдалося, таму давядзецца рабіць новую, з больш таннага матэрыялу.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

### Прывіды там ня ходзяць

Важатая дзіцячага летніка на Валожыншчыне аднойчы ўначы самлела — ёй падалося, што з вакна жылога корпусу аддзяліўся прывід і скокнуў уніз. Міліцыя прывіду не зарэгістравала, але на наступную ноч пільна ахоўвала … важатую. Ці мала што.

### Вялейскі трылер

25 ліпеня сярод белага дня ў Вялейцы, на вуліцы Талстога, невядомы скраў аўтамабіль «Аўдзі». Супрацоўнікі ДАІ падчас перасьледу злодзея адкрылі стральбу па колах, але спыніць машыну не ўдалося. Прастрэленую іншамарку знайшлі назаўтра за горадам. Злодзей у вышуку.

**Паводле «Рэгіянальнай газэты»**

# Рок на сьвежым паветры

Вёска Лучна (Полаччына) стала часьцей фігураваць у навінах. Штолета тут ладзяцца археалягічныя пошукі Лучанскага манастыра, побач зь вёскай будзе пабудавана гідраэлектрастанцыя. Тутсама прайшоў рок-фэст «Ая-кэмп», ініцыятарамі якога выступілі музыкі наваполацкага рок-гурту «Ozon». Піша **Алесь Аркуш**.

На «Кэмп», што прайшоў у мінулы ўік-энд, былі запрошаны ня толькі рок-каманды, але й дыджэі, што ўначы весялілі народ электроннай музыкай. На фэсьце выступілі каля 30 гуртоў, палова зь іх — менскія. Ніякага фармату арганізатары не вызначалі, «цяжкія» гурты чаргаваліся зь «лёгкімі».

Вось толькі надвор'е выдалася надзвычай сьпякотнае. 30 ліпеня вядучы фэсту, вэтэран полацкага рок-руху Сяргей Анішчанка доўга ня мог знайсьці каманду, якая б распачала канцэрт — пачатак быў а 14-й. Нарэшце пагадзілася менская «Anno Domini». І толькі пасьля, з рыпеньнем і прадзіраньнем вачэй рок-дзея пачала набіраць абароты.

Гэтым разам у фэсьце ўдзельнічала больш беларускамоўных камандаў, якія былі збольшага сталічныя.

Галоўная нязручнасьць фэсту — значная адлегласьць ад гораду. Праз гэта адчуваўся недахоп слухачоў.

Арганізатары ў размовах з журналістамі спрабавалі параўнаць «Ая-кэмп» з «Басовішчам» — нешта падобнае, але дома. Анішчанка крыўдзіўся: на «Басовішча» едуць за свае грошы, а з арганізатараў «Кэмпу» яшчэ й патрабуюць ганарары за выступ.

## НАД ШУМАМ ДЗЁН

# Грошык да грошыка



**РУСЛАН РАВЯКА**

Новая стотысячная банкнота зьявілася дзякуючы стабілізацыі беларускай эканомікі, зьніжэньню інфляцыі й павелічэньню заробкаў працоўных.

Пад гэтыя словы з тэлеэкрану мы пілі з адным палякам каву ў адзінай на ўсе Баранавічы кавярні. У таго паляка ў кішэнях бразгаюць злотыя. Паказвае ён мне і адмысловыя. Прызначаныя больш для калекцыянэраў, яны сустракаюцца і ў абароце. На іх — выявы Касьцюшкі, Манюшкі, Міцкевіча, Траўгута — нашых землякоў, якіх ушаноўваюць суседзі нават на грошах.

Гадоў васемсот беларусы карысталіся ў разьліках манэтамі, былі часы, калі толькі Літоўская меньніца (цяпер яна называецца манэтным дваром) біла грошы й паўгрошы ня толькі для свайго ўжытку, але й для Кароны. Праходзілі стагодзьдзі, мяняліся каралі, цары, улады. Суправаджаў лёт часу бразгат манэт у кішэнях, торбачках. Блішчэлі срэбраныя грошыкі ў збаночках, бы луска, калі закопваліся на захаваньне ў зямлю.

Разам з Савецкім Саюзам лянула і грашовая сыстэма. Амаль што 14 год беларусы жывуць бяз звыклага бразгату ў кішэнях. Забыліся ўжо на прыемны цяжар мэталічных кругляшкаў. Ня блісьне дробная манэтка на ходніку. Затое абапал нас усе суседзі здолелі стабілізаваць свае фінансы й пачаць біць манэты. Нам жа даводзіцца задавольвацца толькі памятнымі манэтамі Нацбанку, што б'юць у срэбры і нікелі вартасьцю 20 рублёў і 1 рубель. Яны займаюць першыя месцы на розных конкурсах і фэстывалях, але імі ніводны вар'ят не разьлічыцца ў краме. Таму ўся беларуская стабільнасьць абвальваецца перад замежнікам, як толькі той даведваецца, што ў краіне не выкарыстоўваюцца мэталічныя грошы.

У маім кашальку ў невялічкай кішэньцы ўжо колькі год бразгочуць адзін польскі грош, адзін літоўскі цэнт ды па адной капейцы з Украіны і Расеі. Няма толькі беларускай манэткі.

*Баранавічы*

# Выдадзена ў Паставах

Паставы — адзін зь нямногіх раённых гарадоў Беларусі, у якім неказённы культурны асяродак стварае ўнікальныя духоўныя каштоўнасьці. Піша **Анатоль Сідарэвіч**.

## Горад, збудаваны італьянцам

Гартаю том «Віцебская вобласьць», што яшчэ на сконе камунізму выйшаў у сэрыі «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі». Мяне цікавіць Пастаўскі раён. Пра самі Паставы паведамляецца коратка: «Належалі магнатам Дэспатам-Зяновічам. У 2-й палове XVIII ст. перайшлі да магната ВКЛ А.Тызенгаўза. У 1775 г. адкрыта сьвецкая школа зь сярэдняй ступеньню навучаньня…» Вось, бадай, і ўсё. А далей ідзе па пунктах пералік і апісаньне помнікаў. «Забудова плошчы Леніна» — гэта тыя пяць дамкоў, што надаюць цэнтру гораду непаўторны каларыт, прымушаюць уздыхнуць і прамовіць: «І мы былі Эўропаю». Тым болей што будаваў тыя дамкі Джузэпэ Сака — той самы, што будаваў для Тызенгаўза і ў Горадні. (Ня толькі для Тызэнгаўза — ён абнаўляў і каралеўскі палац.)

Тут, у Паставах, пад кіраўніцтвам дойліда з Вэроны быў створаны суцэльны архітэктурны ансамбль у стылі барока. «Плошча набыла форму прастакутніка (у пляне 295х93 м), ад кожнага вугла адыходзілі асноўныя вуліцы — Браслаўская (зараз Ленінская), Зарэчная, пазьней Лучайская (зараз Чырвонаармейская), Віленская (зараз Савецкая)…»

## Пад ручку зь біскупам

Гэта я цытую з кнігі Міхала Гіля «Былыя сядзібы і паркі Паазер'я. Пастаўшчына», што выйшла летась у Паставах.

Аўтар апавядае нам пра сядзібу Ромэраў у Каралінове (пра яе ані слова ў тым томе са «Збору помнікаў…»), пра сядзібу Янішэўскіх у Ясеневічах (зноў жа, у тым томе пра самі Ясеневічы ані згадкі), паказвае, як выглядала панская сядзіба ў Саранчанах (у 1938 г. ёй было 400 гадоў)… Шмат даўніх здымкаў і сучасных. І подпісы: «Так выглядаў лынтупскі палац перад зьнявечаньнем. 1938 г.», «А вось такі цяпер стан помнікаў архітэктуры ў Лынтупах».

Гэта ня толькі гісторыя маёнткаў, палацаў, гаспадарчых пабудоў, але і гісторыя шляхецкіх родаў, асобных людзей. Перад намі паўстае каларытная фігура пані Галены Даўгялы з Раманішкаў, пані Марыі Абрамовіч з Крыкалаў (на здымку яна стаіць пад ручку зь біскупам Эдвардам фон Ропам)…

## Парыж і ваколіцы

Заканчваецца кніга здымкамі знаёмага мне Варапаева. І тут жа згадваю, што я чытаў кніжку «Мястэчка пры гасьцінцы». Аўтар яе — гісторык Іосіф Зямчонак — даволі падрабязна ўзнавіў гісторыю гэтае мясьціны. Ён жа напісаў кніжкі «Лучай: Гісторыя маёнтку, мястэчка і вёскі. 1542—1998», «Данілавічы: Гістарычны нарыс. 1473—1998» і «Ваколіцы Парыжу: Старонкі гісторыі Пастаўскага Паазер'я». Парыжам, ведама, *былі* Паставы — з Сакавай забудовай, з Тызенгаўзавым палацам, у якім унучаты пляменьнік знакамітага надворнага падскарбія літоўскага, ня менш знакаміты Канстанцін Тызенгаўз, сабраў багатую бібліятэку і стварыў карцінную галерэю, а побач з палацам — зьвярынец. Імя прыродазнаўца Тызенгаўза, аўтара шэрагу кніг, увайшло ў гісторыю навукі, арніталёгіі і іхтыялёгіі ў прыватнасьці.



**Барвы. Літаратурна-культуралягічны часопіс.** — Паставы.






**Нашы карані. Ілюстраваны часопіс краязнаўцаў Паазер'я.** — Паставы.

На свае пісаныя гісторы пашанцавала ня толькі Варапаеву, Лучаю і Данілавічам-Дунілавічам. Паэт і географ Ігар Пракаповіч у суаўтарстве з Настасьсяй Вансовіч ды Ірынай Заяц выпусьціў кніжку «Манькавічы».

Наколькі мне вядома, падрыхтаваныя да друку кніжкі Алеся Адамковіча «Германавічы» і Яські Драўніцкага «Мястэчка пры Полацкім тракце» — пра Канстанцінава, што ў Мядзельскім раёне. А яшчэ з архіўнага рукапісу перакладзена і чакае сваёй чаргі кніжка Генрыка Жаброўскага «Міхнічы».

Калі ж вяртацца да асобы Ігара Пракаповіча, дык нельга не зьвярнуць увагу на ягоную працу «Насельніцтва Пастаўскага краю» — кніжку ўнікальную, бо, наколькі я ведаю, ні ў адным раёне нашае краіны не праводзілася падобнага дасьледаваньня. Акрамя таго, Ігар напісаў кніжкі «Ваколіцы Пастаў: Помнікі прыроды, гісторыі і культуры з маршрутамі краязнаўчых вандровак» і «Крыжы і камяні: Нарысы па гісторыі Пастаўскага краю».

Дарэчы, пра камяні. Алесь Гарбуль, яшчэ адзін пастаўскі краязнавец, выпусьціў у 2002 г. ёмістую — на 90 старонак — кніжку «Скарбы сівых валуноў». У ёй апісаны шмат якія знакамітыя ў родных мясьцінах камяні. І гэтая праца яшчэ не завершаная, бо на 90-й старонцы напісана: «Канец першай кнігі».

Парыжам былі Паставы — з Сакавай забудовай, з Тызенгаўзавым палацам.

## Ушанаваньне краязнаўца

Асобнае месца на пастаўскай паліцы займае кніжка чалавека, якога ведаў шмат хто ў Паазер'і і па-за ім. Гэта кніжка Міхася Райчонка «Нашчадкам».

Міхась Райчонак, сын Алега і Ады Райчонкаў, таксама быў краязнаўцам. І літаратарам. Быў — бо памёр на 27-м годзе жыцьця.

Немалая заслуга маці і сына ў тым, што ў Германавічах была ўшанавана памяць Язэпа Драздовіча. Сам Міхась асэнсоўваў спадчыну мастака і пісьменьніка, зьбіраў успаміны пра яго, склаў бібліяграфію. Вось гэты — драздовічазнаўчы — даробак маладога дасьледчыка разам зь іншымі яго працамі і сабраны пад вокладкаю зборніка «Нашчадкам» (што праўда, месцам выданьня кніжкі пазначаны Германавічы).

## «Сумежжа» пачалося з «Сумежжа»

Хто будзе гартаць пастаўскія кніжкі, той убачыць на іх апошніх старонках такія словы: «Выдавецкая ініцыятыва «Сумежжа».

«Сумежжа» — гэта назва малатыражнае газэты, якую ў 1990-х выпускаў старшыня Пастаўскае філіі БСДГ (ткачоўскае!) і дэпутат райсавету Міхал Гіль.

З «Сумежжа» ўсё і пачалося. Перш-наперш набыцьцё выдавецкага досьведу.

Я не скажу, хто каго шукаў, але ўрэшце выйшла так, што ў Пастаўскім раёне склаўся асяродак інтэлігенцыі. (Зраблю тут адступленьне. Пад інтэлігенцыяй я разумею людзей, здольных да творчае працы — прадукаваньня новых ідэй, выпрацоўкі новых ведаў. Людзей, якія рэпрадукуюць і трансьлююць гатовыя ідэі і веды, я называю людзьмі разумовае працы.) Гэта ўжо названыя Міхась Гіль, Іосіф Зямчонак, Ігар Пракаповіч, Алесь Гарбуль, а таксама паэт Алесь Касьцень, мастак і паэт Іосіф Атрахімовіч, журналіст Уладзімер Шык… З часам пачала выходзіць і «лынтупская мястэчковая незалежная газэта» «Беражніца». Пастаўцы выйшлі на кантакт з аднадумцамі з суседніх раёнаў. Зьявіліся рэгіянальныя краязнаўчая газэта «Крэсы», жаночая газэта «Сяброўка», культурніцка-экалягічная газэта «Шыпшына». Гэтыя выданьні ахоплівалі Браслаўскі, Глыбоцкі, Мёрскі, Пастаўскі і Шаркаўчынскі раёны, а «Шыпшына» — дык нават Мядзельскі й Астравецкі раёны.

З часам Міхась Гіль атрымаў у рэгіёне і сярод таварышаў па партыі мянушку Мэдыямагнат. Так — рэгіянальным мэдыямагнатам — назваў яго з экрану тэлевізара сумнавядомы Зімоўскі. Ну, а Зімоўскаму нехта падказаў уставіць гэта ў тэкст.

Тое, што газэты цяпер не выходзяць, залежыць не ад аўтараў і рэдактараў. У любы момант «Сумежжа» ды іншыя выданьні могуць зноў убачыць сьвет: людзі, якія ўмеюць іх рабіць, нікуды не разьбегліся.

З усіх тых малатырыжак і малафарматак я вылучу сёньня краязнаўчую газэту «Крэсы», бо гэта менавіта яна стала калыскаю, зь якое выйшаў…

## …часопіс «Нашы карані»

«Ілюстраваны часопіс краязнаўцаў Паазер'я» — такі падзагаловак маюць «Нашы карані» — вось ужо пяты год выходзіць у Паставах. Фармат — А4. Аб'ём — ад 54 да 66 старонак. Наклад — да 299 асобнікаў.

Я маю 15 нумароў часопісу. Амаль кожны зь іх прысьвечаны пэўнай тэме. Нумар трэці — гэта праца Яські Драўніцкага «Мястэчкі і вёскі Паазер'я». Альшэва, Альшэўскі конезавод, Альшэўскі парк… І ў гэтым жа нумары пра знакамітых людзей Пастаўшчыны і Мядзельшчыны — рэвалюцыянэра Фларыяна Даноўскага, геадэзіста Яна Ходзькі-Барэйку, лекара Юзафа Кавальскага… Пра карані Дзьмітрыя Шастковіча…

Ды што я буду пераказваць? Усяго не перакажаш.

Мажліва, тут варта адзначыць тое, што на старонках «Нашых каранёў» прайшлі апрабацыю ўжо названыя кнігі… І тэматычны №8 вылучым — з працаю Ўладзімера Скрабатуна «Мая Глыбоччына».

## А яшчэ «Барвы»

Мусіць, адчуўшы, што ў краязнаўчым часопісе няма месца іншым музам, апроч Кліё (а ці ёсьць муза геаграфіі?), Міхась Гіль наважыўся летась выдаваць літаратурна-культуралягічны часопіс «Барвы».

Тут і вершы, і проза, і нарыс пра пастаўскага кавалерыста-мастака Юр'я Фурса, тут і графіка Стэфана Казлоўскага з Астравецкага раёну, і артыкулы пра іншых мастацтва Глыбоччыны і Браслаўшчыны, і аб прыватнай мастацкай галерэі Ады Райчонак. І гэта зьмест толькі першых двух нумароў.

## Пытаньні без адказаў

Іншы раз я думаю: чаму гэтыя часопісы выходзяць у маленькіх Паставах, а ня ў Пінску ці Мазыры? Чаму ў Паставах, а не ў старажытным Слуцку ці Навагрудку?

Спрые ўлада? Анітрохі. Пастаўскія начальнікі звольнілі з працы Міхася Гіля. Яны ж пазбавілі працы Іосіфа Зямчонка. Цяпер гісторык жыве ў Польшчы. Там вывучае архівы і піша пра Пастаўшчыну.

Падбор людзей? Наяўнасьць лідэра? Дапамога грамадзкіх арганізацый?

Ня будзем гадаць. Факт ёсьць фактам: Паставы — адзін зь нямногіх раённых гарадоў Беларусі, у якім ёсьць неказённы культурны асяродак і ствараюцца немалыя духоўныя каштоўнасьці.



PHOTO.BYMEDIA.NET


АНДРЭЙ ЛянкЕВІЧ

# З чаго пачынаецца блюз

Дуэт «Чатыры і восем» зарадзіўся на Браслаўскіх азёрах у 2001 г. Там на раскопках пазнаёміліся яго ўдзельнікі — Дзяніс Лісейчыкаў, выпускнік гістфаку БДУ, і Алесь Дуко, які тады скончыў першы курс гістфаку. Хлопцы пэрыядычна гралі на мерапрыемствах, што ладзіла аб'яднаньне «Гісторыка», але даволі хутка выйшлі за межы студэнцкай самадзейнасьці. Піша **Сяргей Будкін**.

Восеньню 2002 г. яны ўжо займелі альбом і сталі ляўрэатамі «Бардаўскай восені». Гітару для запісу пазычылі ў Касі Камоцкай, кіраваў запісам Алесь Камоцкі. За тры дні ўвесь матэрыял быў запісаны, а назвы ў гурту так і не было. «Паколькі ў той час мы пілі «Аліварыю-сталічнае», у якой 4,8% алькаголю, то вырашылі назваць наш дуэт «Чатыры і восем», — кажа Лісейчыкаў.

Альбом пад назваю «Блюз пачынаецца зь літары Б» разышоўся імгненна. Гэта падштурхнула музыкаў да далейшай працы. Між тым песні «Мястэчкі Эўропы», «Генэрал Езавітаў», «Мужык» ужо пачалі жыць самастойна. Апошні твор — на вершы Якуба Коласа (адзіная «не свая» песьня). «Нейк мой бацька гартаў кнігу з творамі Коласа і заўважыў, што «Мужык» — рок-н-рольны тэкст. Паспрабавалі сыграць — сапраўды!» — кажа Лісейчыкаў.

Хлопцы характарызуюць сваю музыку як «блюз гарадзкіх ускраін». Блюзавыя гармоніі ў песьнях сустракаюцца нячаста, але для Лісейчыкава і Дука блюз — гэта не акорды, а найперш настрой. Яны абапіраюцца на сьпеўныя традыцыі Боба Дылана і раньняга Грабеншчыкова, але не капіююць іх. У іх — свая дзялянка. Жартуюць: «Мы граем блюз для гісторыкаў». Сапраўды, хлопцы сьпяваюць пра тое, чым занятыя іх галовы. Лісейчыкаў — малады гісторык, працуе ў Нацыянальным архіве. Яго цікавіць тэма «другіх Саветаў» (адна зь яго работ так і завецца) і асаблівасьці палітычнага жыцьця ў паваеннай Беларусі. Але яго стаўленьне да навуковай кар'еры выкладзена ў адной зь песень дуэту: «Забірае незалежнасьць Акадэмія-павук…»

Хлопцы задаволены, што сышліся разам: дуэт «Чатыры і восем» — узор творчай гармоніі. Праўда, аднадумцаў, каб дадаць у дуэт да стандартнага музычнага складу, адшукаць цяжка: «Нам важна, каб музыка ішла ад душы, таму халодных прафэсіяналаў браць у гурт мы не хочам, аднадумцаў-прафэсіяналаў пакуль не знайшлі, таму і граем дуэтам».

У красавіку дуэт даў сольны канцэрт у Кракаве — у легендарным джазавым клюбе, дзе гралі Біл Кенэдзі, сын Джона Колтрэйна, вядомыя польскія музыкі. «Чатыры і восем» гледачы выклікалі на «біс».

### ДЗЯНІС ЛІСЕЙЧЫКАЎ

**Генэрал Езавітаў**

Велікодная ноч, нарадзі нас скарэй,
Нам бяз розьніцы – шыр ці загон.
Мы пакуль што баімся закрытых дзьвярэй
І ня намі разьбітых вакон.
На разломах старых тэктанічных парод
Мы аскепкі забытай гульні.
Мы сабралі de jure мільёны народ,
Але самі de facto нулі.

Прыбывала вады ў засохлай рацэ,
А смалы – на засохлым камлі.
Генэрал Езавітаў сьціскаў у руцэ,
Што так доўга хавалі ў зямлі.
Ён сказаў, што ня варта баяцца вакон,
Што сьвітанак пачнецца з вакна.
«За маімі плячыма de jure закон,
Перад тварам de facto вайна».

А за намі ўсьлед выскалялася сьмерць,
А за намі – асінавы сад.
Ён скамандаваў болей назад не глядзець
І мы больш не глядзелі назад.
А на ўласнай зямлі і каса не бярэ, –
Генэрал Езавітаў вучыў, –
Перад намі de jure сямнаццаць дзьвярэй,
Але з намі de facto ключы.

Вельмі лёгка стаяць перад хеўрай зьвяроў,
Вельмі цяжка пры гэтым сьпяваць.
Ён вучыў шкадаваць чалавечую кроў,
Дзе вучылі яе праліваць.
Ён сказаў, засланяючы сонца: «Сябры!
Гэта першая наша вясна.
Перад намі адгэтуль de jure абрыў,
А за намі de facto сьцяна».

А гадзіньнік бяжыць і на мёртвай руцэ,
А, бывае, стаіць на жывой.
У адказ на ўдар па нявіннай шчацэ
Не адзін заплаціў галавой.
Тут такая зямля, тут інакш ня жыць,
З ланцуга ня ўдасца аркан.
І гадзіньнік de jure ў вечнасьць бяжыць,
І de facto жывая рука.

**На фота: дуэт «Чатыры на восем». Дзяніс Лісейчыкаў (справа) і Алесь Дуко.**

# Беларускія LLL-мульты выходзяць на CD і DVD

«Мульт-клюб» у Інтэрнэце наведалі 160 тысяч чалавек. Адначасова флэш-аніматарам, які малюе Лукашэнку, зацікавіліся спэцслужбы.

Са стваральнікам сайту «Мульт-клюб» Віктарам не размаўлялі месяцы два. За гэты час з праектам на www.mult.3dway.org адбылося шмат цікавага. LLL-мульты хутка зьявяцца на CD і DVD.

«У «Белтэлекаме», — сьцьвярджае Віктар, — ляжыць папера з КДБ і МУС аб адсочваньні маёй пошты. Інфармацыю зьбіраюць па поўнай праграме». Таму Віктар змушаны пастаянна мяняць электронныя адрасы. Перасьледу не баіцца, хоць допускае, што можа здарыцца прыкрая нечаканасьць: «Да чаго маральна не падрыхтаваны, дык гэта да няшчаснага выпадку. Ці абвесьцяць «наркадылерам» або «гандляром зброяй». Яго гэта крыху злуе, але сваю справу спыняць Віктар не зьбіраецца. Надаўна выйшла 25-я сэрыя, гатовы 26-я і 27-я сэрыі, да праекту далучаецца ўсё болей людзей.

Хутка зьявіцца мажлівасьць глядзець мульты ня толькі ў Інтэрнэце, але і па тэлевізары. Выпуск на відэакасэтах, CD і DVD спансаруе адзін з апазыцыйных палітыкаў «новай хвалі», прозьвішча якога Віктар не называе. «Амаль за год існаваньня «Мульт-клюбу» апазыцыя не зрабіла аніводнай спробы скантактавацца з намі. Здаецца, адну справу робім», — наракае Віктар. Ён засмучаны, што аб праекце напісала расейская «Независимая газета» і расказалі па ВВС, а ў Беларусі ўвагу на яго зьвярнула толькі «Наша Ніва» (больш пра «Лука-мульт-клюб» — у № 10).

Затое наракаць на адсутнасьць увагі публікі не выпадае — наведвальнасьць сайту імклівa расьце. Калі «НН» упершыню напісала пра «Мульт-клюб», сайт наведала 30000 чалавек, за тры месяцы іх колькасьць павысілася да 160 тыс. Першае месца па наведвальнасьці трымаюць айчынныя карыстальнікі, другое — беларусы з ЗША. Трэцяе месца — палякі. Іх цікавасьць можна растлумачыць тым, што амаль усе мультфільмы былі перакладзены на польскую мову. Дапамог пан Жэмавіт з Уроцлава.

На ахвяраваньні сталых слухачоў «Мульт-клюбу» зрабілі налепкі з рэклямай праекту, якія расклеілі па Менску і абласных цэнтрах.

Нядаўна да Віктара далучыліся новыя людзі, прамоцыю ўзялі на сябе хлопцы з праекту «Трэці шлях». «Мульт-клюб» займеў кідкую падназву — «Народнае тэлебачаньне», якую падказалі ўдзельнікі форумаў tut.by.

Пры канцы кастрычніка адбудзецца доўгачаканая прэм'ера беларускіх LLL-мультоў на вялікім экране — іх паказ плянуецца зладзіць у межах фэстывалю эўрапейскай моладзі ва Уроцлаве.

**СБ**

## Ня трэба цешыцца трасянцы

**Не магу пагадзіцца, што «трасяніца» — таксама беларуская мова («НН», 22 ліпеня, А.Трусаў: «Беларуская стае мовай багатых»).**

Трасянка — прадукт магутнага ўплыву іншага лінгвістычнага фактару і пераходны варыянт да расейшчыны. Таму ня трэба сябе цешыць ілюзіяй: ворагам беларушчыны яна выгадная. Апроч таго, трасянка — непісьменная мова, часовы варыянт барбарызаванай беларускай, найлепшы індыкатар маргінальнай асобы. Тады з артыкулу вынікае, што ў нас каля трох чвэртак насельніцтва маргіналізаваныя. Мо таму і жывем пагана, што такое грамадзтва і правадыры?

Кожны нацыяналіст мусіць змагацца не за пашырэньне гэтай пачварнай барбарыстычнай зьявы, не дзівіцца з замілаваньнем на яе, а стаяць за захаваньне сапраўднай спрадвечнай беларускай мовы, супраць сурагатнага ейнага існаваньня.

**Мікола Бусел, Дуброва**

## Да гісторыі пытаньня

**У артыкуле «Восеньскі маратон» («НН», №28, 29 ліпеня) Р.Якаўлеўскі піша, што ў сакавіку генэральны сакратар ААН Кофі Анан прапанаваў распачаць маштабную рэформу арганізацыі, пашыраючы колькасьць сябраў Рады бясьпекі.**

Рэч у тым, што гэтая ідэя яшчэ ў лістападзе 1999 г. была зафіксаваная ў Парыскай дэкларацыі Сацыялістычнага Інтэрнацыяналу «Выклікі глябалізацыі»: «Мы прапануем рэформу ААН і яе Рады бясьпекі праз павелічэньне яе складу. Гэта паспрыяе дэмакратызацыі Аб'яднаных Нацый, бо зробіць РБ больш прадстаўнічаю».

Сацінтэрн, разглядаючы на XXI кангрэсе праблемы глябалізацыі, падыходзіў да іх з гледзішча адносінаў паміж Поўначчу і Поўднем. Ён прапанаваў таксама «заснаваць пад эгідай ААН Раду эканамічнай бясьпекі» (гл.сайт www.socialistinternational.org). У аўтараў прапаноў (а Дэклярацыю рыхтавала камісія пад кіраўніцтвам экс-прэм'ера Гішпаніі Фэліпэ Гансалеса) і ў думках не было пашыраць Раду бясьпекі ААН праз уключэньне ў яе краін Поўначы. Мелася на ўвазе, што ў склад Рады ўвойдуць прадстаўнікі інтарэсаў Поўдня.

Як сацыяліст я цалкам падзяляю такі падыход. А вось гульні, якія пачаліся пасьля XXI кангрэсу СІ, прафанавалі гэтую шляхетную ідэю.

Дзіўна было б бачыць сярод пастаянных сяброў Рады бясьпекі Нямеччыну ды Японію — падпальшчыкаў II сусьветнае вайны, супраць якіх і паўсталі Аб'яднаныя Нацыі. Ня меншаю «павагаю» да правоў чалавека і нацменшасьцяў славіцца яшчэ адзін пастаянны сябар Рады бясьпекі — КНР. Не хапала, каб да іх далучылася Індыя, у якой штогод толькі на каставай глебе забіваюць тысячы людзей.

Малайцы амэрыканцы. Яны, карыстаючыся правам вета, спынілі прафанацыю добрае ідэі і прыкрылі пытаньне пра пашырэньне РБ на няпэўны тэрмін.

**Анатоль Сідарэвіч**

## Лёс Плясьневіча і лёс турызму

**Прадпрымальнік і земляўласьнік палачанін Баляслаў Плясьневіч валодаў зямлёю на тэрыторыі сёньняшняга Расонскага раёну, а сяліба стаяла ў вёсцы Валатоўкі. Апрача вялікай гаспадаркі, Плясьневіч меў фарбавальню, вялікі пчальнік, трымаў конны завод, на якім гадавалі пародзістых рысакоў.**

Палачане, якія наведвалі скачкі на іпадроме, часьцяком ставілі на ягонага жарабка Слаўнага. Конь быў такім добрым, што яго выкралі, прычым вельмі арыгінальна: на стайні разабралі страху, частку сьцяны і вывелі каня па кладцы.

Плясьневіч быў і вядомым мэцэнатам — дапамагаў манахіням Спаса-Эўфрасіньнеўскага манастыра, пастаўляючы ім тканіну і мёд. Быў зацятым гульцом у карты і вельмі любіў паляўнічых сабак, якіх выпісваў з-за мяжы. Любіў цыганскія сьпевы і нават дазваляў цыганам жыць у сваіх уладаньнях. Вось толькі хварэў на самнамбулізм. Месяцовымі начамі трубіў у рог і сонны ішоў у стайню сядлаць каня, каб ехаць на ловы.

Вакол сядзібы рос парк зь ліпавымі ды дубовымі прысадамі, поруч была выкапана сажалка. Пасьля перавароту 1917 г. у адрозьненьне ад брата Якуба застаўся ў Полацку. У 1930-х сям'ю Плясьневічаў выслалі з родных мясьцін. Прычым самога яго разам з сынамі — у Архангельскую вобласьць, а жонку з дочкамі і малымі дзецьмі вывезьлі на Далёкі Ўсход. З бальшавіцкае катаргі вярнулася толькі ўнучка Ірына.

Чым гісторыя Плясьневіча і ягоная сядзіба не матэрыял для таго, каб вазіць у Валатоўку турыстаў?

Турыстычна-пазнавальныя праграмы, работнікі якіх да самай пэнсіі апавядаюць адну і тую ж гістарычную байку, могуць зьвесьці турбізнэс на нішто. Таму трэба ўражваць і зьдзіўляць. Уявім сабе, як у памяшканьне з адноўленым вучэбным абсталяваньнем і рарытэтнымі рэчамі ўваходзіць выкладчык у строях мніха-езуіта. З сваім адпаведна апранутым вучнем ён дэманструе наведнікам тэхнічныя прыёмы навучаньня цягам дзесяціхвіліннага «занятку», размаўляючы на старабеларускай мове. Турысты робяць запісы гусінымі пёрамі і атрамантам, створаным паводле старажытных рэцэптаў. У якасьці сувэніру ім застаецца аркуш паперы зь пячаткаю навучальнай установы. Музэй з элемэнтамі тэатру — гэта цікавае відовішча, якое рэанімуе гісторыю.

Тое ж тычыцца і сядзібаў XVIII—XX ст. У нашых умовах адноўленыя панскія сядзібы-маёнткі Полаччыны з усёй інфраструктурай — паркамі, прысадамі, сажалкамі, альтанкамі — маглі б ператварыцца ў «монплезір» для наведнікаў. Сядзібная культура ў спалучэньні з паслугамі забаўляльнага — накшталт паездак у старых экіпажах і проста на кані — стала б стымулам для аднаўленьня ў рэгіёне конезаводаў. Праехаўшыся на кані і ўбачыўшы маляўнічыя краявіды, турыст мусіць добра паабедаць у адпаведным інтэр'еры і на старым посудзе.

На жаль, нават у самім Полацку турысты дагэтуль практычна не наведваюць старажытны пасад за лукавінай Палаты, зь якога і пачынаўся горад. Месца тое зарасло хмызьняком ды крапівою. Варта было б зрабіць даступнай для агляду частку замкавай гары — ад Чырвонага мосту да вусьця Палаты. Балазе там добра захаваўся гістарычны ляндшафт. Для таго каб зрабіць гэтую пракаветную мясьціну месцам масавых прагулянак, абапал Палаты варта б было пракласьці нешырокія сьцяжыны, перакінуць цераз рачулку пару мастоў. На самой гары варта б было аднавіць (хаця б у выглядзе муляжу) фрагмэнт драўлянай сьцяны і адну з абаронных вежаў.

Культурныя рэсурсы краіны патрабуюць сур'ёзнага вывучэньня і распрацоўкі. Старыя ж ідэалягічныя падыходы ў вызначэньні іх вартасьці наносяць шмат шкоды і прыносяць выключна сымуляцыйныя вынікі.

**Уладзімер Амосаў, Полацак**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні.
З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць
іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск.
E-mail: nn@promedia.by.
Факс: (017) 284-73-29.

# Пэсымізм, нацыяналізм і выбары



Быць адначасова нацыяналістам і пэсымістам немагчыма. Ці не таму апазыцыя недастаткова ўлічвае небясьпекі? Артыкул Юр'я Хадыкі.

Пэсымізмам, адкрытым ці зьлёгку замаскаваным нявер'ем у магчымасьць перамогі над дыктатарскім рэжымам, прасякнута духоўная атмасфэра сёньняшняй Беларусі, асабліва асяродку інтэлектуальнай апазыцыі. Пэсымізм прыпісваўся й Васілю Быкаву.

Пастаноўка такога пытаньня памылковая ў прынцыпе. Скептычныя выказваньні вялікага пісьменьніка былі цьвярозаю ацэнкаю пэрспэктыў нацыянальна-культурнага адраджэньня народу. Часавы маштаб працэсу перавышае працягласьць жыцьця пакаленьня, якое стала пад бел-чырвона-белыя сьцягі ў канцы 1980-х. В.Быкаў быў гарачым прыхільнікам Адраджэньня й перакананым нацыяналістам. Быць нацыяналістам і пэсымістам адначасова *немагчыма*. Як немагчыма адначасова быць вялікадзяржаўным шавіністам і дэмакратам.

Народ, у адрозьненьне ад асобы, вечны. Але да тых часоў, пакуль жыве ў сувэрэннай дзяржаве. Быкаў неаднаразова і недвухсэнсоўна заклікаў зрабіць усё, каб захаваць сувэрэнітэт Беларусі. Ня верыць ілжывым абяцаньням росквіту ў нікім ня бачаным Саюзе Беларусі і Расеі.

Зь цягам часу ў сувэрэннага народу можа зьмяніцца гукавы выгляд мовы. Сучасныя кітайцы і японцы размаўляюць ня так, як дзьве тысячы гадоў таму. Але дзякуючы графічна нязьменным гіерогліфам, якія перадаюць не гучаньне, а сэнс слова, яны захавалі духоўны код сваёй культуры. Таму і не адмаўляюцца ад свайго архаічнага пісьменства.

У нас няма гіерогліфаў. Таму абарона мовы і сувэрэнітэту — зьвязаныя праблемы. Менавіта гаротны стан беларускай мовы ў Беларусі выклікаў горкія выказваньні В.Быкава. Але справа ўжо не безнадзейная, бо моўная праблема стала тэмаю грамадзкіх дыскусій. Больш за тое, можна сьмела сьцьвярджаць, што немагчыма прымусіць масквіча размаўляць так, як А.Лукашэнка. Таму што мова нашага прэзыдэнта — жахлівае беларуска-расейскае кайнэ. Каб было ў Аляксандра Рыгоравіча больш тонкае адчуваньне мэлёдыкі мовы, ён абавязкова выбраў бы адну зь іх. «Трасянка» вельмі выгадная для А.Лукашэнкі па палітычных матывах. Яна забясьпечвае яму ўстойлівую электаральную падтрымку расейскай меншасьці ў Беларусі. І робіць у нейкай ступені праўдападобнымі яго інтэграцыйныя гульні ў Маскве. Апошні ягоны візыт да У.Пуціна зноў актуалізаваў дзьве праблемы — выбараў і сувэрэнітэту. Яны зьвязаныя і пераплеценыя між сабою самым мудрагелістым чынам.

Ёсьць рацыя ў тых маскоўскіх камэнтатараў, якія лічаць, што датэрміновыя выбары былі галоўным клопатам з боку А.Лукашэнкі. Пасьля леташняга рэфэрэндуму і атрыманьня фармальнай магчымасьці неабмежаванай колькасьці баляціровак на пасаду прэзыдэнта мажлівыя датэрміновыя выбары — казырная карта ў руках менскага дыктатара. Робіцца зразумелым яго намер правесьці так званы Ўсебеларускі народны сход у пачатку наступнага году. Яму важна дасягнуць з РФ выгадных «газавых» дамоўленасьцяў на зіму 2005/06. Тады нішто ня зможа перашкодзіць правесьці датэрміновыя выбары на просьбу народу ў канцы ацяпляльнага сэзону і дасягнуць патрэбнага выніку. А будучы пераабраным на новы тэрмін, ён атрымае перавагу перад У.Пуціным і будзе ў стане пачаць інтэграцыйныя гульні з чыстага аркуша.

Адзінай слабасьцю гэтага пляну зьяўляецца тое, што да вясны-2006 апазыцыя здолее скончыць свой пакутлівы працэс аб'яднаньня і будзе мець адзінага дэмакратычнага кандыдата ў прэзыдэнты. Хаця і мала часу на яго папулярызацыю. З двух ліх А.Лукашэнка выбірае меншае — змаганьне з аб'яднанай апазыцыяй, якую яшчэ можна будзе паспрабаваць раскалоць і моц якой ён відавочна недаацэньвае.

Пакуль абедзьве гэтыя небясьпекі апазыцыяй улічваюцца недастаткова. Раённыя сходы па выбарах дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сіл, нягледзячы на супраціў мясцовай і цэнтральнай вэртыкалі, адбыліся ўжо больш чым у 80 раёнах. Агулам працэс скончыцца каля сярэдзіны жніўня. Але сам Кангрэс заплянаваны на другую палову верасьня. Там акрамя абраньня адзінага кандыдата плянуецца абмеркаваць і складаныя пытаньні фармаваньня ценевага ўраду і перадвыбарнай плятформы. Складаныя таму, што ўтрымліваюць зерні расколу.

А магчымая зацяжка з пачаткам кампаніі папулярызацыі лідэра аб'яднанай апазыцыі, якую і так складана праводзіць у зімовых умовах, можа падпаліць непатрэбную канкурэнцыю. Калі кіраўнікі «Дзясяткі», якая вырасла зь «Пяцёркі+», ня здолеюць знайсьці спосаб бесканфліктнага вырашэньня гэтых пытаньняў, то апазыцыя сама можа стаць суаўтарам новай «элегантнай» перамогі рэжыму А.Лукашэнкі. Паколькі, як здаецца, апошні ў чарговы раз абыграў маскоўскага партнэра.

**Юры Хадыка** — прафэсар фізыкі, намесьнік старшыні БНФ.

# Найтаньнейшая падпіска: сьпіс шапікаў

**Найтаньнейшая падпіска на «НН» — у шапіках «Менгарсаюздруку». Каштуе такая падпіска на месяц усяго 3440 рублёў. Забіраць сваю газэту можна ў любой зручнай для вас гандлёвай кропцы «Белсаюздруку» ўжо ў чацьвер па абедзе. Друкуем адрасы пунктаў, дзе можна аформіць падпіску «Да запатрабаваньня».**

**Участак падпіскі «Белсаюздруку»:**

| | |
|---|---|
| вул.Валадарскага, 16, пак.200 | 227-88-41 |

**Пункты прыёму падпіскі:**

| | |
|---|---|
| вул.Жукоўскага, 5, корп.1 | 224-32-03 |
| вул.Раманаўская Слабада, 9 | 200-83-04 |
| вул.Кашавога, 8 | 230-29-20 |

**Крамы:**

| | | |
|---|---|---|
| №1 | вул.Жукоўскага, 5 | 224-03-76 |
| №2 | пр.Скарыны, 44 | 284-83-59 |
| №3 | пр.Скарыны, 76 | 232-46-23 |
| №4 | вул.Леніна, 15 | 227-11-92 |
| №5 | вул.Енісейская, 6 | 243-16-30 |
| №6 | вул.Філімонава, 1 | 235-63-11 |
| №7 | вул.Коласа, 69 | 288-30-20 |
| №8 | вул.Сурганава, 40 | 232-45-10 |
| №9 | пр.Ракасоўскага, 140 | 247-30-15 |
| №10 | бульвар Шаўчэнкі, 7 | 233-74-88 |
| №11 | пр.Пушкіна, 77 | 255-80-71 |
| №12 | вул.Кіжаватава, 80 | 278-77-61 |
| №13 | вул.Каліноўскага, 82/2 | 264-06-42 |
| №14 | вул.Валадарскага, 22 | 227-75-55 |
| №15 | вул.Танка, 16 | 203-82-39 |
| №16 | вул.Харужай, 24 | 234-27-25 |
| №17 | вул.Някрасава, 35 | 231-03-28 |
| №18 | ст.м. «Плошча Перамогі» | 284-31-06 |
| №19 | пр.Машэрава, 5/1 | 223-81-66 |
| №20 | вул.Ясеніна, 16 | 271-87-21 |
| №21 | ст.м. «Пушкінская» | 255-57-20 |
| №22 | вул.Ілімская, 10, корп.2 | 243-16-83 |
| №23 | вул.Славінскага, 39 | 264-36-33 |
| №24 | вул.Жылуновіча, 31 | 295-05-74 |
| №25 | вул.Маркса, 21 | 227-08-52 |
| № 26 | пр.Скарыны, 113 | 264-22-91 |

**Шапікі:**

№18 БДТУ, вул.Сьвярдлова, 13/4
№18 Пэдунівэрсытэт, вул.Савецкая, 18
№78 Гатэль «Юбілейны», пр.Машэрава, 19
№95 Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, вул. Мясьнікова, 39
№136 ст.м. «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі фізвыхаваньня
№187 Гатэль «Беларусь», вул.Старажоўская, 15
№189 Аўтавакзал «Маскоўскі»
№198 БДЭУ, пр.Партызанскі, 26
№209 Прахадная МАЗу, вул.Сацыялістычная, 2
№228 Унівэрсытэт культуры, вул.Рабкораўская, 17
№232 Менскі з-д халадзільнікаў, пр.Машэрава, 61
№245 Бальніца хуткай дапамогі, вул.Кіжаватава, 56
№259 Менскі гандлёвы каледж, вул.Усходняя, 183
№260 пр.Скарыны, 169
№262 Гатэль «Плянэта», пр.Машэрава, 31
№298пр.Машэрава, 75/1
№3029-я бальніца, вул.Сямашкі, 8
№313 Слабадзкі праезд, 24

# Дарус Куоліс: «Радзіма — гэта не зямля і межы, а правы і свабоды»

**Працяг са старонкі 2.**

Так, расейцам і палякам было цяжка зразумець перадвыбарны лёзунг кансэрватараў «Будзь больш літоўцам!». Затое куды больш расейцы і палякі падтрымалі Партыю працы і тых палітыкаў, якія вызначаюцца сымпатыямі да Расеі, — Казімеру Прунскене і Віктара Ўспаскіх. Значна адрозьніваецца і інфармацыйная прастора грамадзян Літвы розных нацыянальнасьцяў. Для літоўцаў яна адна, у расейцаў і палякаў — іншая, паколькі ёсьць розьніца у каштоўнаснай і геапалітычнай арыентацыі. Аднак апошнім часам праграма «Панарама» Нацыянальнага тэлебачаньня і інфармацыйныя праграмы радыё паступова набываюць папулярнасьць ня толькі сярод літоўцаў, але і сярод палякаў, расейцаў. Гэтым жа шляхам ідуць камэрцыйныя тэлеканалы LNK і TV-3.

**— Хто павінен ствараць такое дыскусійнае поле?**

— Перадусім СМІ, калі яны зьбіраюцца ў поўнай меры выконваць сваю грамадзянскую місію, і самі палітыкі. Пакуль жа палітыкі — у тым ліку і з дапамогай прэсы — ствараюць для сябе цалкам ізаляваную і закрытую прастору. У палітычным жыцьці дамінуюць інфармацыйныя тэхналёгіі і адкрытыя спробы маніпуляваць грамадзтвам як масай. У такой сытуацыі патрэбны толькі вялікія грошы і адпрацаваныя тэхналёгіі апэляцыі да пачуцьцяў грамадзян.

**— Наколькі насельніцтва Літвы прадстаўлена ў палітычным жыцьці?**

— Удзел літоўцаў у палітычных працэсах, партыях, грамадзкіх арганізацыях, выбарах надзвычай нізкі. У актыўным палітычным жыцьці бяруць удзел ня больш як 4%. Так, самыя буйныя партыі Літвы налічваюць па 13—14 тыс. членаў. Гэта вельмі мала. Паводле ўдзелу людзей у недзяржаўных арганізацыях, клюбах, аб'яднаньнях наша грамадзтва знаходзіцца на апошнім месцы ў Эўрасаюзе.

## У пошуках сэнсу жыцьця — прэч зь Літвы

**— Чаму пасьля пятнаццаці год незалежнасьці менавіта літоўцы, якія складаюць, у адрозьненьне ад латышоў і эстонцаў, абсалютную большасьць у сваёй дзяржаве, так няўпэўнена адчуваюць сябе ва ўласнай краіне?**

— Прычына — у глыбокім палітычным адчужэньні ўсіх радавых палітычных жыхароў ад імі ж выбранай улады. Яны самі не адчуваюць сябе ў поўнай меры ні грамадзянамі сваёй краіны, ні, тым больш, яе гаспадарамі, для іх дзяржава і ўлада азначае тое самае. Узровень міграцыі зь Літвы намнога вышэйшы, чым з Латвіі і Эстоніі. І справа тут ня толькі ў эканамічных прычынах — умовы жыцьця сёньня ў Эстоніі ці Славакіі прыкладна аднолькавыя зь Літвой. Дзейнічае гістарычная памяць пра папярэднія хвалі літоўскай эміграцыі мінулага стагодзьдзя, а яшчэ — такі важны фактар, як «дэфіцыт сэнсу жыцьця». Людзі ня вераць, што ў Літве рэалізуюць сябе, створаць пасьпяховае жыцьцё для сваёй сям'і і дзяцей. Таму яны ня ў стане стварыць прывабнай прасторы, ідэалаў і каштоўнасьцяў для сваіх суайчыньнікаў іншага паходжаньня — расейскага, польскага, беларускага, габрэйскага.

**— Няўжо Літва павінна зноў апынуцца ў стане сур'ёзнага ціску з-за мяжы ці адкрытай агрэсіі, каб з сэнсам жыцьця ў нас зноў было ўсё ў парадку?**

— Літва стаіць перад рэальным выбарам — якой будзе наша дзяржава і наша грамадзтва. На два вельмі важныя пытаньні мы ўжо адказалі — даволі пасьпяхова стварылі ўсе фармальныя структуры дэмакратычнай дзяржавы і запусьцілі мэханізм свабоднага рынку з усімі яго плюсамі і мінусамі, ён ужо рэальна дзейнічае. Менавіта па гэтых двух крытэрах мы і былі прызнаны як роўныя краінамі Захаду. Аднак па частцы грамадзянскай супольнасьці мы спазьняемся — у савецкія гады яна была цалкам страчана. Праўда, у нас ёсьць добры гістарычны вопыт: у гады «Саюдысу», у перыяд аднаўленьня дзяржавы літоўскае грамадзтва рэальна адчула, што лёс нацыі знаходзіцца ва ўласных руках. Да гэтага вопыту мы павінны вярнуцца. Але цяперашні кантэкст нашага жыцьця — татальнае наступленьне рэклямы, фармаваньне грамадзтва спажываньня — апэруе іншай лёгікай, якая непасрэдна перашкаджае стварэньню грамадзянскай супольнасьці, навязваючы зусім іншыя сыстэмы каштоўнасьцяў. Таму, як у пачатку 1990-х, мы павінны ісьці супраць гэтай плыні, не паддавацца аптымістычным заклінаньням, быццам бы ўсё будзе добра і бяз нашых намаганьняў. Калі мы паддамося падобнай эўфарыі, дык можам неўзабаве зусім ня мець самастойнай будучыні.



ДЗЯНІС РАМАНЮК

**Літоўцы будуюць сваю дзяржаву на традыцыях полінацыянальнай «рэспублікі», якою было Вялікае Княства.**



Дарус Куоліс: «Цяперашні кантэкст нашага жыцьця — татальнае наступленьне рэклямы, фармаваньне грамадзтва спажываньня — апэруе іншай лёгікай, якая перашкаджае стварэньню грамадзянскай супольнасьці, навязваючы зусім іншыя сыстэмы каштоўнасьцяў. Як у пачатку 1990-х, мы павінны ісьці супраць гэтай плыні».

## Дзяржава — «супольная справа»

**— Ці не здаецца Вам, што татальная зьмена сацыяльнага ўздыму пачатку 1990-х на сёньняшнюю сацыяльную апатыю выклікана яшчэ і тым, што Літва, як і Расея, прэтэндуе на званьне «краіны зь непрадказальным мінулым». Напрыклад, масіраваныя спробы пераканаць грамадзтва, што за 50 савецкіх год Літва нічога не атрымала і ні ў чым не дасягнула посьпеху, самазабойчыя па сваёй прыродзе. Большасьць добра памятае, што Літва, яе эканоміка і культура, была адной з найбольш пасьпяховых, «выдатніцай» у той сыстэме. Сёньня ж кіраўнікі краіны спрабуюць пераканаць нас у тым, што ўсе гэтыя посьпехі былі ліпавыя, а фармальныя паводзіны «выдатнікаў» доўгія гады ўмела маскавалі толькі гістарычную гарыч, нацыянальны боль і поўную эканамічную разруху.**

— У савецкія гады Літва і літоўскае грамадзтва ня мелі самастойнага жыцьця ў поўным аб'ёме. Так, Літва жыла і разьвівалася, людзі жылі і стваралі, прыстасаваўшыся да гэтых умоў, аднак уласнай грамадзянскай прасторы не было. Таму абапірацца на савецкі пэрыяд у грамадзянскіх традыцыях мы ня можам.

Праблема ня ў тым, што мы адмаўляем савецкі час, а ў тым, што праз гэтае адмаўленьне ня можам зазірнуць далей у глыб гісторыі, у тыя часы, якія нас не разьядноўвалі, а аб'ядноўвалі, калі Вільня адстойвала ідэю свабоднай рэспублікі і грамадзянскай супольнасьці. Возьмем, напрыклад, перапіску Андрэя Курбскага з Іванам Жахлівым. Курбскі, цытуючы Цыцэрона (якога сам жа перакладаў з лацыні на старарасейскую), кажа свайму колішняму сябру: «Ты загубіў рэспубліку, ты загубіў свабодны горад. А мы тут, у Літве, ствараем гэты свабодны горад. Грамадзянскія правы і грамадзянскія свабоды мы тут маем». Курбскі першы, мабыць, пераклаў на расейскую мову само лацінскае слова «рэспубліка» — «рэч паспалітая». Ён яшчэ і яшчэ раз падкрэсьлівае, што «ў Літве гэтую «рэч паспалітую» мы маем, а вы ў Расеі — не змаглі зьберагчы».

Вільня сапраўды мела такія традыцыі, што, нягледзячы на паходжаньне, культуру, мову, веравызнаньне, супольная прастора — «рэч паспалітая», «супольная справа» — існавала і аб'ядноўвала ўсіх, хто тут жыў. За яе, гэтую «супольную справу», змагаліся ўсе грамадзяне Літвы, незалежна ад паходжаньня. Такая гістарычная рэтраспэктыва вельмі актуальная для нас цяпер. Пакуль мы толькі змагаемся за розныя інтэрпрэтацыі і назвы савецкага часу, а трэба было б проста настойваць на гістарычнай ісьціне, што вольнай літоўскай дзяржавы ў тую пару не існавала. І толькі разуменьне гэтай гістарычнай ісьціны дапамагло ў пару «Саюдысу» яе аднавіць. Калі мы цяпер забудзем пра гэта, у нас ня будзе маральнай апоры і для будучай дзяржавы.

**— Якое заданьне Вы далі б сёньня самім прадстаўнікам нацыянальных меншасьцяў для пасьпяховага ўдзелу ў пабудове грамадзянскай супольнасьці?**

— Няможна паддавацца аптымістычнаму фаталізму: маўляў, усё само сабой станецца. Людзям, якія хочуць жыць тут і хочуць, каб наш дом быў утульным для ўсіх жыхароў і грамадзян Літвы, трэба быць актыўнымі. Грамадзянская пасіўнасьць небясьпечная. Мы ўсё яшчэ жывём у стане эрозіі дэмакратычнай дзяржавы і грамадзтва. Але мы абавязаны яе пераадолець і ўступіць у больш стваральную фазу свайго грамадзкага разьвіцьця.

| | літоўцаў | палякаў | расейцаў |
|---|---|---|---|
| Пагрозу з боку Расеі для Літвы ўгледжваюць | 58% | 16% | 17% |
| Пагрозу з боку ЗША ўгледжваюць | 8,6% | 26% | 22% |
| Грамадзяне Літвы, якія дадатна ацэньваюць пуцінскія рэформы ў Расеі | 15% | 51% | 57% |
| Перадачам Нацыянальнага радыё («LRT») давяраюць | 44% | 13,6% | 11% |
| Навінам «Расейскага радыё «Балтыя» аддаюць перавагу | 1% | 28% | 20% |
| Наагул ня слухаюць радыё | 15% | 24% | 35% |
| Зусім не карыстаюцца Інтэрнэтам | 75% | 85% | 82% |

# Хто замовіў Саюз палякаў? «Яшчык»?

Гэта нагадвала вучэбнае кіно: АМАП урываецца ў камяніцу Саюзу палякаў, узброеныя людзі пад рукі выводзяць абаяльную Анжаліку Борыс — старшыню СПБ, журналістаў, якія зьехаліся ў Горадню. Унутар адразу заходзіць былы старшыня Тадэвуш Кручкоўскі, якога ўлады лічаць сапраўдным кіраўніком Саюзу. Рэпартаж **Алеся Буцька** з Горадні.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Прыхільнікі Анжалікі Борыс сьпяваюць гімн Саюзу палякаў «Ня кінем краю, скуль наш род». Каля будынку Саюзу палякаў.**

Хутка і вынікова. Ніякага супраціву, пагатоў паказанага мелькам па «яшчыку» арсэналу, дзе былі базукі, мінамёты, кулямёты, скрыні з гранатамі; што там яшчэ паказвалі. Арыштаваных развозяць па пастарунках, а ўначы выпускаюць: настрашылі!

Назва гэтых зацемак толькі напалову пазычаная, можна нават сказаць, што амаль арыгінальная. Бо вось жа Галоўная рада СПБ абуралася «антыпольскім» фільмам БТ пад назвай «Хто замовіў Саюз палякаў?», патрабавала этэру для абвяржэньня, ад пракуратуры — крымінальнай справы супраць аўтараў і ўдзельнікаў фільму «за зьнявагу палякаў, за распальваньне міжнацыянальнай варожасьці». А на БТ, зважаючы на тое, што «сьцісласьць — сястра таленту», адказалі: фільму «Хто замовіў Саюз палякаў?» на БТ ніколі не было. Карацей, сасьніў Саюз палякаў кіно пра сябе.

Той, хто прыдумаў гэты адказ, з усьмешкай потым растлумачыў: на БТ быў фільм «Аднойчы ў Косаве, або Хто замовіў Саюз палякаў?». Карацей, трэба назву чытаць ад пачатку да канца. Беларускія палякі абураліся: чаму тэлебачаньне «мантажуе» — то Саюз палякаў, то склады зброі, то нацыянальны край Косава? А Галоўная рада СПБ назвала гэты фільм «фальшыўкай» і «правакацыяй».

У гледача можа стварыцца ўражаньне, што «яшчык» не інакш трызьніць пра якое-небудзь Косава, правакацыі, круцячы апэратыўныя відэаздымкі — свой улюбёны «кінажанр». Зласьліва, ледзьве не з задавальненьнем «яшчык» паказвае, як тэрарысты зьнішчаюць у тым жа Іраку старых, дзяцей, цывільных, паліцыянтаў, жаўнераў новай дэмакратычнай улады. Гэты «яшчык» ня можа забыць колішняга нашага сябра Садама. Ах, як шкада, што яго злавілі, быццам дзікага зьвера, і зараз будуць судзіць за масавае забойства людзей. Шкада: такі быў зух-вусач!

Між іншым, БТ страшыла Саюзам палякаў напалам з тым слаўным Косавым, яшчэ калі ў СПБ кіраваў Тадэвуш Гавін. Ну, дарэчы, з Гавіным цяпер адносіны высьветлілі: у аўторак схапілі, завезьлі ў суд, пасадзілі за краты на 15 дзён. Каб не выступаў перад сябрамі СПБ, не абвяшчаў, што ўлада яшчэ адкажа за ўсе свае справункі.

Памятаю, у той год «яшчык» ажно захлынаўся ад непрыхільнасьці да «амэрыканскага агрэсара» і ад замілаваньня да сівога бялградзкага правадыра, які таксама чакае суду сёньня. Хтосьці тады напісаў: дураць галаву чым заўгодна, але ня ведаюць, што Косава — мясьціна беларуская і адзначаная ў гісторыі. Скончылася тагачасная гістэрыя, зазірнулі ў энцыкляпэдыю, стварылі «кінашэдэўр» пра «Аднойчы ў Косаве…». Не зьдзіўлюся, калі яго адзначаць якім-небудзь проста «віцязем», ці «яшчыкам» — якія там у іх яшчэ мастацкія ўзнагароды?

Яшчэ год таму даводзілася чуць, што нібыта на Беласточчыне асобныя беларусы, любячы нашага бацьку праз калючы дрот, пахваляюць: добра дае гэтым палякам касьцельным! Канечне, добра, даўшы спачатку беларусам, выпрабаваўшы гумовую палку. Некаторым чытачам «НН», якія за мяжой адарваліся ад беларускай рэчаіснасьці, нават уявілася, што бацька дае тым, каб спыніць палянізацыю, каб ледзьве не перамагла беларусізацыя. Варта ім нагадаць, што польскамоўная школа ў Горадні яшчэ існуе, а вось беларускіх ніхто ўжо ня памятае. Усё як у добрыя старыя савецкія часы: усё вакол расейскае. Дык няхай жа хоць польская школа застаецца выспай сярод сёньняшняга акіяну русіфікацыі. Дарэчы, вучні гэтай школы добра размаўляюць па-беларуску.

Дык хто ж замовіў Саюз палякаў? Я пацікавіўся гэтым у сваіх сяброў і знаёмых. Адны гаварылі, што ім пляваць на Саюз палякаў, іншыя — што гэта праява маскоўскай палітыкі ў Беларусі: спачатку Масква дамаглася чужымі рукамі максымальнага вынішчэньня беларушчыны, цяпер настала чарга пальшчызны. Нездарма пачалі разьдзьмухваць міждзяржаўны скандал з-за выбітага ў Варшаве зуба. Вось такія ў людзей меркаваньні. Нарэшце, вельмі пашыраныя: пра будучыню СПБ спытайце ў Канторы — іхных, маўляў, рук справа. Сапраўды, як любіць казаць Бацька, народ у нас не дурны: усё кеміць, адно маўчыць…

Можна было б яшчэ спаслацца на польскіх палітыкаў: яны заяўляюць, што няма канфлікту паміж беларусамі і палякамі, што гэта не этнічны канфлікт, а канфлікт паміж дэмакратычнай Эўропай і апошняй эўрапейскай дыктатурай, дзе не шануюцца правы і палітычныя свабоды людзей — беларусаў, палякаў, усіх, хто ня згодны з парадкамі паліцэйскай дзяржавы. Гэтая ўлада сама заяўляе, што ёй бяз розьніцы, хто чалавек па нацыянальнасьці, існуе толькі падзел на сваіх і чужых — карацей, поўны інтэрнацыянал. Улада надзвычай здольная, калі гаворка ідзе пра такія справы, як з Саюзам палякаў. Досыць прыгадаць, што нават з камуністычнай партыі здолелі дзьве зрабіць. Вось і з СПБ так учынілі — амаль што без намаганьняў.

У сакавіку ў Горадні на сваім зьезьдзе палякі выбралі новага кіраўніка Анжаліку Борыс. Уладам гэта не спадабалася: яны хацелі, каб другі тэрмін у СПБ кіраваў любы ім чалавек — Тадэвуш Кручкоўскі. Улады думалі дакладна два месяцы і прыдумалі: ваш зьезд несапраўдны, Борыс — ніхто, Кручкоўскі — па-ранейшаму будзе кіраваць. І далі яму аднačасова заданьне — вызначыць дату і зноў правесьці зьезд, але такі, каб не выбіралі Борыс і да яе падобных.

У Саюзе палякаў спачатку занэрваваліся, потым крыху супакоіліся: загад Мін'юсту — не закон, хай прысылаюць два папярэджаньні, потым зьвяртаюцца ў суд, каб ліквідаваць СПБ, а мы пазмагаемся, абскардзім судовае рашэньне. Не ўлічылі, што гэта краіна, у якой законы ня толькі ўказы, а нават загады камандзіра міліцэйскага батальёну — не пушчаць у суд журналістаў, асабліва з дыктафонамі і фотаапаратамі. Загад Мін'юсту спадар Кручкоўскі, між іншым, не выконваў два з паловай месяцы, хаця на выкананьне было дадзена два тыдні. Ну, але ўрэшце пры канцы ліпеня ў Шчучыне ўсё ж сабраліся 13 з 35 сяброў старой Галоўнай рады і прагаласавалі — правесьці паўторна зьезд у Ваўкавыску 27 жніўня.

У той жа вечар АМАП штурмам узяў Саюз палякаў. Яго цяпер моцна сьцерагуць, і міліцыя будзе прынамсі месяц стаяць на варце ды ахоўваць спакой «новага-старога» гаспадара сядзібы і паплечнікаў. Ахоўваюць сёньня СПБ зь відэакамэрай, ствараючы новыя кілямэтры будучых кінашэдэўраў для нашага «яшчыка». Ясна, што ў любы час па выкліку можа зноўку прыбыць АМАП, не зьдзіўлюся, калі і бранятэхніка паявіцца на выпадак абароны цытадэлі СПБ ад якіх-небудзь косаўскіх паўстанцаў. «Яшчык» жа паказаў, што ў іх зброі — нібы ў колішніх беларускіх партызан, а «яшчыку» ў гэтай краіне належыць верыць «беспрэкаслоўна».

## ХРОНІКА

### Позвы для Борыс

26 ліпеня ў кватэру старшыні Саюзу палякаў Беларусі **Анжалікі Борыс** спрабавалі ўварвацца міліцыянты: нарад грукаўся ў 23.00, каб уручыць позву. 28 ліпеня ў міліцыі Борыс паведамілі, што яе абвінавачваюць у фінансавых злоўжываньнях.

### Вакол СПБ

27 ліпеня ўвечары адбыўся захоп **сядзібы СПБ** міліцыянтамі й АМАПам. Былі затрыманы каля 20 чалавек, у тым ліку журналісты. Міліцыянты апісалі маёмасьць у сядзібе. 28 ліпеня зранку сябры СПБ наладзілі калектыўную малітву каля сядзібы.

У захопленым будынку 28 ліпеня экс-старшыня СПБ Тадэвуш Кручкоўскі даў прэс-канфэрэнцыю, на якую не пусьцілі незалежных журналістаў — кіраўніка Гарадзенскай філіі БАЖ **Паўла Мажэйку**, рэдактара газэты «Głos znad Niemna» **Анджэя Пісальніка**, журналістаў **Ігара Банцара**, **Міколу Маркевіча**, **Івана Романа**, карэспандэнта сайту www.hrodna.by **Андрэя Кусельчука**, журналістаў радыё **«RMF-FM»**.

У Шчучыне 27 ліпеня адбылося пасяджэньне Галоўнай рады СПБ у старым (дазьездаўскім) складзе, дзе было вырашана правесьці VI зьезд арганізацыі паўторна.

Пасол Польшчы ў Беларусі **Тадэвуш Паўляк** 28 ліпеня быў адкліканы для кансультацый у Варшаву.

### Суткі за 3 ліпеня

У Шчучыне 26 ліпеня ўвечары затрымалі намесьніка старшыні СПБ **Юзафа Пажэцкага**, актывіста СПБ **Мечыслава Яскевіча** і рэдактара часопісу «Magazyn Polski» **Андрэя Пачобута**. Іх абвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаванай акцыі ў Шчучыне 3 ліпеня (канцэрт арганізаваны мясцовай філіяй СПБ). Пачобуту далі 15 сутак арышту, Пажэцкаму й Яскевічу — па 10.

### Затрымалі польскіх журналістаў

27 ліпеня па дарозе з Горадні ў Ліду былі затрыманы журналісты польскай «Gazety Wyborczej» **Вацлаў Радзівіновіч** і **Роберт Кавалеўскі**. У іх праверылі дакумэнты, выпісалі штраф. Потым міліцыянтам нехта затэлефанаваў, і яны зьнялі нумары з машыны ды затрымалі **Ю.Пажэцкага**.

У Шчучыне ў той самы дзень затрымалі журналістку польскага тэлеканалу і TVP1 **Агнешку Рамашэўскую**: яе абвінавацілі ў адсутнасьці акрэдытацыі МЗС.

### «Суткі» журналістаў

Журналістаў **А.Пісальніка** і **І.Банцара** ў Горадні 1 жніўня затрымала міліцыя. Банцара затрымалі, калі ён нёс зварот Тадэвуша Гавіна да палякаў Беларусі; зварот канфіскавалі. Пісальніка даставілі ў Шчучын, каб асудзіць за акцыю 3 ліпеня. Суд будзе 4 жніўня, да суду журналіста адпусьцілі пад расьпіску.

### Затрымалі Кеўляка

Віцэ-старшыню Саюзу палякаў **Вацлава Кеўляка** затрымалі 2 жніўня, калі ён з жонкай і хворым дзіцем ішоў у дзіцячую паліклініку.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Дзеравяны пікет

Актывісты БРСМ пілуюць ля польскага пасольства бервяно сяброўства. Рэпартаж **Алеся Кудрыцкага.**

На бязьлюднай вуліцы Румянцава стаіць натоўп. Паўсотні чалавек пад чырвона-зялёнымі сьцягамі. Пікетоўшчыкі перамаўляюцца адзін з адным, адказваюць на пытаньні журналістаў ці проста пазіруюць перад сабою, нібы зьлёгку загіпнатызаваныя. Сьпякотна. Мінулым разам перад пасольствам Польшчы адмывалі ў пральнай машыне даляры, сёньня — пілуюць бервяно, на якім напісана «дружба». На лязо пілы прымацаваны бела-чырвоны сьцяжок. На адпілаваным кругляшку флямастарам напісалі «1 дзень». Калі так пойдзе далей, дык бервяна хопіць дзён на дзесяць — пасьля гэтага яно проста зваліцца з козлаў.

«Пакуль хтосьці танчыць амэрыканскі факстрот, беларуская полька нам радасьць нясе», — надрукавана прынтарам па-расейску на аркушы паперы. Яго трымае ля грудзей дзяўчо гадоў шаснаццаці на выгляд. «А вы ведаеце, што такое «факстрот?» — пытаецца ў яе тэлежурналістка «RenTV». На твары дзяўчыны зьяўляецца зьніякавелая міна. Што такое факстрот, яна ўяўляе досыць цьмяна. «А чаго вы тут стаіце?» — не пакідае яе ў спакоі журналістка. «Стаю сабе і стаю». — «Сказалі стаяць, вось і стаіце?» — «Так». «Ты што такое кажаш?!» — шыкае на яе ззаду старэйшая таварышка. Дзяўчо, канчаткова зьбянтэжанае, лічыць за лепшае наагул змоўкнуць.

Яе палітычна падкаваная суседка прымае эстафэту. «Хіба вы калі-небудзь чулі, каб беларусы і палякі ў нашай краіне варагавалі, якія-небудзь процістаяньні, працівборствы былі? Я таксама ня чула. Чаму тады па тэлебачаньні пачынаецца нейкі гармідар, што мы некага прыгнятаем?» — «Дык хто вінаваты?» — «Я лічу, што гэта ідзе зьверху. Паміж простымі людзьмі няма непаразуменьня». Пікетоўшчыца пакрысе распаляецца. Выходзіць амаль крамола: «Я спадзяюся, што на ўсё гэта зьвернуць увагу ўрады нашых краін і ня будуць сеяць разлад паміж нашымі людзьмі. Жылі мы ў міры і будзем жыць далей».

Побач стаяць Максім і Дзяніс — звычайныя бээрэсэмаўцы. Два школьнікі ў пінжаках, якія на іх плячах выглядаюць крыху завялікімі. Максім трымае папяровы плякат «Ня трэба парушаць традыцыі братоўславян!», а Дзяніс — жоўтую расьцяжку «Суседзям трэба сябраваць».

«Дык што рабіць, хлопцы, у гэтай сытуацыі?» — «Ня ведаем, — адказвае Максім. — Па-мойму, яны самі павінны вырашаць». — «Яны — гэта хто?» — «Польшча». — «А што палякі павінны зрабіць?» — «Яны павінны, як бы, паглядзець на ўсё і... ацаніць», — пачынае запінацца Максім. «Ацаніць усе перавагі, якія пераважаюць у нас на тэрыторыі Беларусі, і таксама палепшыць суадносіны сваёй замежнай і ўнутранай палітыкі, — дапамагае падшукаць словы сябру Дзяніс. — А то кажуць, што ва ўнутранай палітыцы нейкая неразьбярыха выходзіць, і, каб усё зьвесьці з канцамі, яны абапіраюцца на Рэспубліку Беларусь і спадзяюцца на яе. І незразумела, праз што ўся гэтая неразьбярыха пачалася. Мы зьяўляемся суседзямі, межы ў нас супольныя, і яны павінны ўмовы стварыць для перасячэньня мяжы. У мяне ў Польшчы шмат родных, і, каб да іх дабрацца, трэба шмат цяганіны, каб аформіць гэта ўсё і прыехаць да іх у госьці. І гандаль павінны падтрымліваць, а то парушаюць усякае заканадаўства, якое было заключанае паміж Рэспублікай Беларусь і Польшчай. Ну і на гэтым, здаецца, усё». — «Дык мо варта нам у Эўразьвяз уступіць? Няма межаў — няма праблем». — «Сказаць, каб у Эўразьвяз, — дык неяк неахвота ўступаць, — крэкае Дзяніс. — Проста, на мой погляд, у Эўразьвяз уступаюць тыя краіны, у якіх узровень дабрабыту на найвышэйшым узроўні. І па-другое, мне падабаецца наша Рэспубліка Беларусь (тут ён пераходзіць на беларускую мову. — **Аўт.**), незалежная ад ніякіх іншых краін, і неахвота, каб мы залежалі ад прадвызначанасьці. Трэба самастойна разьвівацца. А падругое, з Рэспублікі Беларусь сыходзіць шмат навукоўцаў усялякіх. Трэба, каб Аляксандар Рыгоравіч зрабіў так, каб навука нашая павышала ўзровень дабрабыту і каб усе навукоўцы заставаліся ў нас, а не зьяжджалі за мяжу ў той самы Эўразьвяз. На гэтым усё». — «А вось беларуская мова ж таксама славянская...» — «Так!» — ахвотна згаджаецца Максім. «...Дык чаму ў вас усе плякаты па-расейску?» «Плякаты ня мы складалі. Плякаты былі арганізаваныя Першамайскім раёнам, і гэта не да нас пытаньне». «У большасьці славянскіх краінаў палова людзей размаўляе на расейскай мове, і нашы мовы згубіліся», — тлумачыць сытуацыю Максім.

Не, не па гладка абгабляваных словах функцыянэраў БРСМ, а менавіта па бязладных абрывістых думках шараговых актывістаў можна меркаваць пра тое, у каго пакрысе ператвараецца нашая моладзь. Так, яны верачь у Аляксандра Рыгоравіча, затое любяць сваю Рэспубліку Беларусь. Яны не навучаныя беларускай мове, але самыя галоўныя рэчы яны інстынктыўна спрабуюць прамаўляць менавіта на ёй. У іх галовах неймаверная каша з абрыўкаў лекцый па ідэалёгіі, напаўвуха слуханых прамоў, рэпартажаў БТ ды лекцый «важакоў». Але яны не ствараюць уражаньня злых людзей. У прынцыпе, не злавалі яны і на палякаў. Проста хтосьці пераканаў іх, што гэта менавіта палякі разззлаваліся на Беларусь, і бээрэсэмаўцы прыйшлі спытацца: «Чаму?» Тым больш што адказу на пытаньне «З чаго ўсё пачалося?» ніхто зь іх ня ведаў. Нават сьмяяцца ня хочацца з гэтых дзяцей, якія стаялі пад сонцам, пакуль іх правадыры хаваліся ў цяньку дрэў на вуліцы Румянцава.

## АПЫТАНЬНЕ «НН»

# Ці можна ў Беларусі атрымаць палітычныя дывідэнды, гуляючы на антыпольскіх пачуцьцях?

**Валер Булгакаў,** галоўны рэдактар часопісу «Arche»:

— Можна, калі гэта робіць Лукашэнка. У Беларусі акурат кампаніі супраць уяўных ворагаў — унутраных ці замежных, а не нармальныя дэмакратычныя працэдуры робяць афіцыйную палітыку ідовішчнай. Гэта свайго роду аналяг нармальных выбараў у нармальнай дэмакратыі. Дынамізму палітычнае сыстэмы кіраўніцтва краіны дасягае не праз рэальнае абнаўленьне палітычнага істэблішмэнту, а праз пошукі вядзьмарак. Таму папулярнасьць падобных кампаній пошуку ворагаў — сярод намэнклятуры, сярод беларускамоўных, сярод пратэстантаў і палякаў — будзе захоўвацца датуль, пакуль у нас ня будзе дэмакратыі.

**Тадэвуш Гавін,** першы старшыня Саюзу палякаў Беларусі (цяпер адбывае 15-дзённы арышт):

— Калі я быў школьнікам, адчуваў з боку беларусаў ня вельмі прыхільнае стаўленьне, калі мяне адсылалі ў вёску на адпачынак. Гэта былі людзі, якія памяталі даваенную Польшчу і пераносілі на мяне сваю крыўду на палякаў. Але гэта было даўно — у 1960—70-я гг. Сёньня няма такіх дачыненьняў паміж беларусамі й палякамі.

І сёньня ёсьць асобы, якія хочуць распаліць варожасьць да палякаў, але плёну яны не атрымаюць. Сытуацыя ў сьвеце ня тая, што была ў 1950-я. Але знойдуцца людзі, якія будуць пляскаць ім у ладкі, што вось яны хочуць з Польшчай нешта зрабіць, асадзіць неяк палякаў. Калі дзяржаўнае тэлебачаньне паказвае асобу, якая заяўляе, што Польшча — палітычная прастытутка, гэта характарызуе дзяржаву. Нармальная дзяржава не дазволіць такога паказваць, нават калі такія настроі ёсьць у некага.

**Генадзь Грушавы,** экс-дэпутат Вярхоўнага Савету, прафэсар філязофіі:

— Ніколі гэтага не адбудзецца ў Беларусі. Для большасьці нашага насельніцтва гэта — фальшывая карта. Я з 1989-га займаюся дабрачыннасьцю і магу сказаць, што палякі першымі адгукнуліся на нашу Чарнобыльскую трагедыю: у 1990 г. яны прынялі 1,5 тыс. дзяцей Беларусі. Я падкрэсьліваю — Беларусі, а не паводле нацыянальнай прыкметы.

**Алесь Міхалевіч,** намесьнік старшыні Партыі БНФ:

— Залежыць ад таго, на якім баку гуляць. Гітлер казаў, што нацыю лепш за ўсё аб'ядноўваць супраць якога-небудзь ворага. Калі разглядаць так — «аб'яднацца супраць кагосьці», то Лукашэнка вырашыў аб'яднаць нацыю супраць палякаў. І гэта лягічна: амэрыканцы далёка, іх тут ніхто ня бачыць, супраць украінцаў аб'яднаць таксама цяжка... Лукашэнка можа атрымаць пэўныя палітычныя дывідэнды, гуляючы супраць палякаў. Але гэта яго і зьнішчыць: бальшыня беларусаў разумеюць, што палякі жывуць побач з намі даўно і нічога кепскага нам ня робяць.

**Уладзімер Нісьцюк,** намесьнік старшыні БСДП («Грамада»):

— Толькі нэгатыў. Вельмі моцна зьвязаны нашы народы. Існуе вельмі вялікі досьвед нашых узаемных стасункаў. І этнічна, і геаграфічна, і гістарычна мы зьвязаны вельмі моцна.

**Аляксандар Фядута,** публіцыст:

— Не. Я быў гарадзенец і магу сказаць: у Горадні немагчыма растлумачыць, чым беларус адрозьніваецца ад паляка.

**Працяг на старонцы 14.**

# Марыюш Машкевіч: «Гэта палітыка эўрапейскага маштабу»

Як будзе разьвівацца польска-беларускі канфлікт і чым ён скончыцца? На пытаньні карэспандэнта «НН» адказвае былы пасол Польшчы ў Беларусі Марыюш Машкевіч.

**«НН»: Ці магчымы цяпер кампраміс паміж беларускімі ды польскімі ўладамі?**

**Марыюш Машкевіч:** Ня толькі магчымы, але і патрэбны. Трэба скончыць гэты нікому не патрэбны канфлікт паміж нашымі краінамі. Мне здаецца, што калі Менск сапраўды пажадае пайсьці на кантакт з польскім бокам, дык дастаткова будзе проста сесьці за стол перамоў.

**«НН»: Наколькі адэкватна польскія ўлады рэагуюць на тое, што адбываецца вакол Саюзу палякаў?**

**ММ:** Гэта не такая сытуацыя, зь якой польскі бок сутыкаецца штотыдзень, і мы не чакалі такога павароту падзей. Нашым дыпляматычным дачыненьням 15 гадоў, але ніколі такога не было.

**«НН»: Ці апраўдана цалкам перакладаць віну за канфлікт на беларускія ўлады? Можа, тут ёсьць віна і польскага боку?**

**ММ:** Відавочна, што беларуская ўлада хацела б мець поўны кантроль і палітычна нэўтралізаваць польскія арганізацыі, ізаляваць іх ад беларускага грамадзтва. Тут палягае не віна, а пралік польскага боку: на працягу трохчатырох апошніх гадоў сытуацыя польскай меншасьці ў Беларусі ня зьвязвалася з агульнай сытуацыяй беларускага грамадзтва. Я маю на ўвазе тое, што палякі ў Беларусі фактычна не разглядаліся як грамадзяне Беларусі. Але беларускі бок выкарыстоўвае мэтады КДБ у дачыненьні да польскіх арганізацый. Калі ім нешта не падабаецца, яны ўсё гатовы разбурыць і паставіць свайго чалавека.

**«НН»: Увосень адбудуцца прэзыдэнцкія выбары ў Польшчы. Ці не выкарыстоўваецца скандал у палітычных кампаніях?**

**ММ:** Да выбараў тут наагул няма ніякага дачыненьня. Прыезд у Горадню віцэ-маршалка сойму Доналда Туска быў выкліканы пільнай патрэбай. Іншыя кандыдаты таксама могуць паехаць у Беларусь. Я ведаю, што Ўладзімер Цімашэвіч, таксама кандыдат у прэзыдэнты, вельмі заклапочаны сытуацыяй польскай меншасьці на Гарадзеншчыне, ён блізкі сябар былога старшыні СПБ Тадэвуша Гавіна. Калі Цімашэвіч быў міністрам замежных спраў, ён вельмі цікавіўся справамі беларускіх палякаў. Але з выбарамі гэта ніяк не зьвязана.

**«НН»: Ці ёсьць цяпер у Польшчы нейкі палітык ці палітычная сіла, якая падтрымлівала б Кручкоўскага?**

**ММ:** Раней такіх было шмат. Напрыклад, Мацей Гертых, лідэр Лігі польскіх сем'яў, быў вялікім сябрам Кручкоўскага, але калі ўбачыў, да чаго ідзе, проста адмовіўся ад супрацоўніцтва. Анджэй Лепэр, як мне здаецца, прынцыпова не цікавіцца гэтым канфліктам, бо падтрымлівае Лукашэнку. Лепэру нявыгадна цяпер выказвацца, бо гэта прывядзе да нагнятаньня настрояў ня толькі сярод палякаў, але й сярод беларускага грамадзтва гонару нікому ня зробіць, іміджу палітыка не паспрыяе.

> «Мы шмат разоў пераконваліся, што палітыка ў Беларусі робіцца як Лукашэнкам, так і рознымі службамі, якія не падпарадкоўваюцца яму».

Нікому ў Польшчы ня хочацца станавіцца на той бок барыкад.

**«НН»: Якую мэту ставіць перад сабой Лукашэнка, разьдзьмухваючы канфлікт?**

**ММ:** Для ўлады ў Менску ёсьць дзьве мэты. Першая — нэўтралізацыя грамадзянскай супольнасьці, другая — узмацненьне расейскага ўплыву, падтрымка расейскіх палітычных акцый, якія аслабляюць пазыцыю Польшчы ў Эўразьвязе. Гэта палітыка эўрапейскага маштабу. Для Масквы важна аслабляць пазыцыі краін Балтыі, новых сяброў ЭЗ, паказваць, што яны безадказныя, што яны ствараюць небясьпеку для старых сяброў Эўразьвязу. Палітыка, мэтай якой зьяўляецца разьбіць салідарнасьць ЭЗ.

**«НН»: Значыцца, Лукашэнка праводзіць расейскую палітыку?**

**ММ:** Можа быць, ня ён сам. Мы шмат разоў пераконваліся, што палітыка ў Беларусі робіцца як Лукашэнкам, так і рознымі чыноўнікамі, службамі, якія не падпарадкоўваюцца яму.

**«НН»: Наколькі гэтая сытуацыя паўплывае на сьветаўспрыманьне палякаў і наколькі яна паўплывае на ўспрыманьне палякаў беларусамі?**

**ММ:** Калі да людзей будзе даходзіць поўная інфармацыя, тады ўсе адразу зразумеюць, хто намагаецца сапсаваць стасункі паміж нашымі краінамі. Але калі да людзей будзе даходзіць фільтраваная інфармацыя, то нам варта зноў чакаць выпадкаў накшталт таго, калі БТ назвала Польшчу прастытуткай. Можа быць, нейкім беларусам гэта і падабаецца, але ўсё-такі нашыя краіны ніколі так адна да адной не зьвярталіся. Гэта вельмі непрыемна, але мне здаецца, ніхто сур'ёзна гэта ня можа ўспрымаць. Гэта эмоцыі нявыхаванага, неадукаванага чалавека. Разумныя людзі ня будуць прыслухоўвацца да прапаганды, разгорнутай у мас-мэдыя.

**«НН»: Як Вы лічыце, ці ня варта было б Польшчы пайсьці ў гэтай сытуацыі на нейкі неардынарны пазытыўны крок, каб паказаць, што варожасьці да беларусаў няма?**

**ММ:** На мінулым тыдні міністар замежных спраў (Адам Ротфэльд — «*НН*») заклікаў консулаў максымальна аблегчыць беларускім грамадзянам працэдуру атрыманьня польскай візы. Гэта пазытыўны крок, які мусіць паказаць, што мы да беларускіх грамадзян ставімся вельмі станоўча і што канфліктная сытуацыя створана штучна.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**

**Міністар замежных справаў Польшчы Адам Ротфэльд** заклікаў консулаў максымальна аблегчыць беларускім грамадзянам працэдуру атрыманьня польскай візы. Гэты крок мусіць паказаць, што Польшча ставіцца да беларускіх грамадзян вельмі станоўча і што канфлікт створаны штучна.



**Марыюш Машкевіч** нарадзіўся ў 1959. Скончыў Інстытут рэлігіязнаўства Ягелёнскага ўнівэрсытэту, мае ступень доктару сацыялёгіі. Кар'еру распачаў як віцэ-дырэктар аддзелу грамадзянскіх справаў ваяводзкага ўраду ў Чанстахове. У 1990 пайшоў на працу ў Міністэрства замежных справаў Польшчы. Працаваў генэральным консулам у Горадні, а потым – паслом Польшчы ў Беларусі. У 2002 вяртаецца ў Польшчу. У фундацыі «Ведаць як» займаецца арганізацыяй стажыровак для маладых прадпрымальнікаў з постсавецкіх краінаў. Цяпер працуе ў Бюро гаспадарчай дапамогі Ўсходняй Эўропе, ладзіць разнастайныя міжнародныя бізнэс-праекты.

## АПЫТАНЬНЕ «НН»

# Ці можна ў Беларусі атрымаць палітычныя дывідэнды, гуляючы на антыпольскіх пачуцьцях?

Працяг са старонкі 13.

Яны ж жывуць побач, і цяжка сказаць, каго там больш — беларусаў ці палякаў.

Каб атрымаць палітычныя дывідэнды, трэба, каб той, супраць каго гуляеш, успрымаўся як іншы, чужы. А палякі — якія ж яны чужыя? Яны ж побач жывуць! Сярод іх, як і сярод беларусаў, ёсьць праваслаўныя і каталікі, людзі прыстойныя і непрыстойныя. Габрэя можна адрозьніць. А паляка — як? Імя «Чаславў» — яно чыё?.. Каб адрозьніць паляка ад беларуса, трэба растлумачыць, у чым гэтая розьніца. Калі б знайшоўся які-небудзь міністар Розэнбэрг, які ўзяўся б гэта растлумачыць, дык і яму, мабыць, не ўдалося б.

**Аляксей Марачкін,** мастак, кіраўнік МГА «Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына»:

— Той, хто правакуе гэтыя канфлікты, можа атрымаць зь іх палітычныя дывідэнды. Лукашэнку канфлікт выгадны, асабліва калі ў яго ўцягнецца Расея. З Эўропай у яго ніякіх сувязяў няма, ён сам ізалюецца. А на антыпольскіх пачуцьцях ён яшчэ больш умацоўвае свае сувязі з Расеяй, у якой вельмі моцныя імпэрскія настроі.

**Аляксандар Класкоўскі,** аналітык, рэдактар штотыднёвіка «Белорусская неделя»:

— Улада крытыкуе пазыцыю афіцыйнай Варшавы і ўсяляк падкрэсьлівае, што простыя палякі не падзяляюць гэтай пазыцыі. Таму вельмі акуратна трэба ставіцца да ўжываньня тэрміну «антыпольскія настроі».Улада якраз хоча атрымаць палітычныя дывідэнды ў выкрыцьці пазыцыі афіцыйнай Варшавы, якая нібыта ідзе ў рэчышчы амэрыканскай палітыкі. Але варта зрабіць дзьве рэмаркі. Па-першае, гэта гульня на агульна антызаходнім і ксэнафобскім мэнталітэце пэўнай часткі насельніцтва. І гэта вельмі кепска, бо кансэрвуе такія настроі ў грамадзтве. Па-другое, у пляне міжнародных адносін гэта гульня з агнём. У пабытовых адносінах яшчэ існуе непрыязнасьць да палякаў. Магчыма, яшчэ з часоў Пілсудзкага. І вельмі недальнабачна — дзьмуць на гэтыя «галавешкі»…

**Анжаліка Борыс,** старшыня Саюзу палякаў Беларусі:

— Я не палітык, каб даваць такія камэнтары, хаця зь мяне робяць вялікага палітыка і ворага. Той, хто спрабуе гуляць на антыпольскіх настроях, робіць глупства.

**Апытваў Аркадзь Шанскі**

МАЛЮНКІ ІБРАГІМА ГЕМБІЦКАГА (1938—1940)

**«Барацьба з палякамі ёсьць жыватрапечачай тэмаю ў беларускім мастацтве!» «Звязда», 1938 г.**



### Малітва за СПБ

У аўторак, 2 жніўня, у Бэрнардынскім касьцёле Горадні 200 чалавек на чале з старшынёй Саюзу палякаў у Беларусі Анжалікай Борыс маліліся за вырашэньне канфлікту ў арганізацыі. Пробашч касьцёлу пасьля імшы заклікаў не праводзіць ніякага спатканьня ля будынку, бо баіцца, што сьвятыні не дазволяць арганізоўваць крыжовы ход на сьвята Божага Цела.

**pahonia.promedia.by**

### Канцэпцыя Кручкоўскага, канцэпцыя Гавіна й канцэпцыя Борыс

Канцэпцыяй першага старшыні СПБ **Тадэвуша Гавіна** было цеснае супрацоўніцтва зь незалежным грамадзтвам Беларусі, у тым ліку з палітычнай апазыцыяй. У разуменьні Т.Гавіна польская меншасьць, хочучы захаваць сваю самабытнасьць, *мусіць* уключыцца ў будаваньне грамадзянскай супольнасьці ў краіне, *мусіць* падтрымаць дэмакратычныя парывы беларускага грамадзтва і курс на дэсаветызацыю ды эўрапеізацыю Беларусі.

Польскасьць у выданьні **Тадэвуша Кручкоўскага** грунтавалася на адмове ад кантактаў зь незалежнымі грамадзкімі арганізацыямі і цесным кантакце з уладамі. Польскі нацыяналізм спалучаўся зь ляяльнасьцю да рэжыму і… пагардай да беларускай культуры. У прыватнасьці, Т.Кручкоўскі актыўна ўжываў рыторыку «зьнешняга ворага», дзе ворагам аказаўся беларускі адраджэнскі рух! Такая пазыцыя была нэгатыўна ўспрынятая ня толькі беларускімі дэмакратычнымі сіламі, але й польскай грамадзкай думкай.

Зь іншага боку, Т.Гавіну закідалі празьмерную палітызацыю Саюзу палякаў. Канцэпцыя **Анжалікі Борыс**, настаўніцы па прафэсіі, акцэнтавала першапачатковую сутнасьць СПБ — грамадзка-культурную. На яе думку, Саюзу як грамадзкай арганізацыі трэба захоўваць «здаровую дыстанцыю» ад палітычных працэсаў.

Улады падтрымлівалі Т.Кручкоўскага. Аднак дэлегаты зьезду насуперак ціску падтрымалі кандыдатуру Анжалікі Борыс. Гэтак самая масавая арганізацыя ў Беларусі зрабіла стаўку на адраджэньне польскае культуры ў эўрапейскім, а не ў савецкім варыянце. Паказала, што бачыць Беларусь дэмакратычнай незалежнай краінай, а ня часткай «саюзу Беларусі й Расеі». За што й была неадкладна пакараная.

**Паводле: Пётра Рудкоўскі. «Аранжавая рэвалюцыя ўжо адбываецца», «НН» №19, 2005.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Беларускамоўнае навучаньне ў ЭГУ

Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт у выгнаньні (Вільня) абвясьціў прыём абітурыентаў на вочную форму навучаньня на 2005/2006 навучальны год (бакалярскія і магістарскія праграмы). Сярод гэтых праграм вылучаецца бакалярская праграма па гісторыі і культурнай антрапалёгіі (беларусістыка), выкладаньне на якой цалкам беларускамоўнае. У пэрспэктыве гэтая праграма мусіць стаць асновай факультэту гісторыі і культурнай антрапалёгіі. Па камэнтар наш карэспандэнт зьвярнуўся да Ігара Бабкова, які зьвязаны з гэтым праектам.

**— ЭГУ шмат хто закідае ігнараваньне беларускай мовы ў навучальным працэсе. І тут — цалкам беларускамоўнае навучаньне. З чым зьвязаны такі паварот?**

— Праблема «ЭГУ і мова» крыху штучная. Я пяць год выкладаў у ЭГУ па-беларуску на філязофскім факультэце, і колькасьць беларускамоўных студэнтаў была ня меншая, чым у БДУ. Праблема палягала хутчэй у акадэмічных курсах, адэкватных сучаснаму стану гуманістыкі.

**— У чым будзе заключацца спэцыфіка праграмы і хто будзе выкладаць?**

— Плянуюцца тры асноўныя дамінанты: беларуская гісторыя, вольная ад ідэалягічных міфаў (я спадзяюся, што куратарам будзе Генадзь Сагановіч), інтэлектуальная гісторыя і гісторыя ідэй (гэтым займуся я) і культурная антрапалёгія (куратар — вядомы беларускі навуковец, прозьвішча якога пакуль пакінем у сакрэце).

**— Якія ўмовы для студэнтаў?**

— Умовы можна знайсьці на www.ehu-international.org. Скажу толькі, што навучаньне бясплатнае. Да таго ж студэнтам даюцца месцы ў інтэрнаце.

**5 жніўня, у дзень закрыцьця ЭГУ, яго студэнты ладзяць Дзень зачыненых унівэрсытэтаў. Яны прапануюць усім неабыякавым узяць удзел у флэш-мобе. Трэба прыйсьці а 22-й на Кастрычніцкую плошчу, сесьці на зямлю і запаліць сьвечку. Праз дзесяць хвілінаў спакойна ўстаць і, пакінуўшы сьвечку, сыйсьці. Болей інфармацыі на сайце www.segun.info**

# Хто інтрыгуе на «Нямецкай хвалі»

**Працяг са старонкі 3.**

Як высьветлілася, за лістом ад ТБМ на «Хвалю» прыйшоў ліст ад А.Клімава, В.Фралова, М.Чыгіра і «некаторых іншых палітыкаў», дзе таксама выказвалася нязгода з пазыцыяй Таварыства па моўным пытаньні: маўляў, праграма на расейскай — гэта не непавага да беларускага народу і не дубляваньне моўнай палітыкі ўладаў.

Пазыцыя С.Калякіна, у прыватнасьці, наступная: «Інфармацыя мусіць паступаць на той мове, якая найлепш засвойваецца грамадзянамі», — а, паводле яго зьвестак, «75% насельніцтва ў нас думаюць, спажываюць інфармацыю і размаўляюць па-расейску, таму большая частка праграмы **мусіць** быць на расейскай мове». Пры гэтым (дзякуй, вялікі дзякуй!) Калякін не выключае, што праграма можа быць і на дзьвюх мовах.

Сп.Лябедзька мяркуе, што «агульны пасыл, што беларускай мовы трэба больш усюды і скрозь, — абсалютна правільны», але пры гэтым заклікае пазьбягаць «штурмаўшчыны і абавязалаўкі». Атрымліваецца супярэчнасьць: увогуле — так, а ў канкрэтным выпадку — ня будзем сьпяшацца.

Ня ведаю, як сп.Лябедзька, а я не зьбіраюся жыць вечна. Таму хачу пры сваім жыцьці чуць родную мову хоць ад «Нямецкай хвалі», хоць усё роўна ад каго. Цікава, чаму сп.Лябедзька, так выдатна разумеючы моўную сітуацыю, не зьвярнуўся да «Хвалі» з прапановай паспрыяць выхаду менавіта беларускамоўнай праграмы?

Пры самым канцы гутаркі было агучана наступнае: «Асноўная маса беларускамоўных — людзі сталага ўзросту, зь нізкай адукацыяй (!), якія жывуць у вёсках і малых гарадах». У якасьці аргумэнтаў былі (у каторы раз!) прыведзены вынікі апытаньня НІСЭПД: «Расейскамоўныя ў найбольшай ступені ў параўнаньні зь іншымі моўнымі групамі прыхільныя незалежнай Беларусі і ідэям эканамічнай свабоды». Так што вось вам, беларускамоўныя, ешце — жывіце ў сваіх вёсках, спажывайце пэнсію і плён нізкай адукаванасьці да чакайце, пакуль расейская рэдакцыя «Нямецкай хвалі» і расейскамоўныя палітыкі прынясуць вам незалежнасьць ды эканамічную свабоду.

На заканчэньне хочацца задаць паважанаму чытачу пытаньне: «Нічога не нагадвае?» Няхай чытач сам вырашыць, ці ёсьць падабенства ў выказваньнях спадароў Сакалова, Калякіна, Лябедзькі з ідэямі яшчэ аднаго вядомага палітыка: «…Мы ні ў якім разе ня хочам пакрыўдзіць людзей, якія даражаць самабытнай беларускай культурай, мовай і гісторыяй. Але ў шырокім сэнсе мы — адна нацыя» (У.Пуцін).

Рэдакцыя расейскай службы «Нямецкай хвалі» пакідае адрас для допісаў: 190000, Санкт-Петербург, Главпочтамт, а\я 596, «Немецкая волна». Дык напішам.

**Дзяніс Тушынскі**

### Ад Рэдакцыі

Вядома, што «некаторыя палітыкі» самі лісты пішуць рэдка. Ім іх звычайна падсоўваюць. «Валеры Дзьмітрыевіч, падпішэце, каб радыё ствары…».

ТБМ і беларускія асяродкі дыяспары вядуць кампанію за беларускую мову «Нямецкай хвалі» адкрыта, гэтыя ж кулюарысты хаваюцца за сьпінамі «некаторых палітыкаў». І пры гэтым расчароўваюць дэмакратычных актывістаў у беларускім палітыкуме як такім.

Найбольшае дасягненьне грамадзянскае супольнасьці ў апошнія гады — гэта еднасьць. Адзінства прынцыпаў, зь якога вынікае адзінства дзеяньняў ва ўсіх прынцыповых пытаньнях. Сярод якіх — дэмакратыя, незалежнасьць, а таксама адраджэньне мовы. На ўсе спрэчныя пытаньні — маратoрый аж да таго моманту, калі іх можна будзе дэмакратычна абмеркаваць. Не пад аўтарытарным прэсам.

Той, хто ставіць пад пытаньне прынцыпы еднасьці, у тым ліку адраджэньне мовы, правакуе раскол у незалежным грамадзтве. Ён не «культурную вайну» вядзе, як высакародна сабе наўяўляў, а робіць падкопы пад фундамэнт еднасьці, пад сьвятое. Тым самым сеецца паняверка ў людзях. Гэта для кагосьці мова — «форма заполнения эфира», а для большасьці актывістаў дэмакратычнага руху беларуская мова — часьцінка сэрца. Адрачэньне ад яе для іх непрымальнае.

Без сумневу, на «Нямецкую хвалю» прыйдзе нямала лістоў за беларускамоўнасьць праграмы. Калі б адэпты расейскамоўнай «Хвалі» зьвярнуліся да людзей з заклікам падтрымаць іх, ці хто адгукнуўся б — сьмешна сказаць — на іхны кліч? Таму кулюарысты й дзейнічаюць паддывановаа, што іншых спосабаў ня маюць.

Ад мовы «Нямецкай хвалі» мала што залежыць у «камэрцыйным» пляне. У любым разе гэтыя 15-хвілінныя перадачкі на кароткіх хвалях будуць слухаць нават ня тысячы, лічаныя сотні людзей. Значэньне праграмы перадусім сымбалічнае, і выбар мовы таксама сымбалічны — гэта праява бачаньня Беларусі расейскамоўнай краінай. Амэрыканскае, польскае, швэдзкае, ватыканскае радыё вяшчаюць па-беларуску. А нямецкае? Па ягоным вырашэньні можна будзе меркаваць аб доўгатэрміновых падыходах Нямеччыны да Беларусі. Вось чаму гэтае палітычнае пытаньне павінны былі б вырашыць не карэспандэнты **станцыі. Не кулюарысты, якія кіруюцца найперш асабістымі інтарэсамі. Што лянуюцца навучыцца беларускай мовы, але прагнуць працаваць на заходняй радыёстанцыі.**

**Рашэньне мусяць прыняць нямецкія палітыкі. Цікава, дарэчы, як на яго вырашэньне паўплывае вынік будучых выбараў у Германіі.**

## Летнік у Берасьці

БАМГА «Сузор'е» запрашае ўзяць удзел **7 жніўня** ў акцыі па добраўпарадкаваньні рэштак **кляштару бэрнардынак**, што знаходзіцца на Шпітальным востраве Берасьцейскай крэпасьці.

Рэшткі кляштару XVII ст. — адзіная пабудова, якая захавалася з часоў старажытнага Берасьця. Усе астатнія пабудовы былі зруйнаваныя, а новы горад пабудаваны на 4 км на ўсход.

БАМГА «Сузор'е» імкнецца зьвярнуць увагу гараджан, і ў першую чаргу моладзі на тое, што помнік гісторыі сярэднявечнага Берасьця застаецца занядбаным.

Даведкі праз тэл.: 8-0162-23-68-02; 8-029-791-25-61 (Сяржук), 8-029-641-20-98 (Уладзімер).

Збор удзельнікаў: 10:00 — офіс БАМГА «Сузор'е»; 11:30 — каля Холмскай брамы, з боку ракі (для тых, хто доўга сьпіць).



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Якую мінэралку піць?

Ці ведаеце вы, якую ваду лепей піць: багатую на натрый і кальцый ці нізкамінэралізаваную? З калодзежу ці з бутэлькі?

За першую палову 2005 г. сярэдні беларус выпіў аж восем літраў мінэральнай вады. Прычым усё больш людзей асьцерагаюцца вады з крану. Праўда, зь сёньняшнімі тэхналёгіямі можна з самай паскуднай жыжкі зрабіць чыстую, бясшкодную для здароўя ваду, але толку, калі ў выніку яна акажацца чышчанай-перачышчанай хімікатамі, хляраванай і пазбаўленай каштоўных мінэральных рэчываў? А ў вялікіх гарадах будзе яшчэ і агідная на смак.

Лепш карыстацца бутляванай вадой. Яе не ачышчаюць хімічна (толькі абезжалезьваньне і насычэньне двухвокісам вугляроду). Дзякуючы гэтаму ў ёй захоўваюцца газы, іёны, мінэральныя і арганічныя злучэньні. Вартасьць і склад вады вызначаюцца, сярод іншага, працягласьцю шляху, які яна праходзіць пад зямлёй, глыбінёй, на якой выступае, тэмпэратурай і ціскам у пласьце. Найлепшай зьяўляецца вада, якая паходзіць зь вядомых крыніц са шматгадовымі традыцыямі. Выдатная якасьць у вады з крыніцаў, якія самі выцякаюць зь зямлі — як, напрыклад, «Баржомі».

Якая ж розьніца паміж вадой алігацэнавага пэрыяду з бутэлькі і зь вясковага калодзежу? Вытворца бутляванай вады абавязаны падаць яе склад на этыкетцы, якасьць такой вады лепш кантралюецца і яна мае даўжэйшы тэрмін захоўваньня — 12 месяцаў, у той час як ваду з студні неабходна выпіць на працягу 48 гадзін.

### Лепей бяз газу

Беларусы ўжываюць пераважна газаваную ваду, хоць у Эўропе 80% спажыванай вады складае негазаваная. Вячаслаў Бядулін, доктар мэдычнага цэнтру «Антэс», пацьвярджае: «Лепей піць ваду бяз газу: газ раздражняе тканкі страўніка і ўзбуджае нэрвовыя канчаткі на яго сьценках, што павялічвае смагу. У астатнім кожны можа выбіраць ваду, якая яму больш даспадобы. Аднак усё адно трэба быць уважлівым. Калі на бутэльцы напісана «крынічная вада», гэта не азначае, што яна прыдатная для ўсіх: у ёй могуць быць солі цяжкіх мэталаў, што непрымальна для хворых на язву дванаццаціпёрснай кішкі. Людзям з захворваньнямі лепш за ўсё зьвярнуцца па параду да гастраэнтэроляга. У нас у цэнтры стаіць «Жодзінская» мінэралка. Сам я апошнім часам аддаю перавагу «Вяйнянскай крыніцы».

### Вады можа быць замнога

Пры павышаным ціску, хваробах нырак ці праблемах з кровазваротам ня варта піць ваду з завялікім утрыманьнем натрыю, паколькі ён выклікае рост крывянога ціску і назапашваньне вады ў арганізьме.

Вада з залішнім утрыманьнем ёду не падыходзіць людзям з павялічанай шчытападобнай залозай. Хоць, як было сказана, больш карысная для здароўя вада бяз бурбалак, газіроўку варта піць пасьля фізычнага напружаньня, бо яна, сярод іншага, павялічвае выдзяленьне мачы, зь якой выводзяцца таксіны. Піць варта часта малымі порцыямі (100—150 мл), бо тады вада добра засвойваецца, а не «працякае» праз арганізм.

Пры спакойным ладзе жыцьця і добрым здароўі лепш за ўсё піць ваду нізка ці сярэднемінэралізаваную. Іншым разам, асабліва падчас сьпёкі, стрэсу ці напружанай працы, можна зьвярнуцца да высокамінэралізаванай вады, якая рэкамэндуецца таксама спартоўцам.

Пры лячэньні хвароб сэрца, стрававальнай і дыхальнай сыстэмы, нырак і мочавыводных шляхоў, прафіляктыцы карыёзу зубоў і нават паўнаце карысныні будуць лячэбныя гатункі вады. Іх можна купіць у некаторых аптэках і крамах.

### Мінэралы ў бутэльцы

Калі мы стаім у краме перад стэляжом з бутэлькамі вады, мы звычайна кладзём у кошык любую, якая трапіцца пад руку. І нават не падумаем прачытаць на этыкетцы яе мінэральны склад. А вада вадзе ня роўная.

**Вось як узьдзейнічаюць на арганізм розныя хімічныя элемэнты.**

**Бром** — робіць заспакаяльнае ўзьдзеяньне і паляпшае сон.

**Ёд** — неабходны для выпрацоўкі гармону шчытападобнай залозы.

**Жалеза** — уваходзіць у склад гемаглябіну, неабходнае для транспартаваньня і назапашваньня кіслароду.

**Калій** — рэгулюе водны балянс, паніжае крывяны ціск, стымулюе работу цягліцаў і нэрваў, падтрымлівае належную вільготнасьць скуры.

**Кальцый** — бярэ ўдзел у працэсе згусаньня крыві, паніжае ўзровень халестэрыну, уваходзіць у склад зубоў і костак, папаўняе ўтрыманьне мінэралаў у клетках скуры, робіць на скуру проціалергеннае ўзьдзеяньне, суцішае раздражненьні.

**Магній** — каталізатар многіх фэрмэнтаў, спрыяе правільнай рабоце сэрца, цяглічай і нэрвовай сыстэмы, абараняе скуру.

**Натрый** — рэгулюе водны балянс, паляпшае кровазабесьпячэньне скуры.

**Стронцый** — павялічвае супраціўляльнасьць хваробам кровазвароту.

**Сэлен** — procідзейнічае хваробам печані, запавольвае працэс старэньня, засьцерагае ад ракавых пухлін, паляпшае кровазварот, паніжае ўзровень халестэрыну, аблягчае працяканьне мэнапаўзы.

**Фосфар** — уваходзіць у склад костак, зубоў, аблягчае зрошчваньне пераломаў.

**АШ**

# Мікрахвалевая зброя

Амэрыканцы плянуюць даставіць у Ірак экспэрымэнтальную бяскроўную зброю для ўтаймаваньня беспарадкаў. Матарызаваныя мікрахвалямёты робяць на людзей такое ж узьдзеяньне, як кухонная ЗВЧ–печ на кураня, што запякаецца ў ёй. Намер абудзіў спрэчкі, піша **«Газэта выборча»**.

Мікрахвалевая зброя — гэта адна зь некалькіх разнавіднасьцяў зброі новага пакаленьня, на мэце якой нэўтралізаваць праціўніка, не наносячы яму трывалай шкоды. Такія ваенныя тэхналёгіі маглі б прымяняцца, сярод іншага, у сутыкненьнях з агрэсіўным натоўпам, калі вадамёты ці гумовыя кулі аказваюцца недастаткова эфэктыўнымі, а ўжываньне паўнацэннай зброі непажаданае з гуманістычнага пункту гледжаньня.

Работы над распрацоўкай мікрахвалямётаў (так званай «сыстэмы актыўнага адпору» — «Active Denial System», ADS) вядуцца ў ЗША шмат гадоў і якраз падыходзяць да заканчэньня. Паводле зьвестак інтэрнэт-сэрвісу «Globalsecurity.org», на гэтыя работы было патрачана пад 40 млн даляраў. Ужо апублікаваны вынікі двухгадовых экспэрымэнтаў, што праводзіліся на базе паветраных сіл у штаце Нью-Мэксыка. Зброя выпраменьвае пучкі ЗВЧ-хваляў частатой 95 гігагэрц. Нават на адлегласьці ў некалькі сотняў мэтраў такое выпраменьваньне ўзбуджае ваганьні малекул вады пад скурай чалавека, што прыводзіць да ўтварэньня цяпла. Апошнія досьледы на людзях паказалі, што асобы, на якіх трапіў пучок, ужо праз дзьве сэкунды адчуваюць пякучы боль. Менш чым праз пяць сэкундаў боль становіцца немагчыма трываць, і атакаваны зробіць усё, каб уцячы з поля паражэньня. Пасьля гэтага боль праходзіць бязь сьледу і якіх-небудзь пашкоджаньняў.

Распачаць вытворчасьць мікрахвалямётаў, змантаваных на вайсковым цягачу «Хамвэй», ужо гатовы амэрыканскі ВПК. Як напісаў некалькі тыдняў таму брытанскі навуковы штотыднёвік «Нью саэнтыст», пляны Міністэрства абароны ЗША прадугледжваюць, што ў наступным годзе баявыя машыны зь мікрахвалямётамі (пад назвай «Шэрыф») трапяць у Ірак. Вайскоўцы лічаць, што дзякуючы новай зброі амэрыканская армія і ірацкія сілы бясьпекі здолеюць больш пасьпяхова, чым сёньня, — і бяскроўна — заміраць беспарадкі. Працягваюцца таксама работы над разнавіднасьцю зброі, прызначанай для ўжываньня з паветра.

Некаторыя вучоныя выказваюць, аднак, сумненьні. Яны лічаць, што зброя пакуль недастаткова праверaная, каб ужываць яе супраць людзей. Яны зьвяртаюць увагу, сярод іншага, на тое, што на палігоне добраахвотнікам, якія выконвалі ролю дэманстрантаў, забаранялася насіць акуляры, кантактныя лінзы і нават мець мэталічныя гузікі ды засьцежкі «маланка». Усё гэта для таго, каб прадухіліць пагрозу траўмаў.

Цытаваны ў «Нью саэнтыст» Нэйл Дэвідсан, спэцыяліст па бяскроўнай зброі з Брэдфардзкага ўнівэрсытэту (Брытанія), лічыць, што ў рэальных сытуацыях вельмі цяжка будзе кантраляваць, якую дозу ЗВЧ-хваляў атрымае кожны чалавек. А перавышэньне мяжы бясьпекі можа хутка прынесьці фатальныя вынікі. Падчас экспэрымэнтаў адзін з добраахвотнікаў атрымаў апёк, калі прыстасаваньне выпадкова выдала занадта вялікую магутнасьць. «Што будзе з чалавекам, які зь нейкіх прычын ня здолее хутка ўцячы і надоўга застанецца ў зоне дзеяньня мікрахваляў?» — пытае Дэвідсан.

# Шакаляд

Два самастойныя прадукты — шакаляд у розных яго формах (кандытарскі выраб і гарачы напой) ды напой какава — паходзяць ад адной і той жа субстанцыі — какава-бабоў, г.зн. зерняў вечназялёнага трапічнага дрэва какавы, якое яшчэ называюць шакалядным дрэвам (Theobroma cacao). Гэтая расьліна зь вялікім бліскучым лісьцем дасягае 5—8 мэтраў у вышыню. Яе плод — ягада яркага колеру, што ўтрымлівае ад 25 да 60 міндалепадобных зярнят. Хоць ягадай яна называецца з гледзішча біялягічнай марфалёгіі. Піша **Алег Дзярновіч.**



WWW.CORBIS.COM

## Рэцэпт натуральнага шакаляду ад Ганны Цюндзявіцкай

**Галоўнай умовай атрыманьня добрага шакаляду зьяўляецца сьвежая какава. Яе трэба праверыць: раструшчыць зярняты і паглядзець, ці не гнілыя. Потым падпражыць іх у печы для разавага ўжытку ў невялікай колькасьці, як каву. Калі пачнуць трэскацца, рассыпаць па сталe так, каб яны адны ад другіх не напаляліся, бо перапаленая какава непрыгодная для ежы. Таксама нядобра, калі зярняты недапражаныя, бо гэта пашкодзіць шакаляду. Лупіны зь іх трэба зьняць вельмі старанна, а затым змалоць на кававым млынку ў дробны парашок. Паўтара фунта яго моцна і доўга патаўчы ў ступцы, абавязкова жалезнай і вельмі гарачай. Для гэтага ступку належыць часта ставіць на гарачае вугольле, аднак нельга яе распальваць яе так, каб какава падгарэла, бо тады ўсё можна сапсаваць. Калі ў масе ня будзе ніякіх драбкоў і яна зробіцца накшталт мукі, а ўся вільгаць выпарыцца, неабходна ўсыпаць паўтара фунта прасеянага цукру і працягваць увесь час таўчы. Пад самы канец варта дадаць паўлота [каля 6 г] ванілі, растоўчанай зь невялікай колькасьцю цукру, хто хоча — па паўлота кардамону і цынамону. Нарэшце шакаляд выкладаюць у бляшаныя формы ў выглядзе шакалядных плітак з больш шырокімі краямі зьверху, чым зьнізу. Формы трасуць ва ўсе бакі: маса мусіць роўна легчы па ўсёй паверхні. Трымаюць на холадзе, пакуль яна не застыне. Пасьля пліткі дастаюць з формаў, раскладваюць па адной для больш надзейнага высыханьня, пераварочваюць на абодва бакі, а потым укручваюць у паперу.**

### Моўныя рэканструкцыі

Гісторыю шакаляду рэканструявалі праз расшыфроўку старажытных моваў карэнных жыхароў Амэрыкі. За 1500 гадоў да н.э. у нізінах на беразе Мэксыканскай затокі ўзьнікла цывілізацыя альмэкаў. Падчас росквіту цывілізацыі, 3000 год таму, і прагучала ўпершыню гэтае слова — «kakawa». На зьмену альмэкам прыйшлі майя, якія стварылі першыя вядомыя нам плянтацыі какавы. Затым кантроль над Цэнтральнай Амэрыкай усталявалі ацтэкі, пакуль у 1521 г. іх імпэрыю не разбурылі гішпанцы. У ацтэкаў какава-бабы выконвалі функцыю грошай, і раба можна было набыць за 100 какава-бабоў.

Менавіта ў ацтэкаў гішпанцы запазычылі какаву, таму доўга лічылі, што першым культываваць шакалядное дрэва пачаў гэты народ. Майя шакалядны напой называлі «xocolatl» паводле найменьня правінцыі, зь якой пастаўляліся бабы какавы, — Xoconochco. У мове мэксыканскіх індзейцаў слова «шакаляд» паходзіць ад камбінацыі словаў «choco» («пена») і «atl» («вада»), сьведчаньне таго, што раньні шакаляд быў вядомы толькі як напой.

### Гішпанскі сьлед

У Эўропу шакаляд трапіў з Мэксыкі каля 1520 г. Новы прадукт прывезьлі ў выглядзе пласьцін і галоў. Шакаляд распаўсюджваўся праз тэрыторыі гішпанскага ўплыву — у Гішпанскіх Нідэрляндах дзякуючы кантрабандыстам ён зьявіўся раней, чым у Францыі. Толькі ў 1657 г. праз Францыю шакаляд трапіў у Англію, дзе ў XVIII ст. узьніклі Chocolate Houses. Але ня будзем перабольшваць посьпеху шакаляду. Урэшце, адзінай краінай, дзе шакаляд меў абсалютнае прызнаньне, заставалася Гішпанія. Кожны замежнік насьміхаўся з уцехі мадрыдцаў — густога шакаляду, араматызаванага цынамонам.

У Рэчы Паспалітай шакаляд зьявіўся на пачатку XVIII ст. І першапачаткова гэты гарачы напой ужываўся як лекі — ад рыматусу, боляў у горле, бяссоньніцы, аслабленьня патэнцыі, дызэнтэрыі і нават халеры. У апошнім выпадку, хутчэй за ўсё, гаворка ідзе пра агульнае ўзмацненьне аслабленага хваробаю арганізму. Але паступова гарачы шакаляд стаў напоем вышэйшых станаў — магнатэрыі, багатай шляхты, гарадзкога патрыцыяту. Апроч таго, пашырылася звычка піць шакаляд у ложку, перад канчатковым уставаньнем. Сапраўдны ж посьпех напой атрымаў сярод сьвятароў, бо быў прыдатны для спажываньня ў часы пастоў.

### Напой езуітаў

На нейкім этапе гарачы шакаляд стаў карпаратыўным напоем езуітаў. Паспрыяў гэтаму вобраз жыцьця чальцоў ордэну — манахі мусілі не ізалявацца ў кляштарах, а актыўна ўдзельнічаць у грамадзкім ды сьвецкім жыцьці. Гарачы шакаляд надзвычай надаўся для прыцягненьня ўвагі публікі ды сталых кантактаў.

Мяркуецца, што менавіта ён дапамог езуітам захавацца ў Беларусі, пасьля таго як у 1773 г. дзейнасьць ордэну была забаронена ва ўсім сьвеце. Падчас візыту ў Полацак у 1797 г. Павал І меў працяглыя размовы з найвыдатнейшым езуітам таго часу Габрыелем Грубэрам, які, каб захаваць прыналежнасьць да ордэну, эміграваў ва Ўсходнюю Беларусь. Грубэр і пачаставаў імпэратара гарачым шакалядам, прыгатаваным паводле езуіцкіх рэцэптаў. Напой зрабіў уражаньне, бо ў Пецярбургу ніхто ня мог яму прапанаваць яго зноў. Тых уражаньняў было для цара дастаткова, каб лагодна ставіцца да дзейнасьці гнаных у Эўропе езуітаў, тым больш што такім квазіпразаходнім крокам можна было насаліць Захаду.

Незадоўга перад гэтымі падзеямі слынны батанік Карл Лінэй даў навуковую лацінскую назву шакалядному дрэву — Theobroma cacao, што азначае «ежа багоў». Галоўны біяхімічны элемэнт-стымулятар шакаляду атрымаў, адпаведна, назву тэабрамін.

### Дарагоўля шакаляду

Шакаляд цаніўся таксама ў плітках. У Беларусі XVIII ст. у продажы былі тры асноўныя гатункі плітак шакаляду — звычайны, венскі і найвышэйшы. Але ўсе яны былі вельмі дарагія — фунт шакаляду, у залежнасьці ад якасьці, каштаваў столькі ж, колькі 12—20 л добрай гарэлкі.

Бальшыня грамадзтва не магла сабе дазволіць купляць шакаляд. І ўжо тады пачалі вырабляцца замяньнікі шакаляду, у тым ліку т.зв. шакаляд гаспадарскі з пшанічнай мукі, малака, цынамону, цукру ды жаўтка. І нават ў сярэдзіне XIX ст. Ганна Цюндзявіцкая, аўтарка «Літоўскай гаспадыні», пачынала апісаньне рэцэптаў гатаваньня шакаляду з важнай для тагачаснага чытача фразы: «Хто сам умее яго прыгатаваць, для таго ён ня будзе дарагім напоем». Цюндзявіцкая бачыць адзін з галоўных сакрэтаў якаснага шакаляду ў добрым памоле. «Кепска здробненая какава дасьць шакаляд з камячкамі і нізкага гатунку. Добры шакаляд павінен быць цёмна-чырвоным, гладкім на зломе, бліскучым і раставаць у роце».

Крыху пазьней швайцарац Даніэль Пэтэр у 1879 г., пасьля васьмі гадоў экспэрымэнтаў, упершыню выпусьціў на рынак цьвёрды малочны шакаляд. Такім крокам гаму смакаў удалося пашырыць. Таксама ў XIX ст. шакаляд пачалі актыўна выкарыстоўваць у кандытарскай справе. Не недахоп, але спэцыфіка шакаляду — яго вельмі моцны, «скіраваны» смак, што адразу «падпарадкоўвае» сабе любы выраб, у які шакаляд дадаецца. Таму варта пазьбягаць укарашэньня шакаляду ў дэсэрты на фруктова-ягаднай аснове.

### Какава як пабочны прадукт

Какава як асобны напой зьявілася толькі ў 1828 г. Галяндзец Конрад ван Хоўтэн запатэнтаваў гідраўлічны прэс, пры дапамозе якога з какава-бабоў можна было здабываць алей. Фундамэнтальная розьніца паміж шакалядам ды какаваю заключаецца ў прынцыпах першапачатковай апрацоўкі. Спачатку ў абодвух выпадках зярняты какавы высушваюць і здрабняюць. Атрымліваюць паўфабрыкатную масу —так званую мязгу. Але дзеля вырабу парашку какавы з гэтай мязгі выціскаюць яшчэ вельмі каштоўную субстанцыю — какава-алей, багаты на біялягічна актыўныя рэчывы. Застаецца дадаць эмульгатар дзеля лепшага растварэньня парашку ў вадзе ці малацэ — і з пазасталай масы можна гатаваць напой. Такім чынам, мы бачым, што напой какава ў параўнаньні з шакалядам значна бяднейшы па сваім біяхімічным складзе. Можна нават сьцвярджаць, што напой какава ўзьнік як пабочны прадукт здабыцьця какава-алею.

Вось гэтая другаснасьць і таннасьць какавы ў параўнаньні з шакалядам, а таксама тое, што ўсё ж яна ўтрымлівае актыўны алькалёід тэабрамін, паспрыялі пашырэньню какавы ў казённых установах Савецкага Саюзу — у дзіцячых садках, школах, сталоўках на прадпрыемствах.

Усё ж ня толькі ў СССР адбыліся сур'ёзныя трансфармацыі. Калі і сёньня ў польскай кавярні вы замовіце «czekolady», то вам прынясуць звыклую какаву. Упершыню маю ўвагу на гэтую акалічнасьць зьвярнулі мае літоўскія сябры. Віленская традыцыя гарачага шакаляду ніколі не перапынялася. Больш за тое, гарачы шакаляд у адмысловых кавярнях падавалі яшчэ ў 1970—1980-х гадах нават у Менску.

З тэрмінам «какава» зьвязана яшчэ адна беларуская прыгода. У 1980-х на просьбу прыгатаваць каву вам маглі прынесьці каву. Сугучнасьць слоў і неабазнанасьць у беларускай мове спрыялі гэтаму, а руплівыя мовазнаўцы пасьпелі занесьці слова «кофе» ў слоўнік беларускае мовы.

### Прадукт шчасьця

У XX ст. Беларусь стала буйным вытворцам цьвёрдага шакаляду. У 1924 г. у Гомелі была заснавана кандытарская фабрыка «Спартак». Сымболіка відавочная — правадыр паўстаньня імкнуўся завяваць свабоду рабам, а новая ўлада дае салодкае і шчасьлівае жыцьцё сваім грамадзянам. Яна дае ім шакаляд! З гісторыі паўстанца Спартака і сёньня распачынаецца афіцыйны інтэрнэтсайт прадпрыемства. Адкрыццё ў 1931 г. менскай фабрыкі «Камунарка» мусіла замацаваць гэты сымбалічны шэраг шчасьця як усеагульнага здабытку.

Але ў Беларусі выпрацоўваецца даволі абмежаваны асартымэнт шакаляду. Большая частка беларускага прадукту — гэта цьвёрды малочны шакаляд, менш карысны, чым горкі. Горкія гатункі шакаляду зьмяшчаюць менш тлушчу, але больш мінэралаў ды мікраэлемэнтаў, патрэбных для правільнага абмену рэчываў ды ўмацаваньня тканак. Апошнія дасьледаваньні паказваюць, што шакаляд утрымлівае багата антыаксыдантаў, гэта значыць рэчываў, якія перашкаджаюць працэсам акісьленьня ў нашым арганізьме. А акісьленьне клетак пад узьдзеяньньнем кісьлароду — гэта і ёсьць працэс старэньня чалавека.

Зноў жа, любы карысны прадукт можна пераўтварыць у яго антыпод. Шакаляд зьяўляецца ўсё ж вельмі калярыйным прадуктам, асабліва яго малочныя гатункі з высокім утрыманьнем цукру. Таму спажываньне шакаляду павінна адбывацца ў досыць абмежаванай колькасьці. Тое самае можна сказаць і іншымі словамі — рэгулярнае спажываньне шакляду ў малой колькасьці будзе безумоўна карысным для арганізму. Тым больш што праз гэта мы далучаемся да глыбокай культурнай традыцыі, якой больш за 3000 гадоў.

# Баляды году



ВІКТАР ШНІП

### Баляда студзеня

Студзень бязь сьнегу як луг без травы.
Сёньня Каляды. Ідзём да царквы.
Хто памаліцца, а хто — памаўчаць,
Хто нарадзіцца, а хто — паміраць.
Чорна навокал, нібыта пажар
Тут уздымаўся, як лес, аж да хмар,
Дзе адзінокая зорка цяплела
Сьветлая, быццам Хрыстовае цела,
Што не астудзяць ніколі вятры.
Сёньня ты юны, а заўтра — стары
Будзеш спакойна ісьці да царквы,
Быццам бы сьнег, што нядаўна ляцеў
Лісьцем бялюткім з анёлавых дрэў
У цішыню пажаўцелай травы,
Каб там, зьнікаючы, студзень любіць
Столькі, пакуль сьнег зь нябёсаў ляціць...

### Баляда лютага

Пытаецца люты: «Ці добра абуты?» —
І ветрам сьцюдзёным зьдзірае сьнягі
З дарогі, як скуру з вужакі заснутай,
Якой сьветла сьняцца людзкія грахі.
І ты зноў баісься далёка ад хаты
Ісьці праз завейную белую ноч,
Бо ў небе за хмараю нехта рагаты
Зь зямлі не адводзіць задымленых воч,
Дзе з комінаў дым, адлятаючы ў неба,
Віецца над вёскай кудзеляй зь цяпла,
Дзе тонкія нітачкі зімняга срэбра
Уткаліся й сьветла лятуць да сьвятла
Задумлівых зорак, што больш ад марозу
Ня могуць ужо размаўляць між сабой...

### Баляда сакавіка

...І трэснуў лёд, як неба, пад нагамі,
І хлынула вада, нібыта з горла кроў,
І папаўзла, нібы зьмяя, за намі
І, бы ў каўчэгі, мы да берагоў
Пабеглі напалохана і дзіка,
Нібы ваўкі, што першы раз агонь
Убачылі, як сьмерць сваю, вялікі
І ўміг забыліся пра весьні гон,
Бо трэснуў лёд, як вечнасьць, пад нагамі
І хлынула жыцьцё, нібы вада,
Халоднае, дзе мы павінны самі
Уцяміць, што ёсьць радасьць, што бяда.
І, як па лёдзе, мы бяжым па сьвеце,
Ня знаючы, што нас чакае там
За даллю белай, дзе вясна і вецер,
І чорны лес, і белы-белы Храм...

### Баляда красавіка

Вярнуліся птушкі з далёкіх краін
І толькі дамоў не прыйшоў ты адзін,
Бо дому няма — яго змыла вадой,
Самотна-вясновай, нібыта сьлязой.
І бачылі людзі, як дом твой сплываў
У сьвет, як каўчэг, паміж дрэў, нібы траў,
Высокіх і чорных, як цень ад бяды,
І крыгі плылі, як Харону лісты...
І людзі глядзелі на мора-ваду,
І кожны маліўся — палохаў бяду,
І сонца ўзыходзіла па-над зямлёй
Вялікай і сьветлай малітвай людзкой.
І там, дзе твой дом адзінока стаяў,
Успыхнулі кветкі сярод жоўтых траў,
Нібыта вугольле забытых кастроў,
Нібыта самота пражытых гадоў...

### Баляда траўня

Трава, як агонь, прарастае праз тло
І, нібы віно маладое, сьвятло
Душу тваю хмеліць да крыку, да сьлёз.
А неба самотнае, нібы Хрыстос,
Глядзіць на траву, што нібыта цьвікі,
Старое лісьцё прабівае наскрозь
І выюць вятры — маладыя ваўкі,
Што кроў тут адчулі — на травах расу,
Якую з травы твае ногі страсуць,
Калі ты зноў выйдзеш на луг, як у сьвет
Трава, што агнём прарастае праз тло,
Каб тло зноў згубілася ў новай траве
І кветкамі, нібы агнём, зацьвіло...

### Баляда чэрвеня

Пачынаецца лета, нібы адзінота
Зноў спрабуе спакойна напомніць табе,
Што цяпер ад жыцьця не схавацца за плотам,
Бо схавацца — нібыта ўтапіцца ў журбе
Па мінулым, якое травой зарастае.
І нічога назад не вярнуць, што было.
І ў твой сад залятае пчала залатая
І зьбірае густое на кветках цяпло.



«КАСТРЫЧНІК»

І глядзіш ты на кветкі, і ўжо адчуваеш,
Што ўжо хутка і чэрвень, як дзень, праміне,
І ў гаі салавей, бы памрэ, адсьпявае,
І, як сьпелая вішня ў блакітным віне,
Сонца ў небе сплыве ў небакрай за лясамі,
І ты будзеш спакойна свой сьвет абжываць,
Што абмыецца заўтра дажджом, як сьлязамі,
І ня будзе калі па былым сумаваць...

### Баляда ліпеня

Купальскія вянкі плывуць па рэчцы,
А кветку-папараць ты не знайшла.
І хоць гаворыць: «Час усё залечыць...» —
Табе адной, бы ўзімку да жытла,
Вяртацца неахвота ў адзіноту
Прыгожую, як з чорных сьліў віно
У крышталёвай ружы, што як зь лёду,
Якую кінуць хочацца даўно
Аб сьценку, за якой сьвятло і воля
І дзе купальскія вянкі плывуць
У сьвет, каб не зьявіцца ўжо ніколі
У гэтым краі, дзе даўно жывуць
Самотныя, прыгожыя дзяўчаты,
Што кветку-папараць шукаць ізноў
Наступным летам выбегуць крылата
І, не знайшоўшы, вернуцца дамоў...

### Баляда жніўня

Пасьпелы яблык падае на дол,
Нібыта кропля сонечнага лета.
Сьвятла на кроплю менее наўкол.
Як сьпелы яблык, як сьляза паэта
У бездань часу, дзе няма сьвятла,
У бездань часу, дзе ня будзе ночы
Ляціць сьвятло, а ноч ужо была...
І неба сумнае, як нашы вочы,



«ЛІСТАПАД»

Бо лета адыходзіць назаўжды,
Як жоўтая лістота, адлятае
Праз туманы, празь вецер, праз дажджы,
Праз поле, дзе салома залатая,
Дзе ў восень ты ідзеш, як у агонь,
Што дзесьці за гарой, нібы за сьветам,
Дзе п'е ваду з ракі чырвоны конь
І сонца плавіцца ў вадзе, як лета...

### Баляда верасьня

Верасамі пахне раніцою вецер.
Сьцежкі ўсе грыбныя засталіся ў леце,
Як у памяці тваёй сьвятлынь-дарога
У бацькоўскі дом, дзе ўжо няма нікога,
Дзе каля акна чырвоная каліна
Сьветлая, нібы цяпер твая Айчына,
Дзе спакусна пахне вецер верасамі,
Дзе ў нябёсы сумнымі, як сьвет, вачамі
Ты глядзіш і бачыш — птушкі, як былое,
Пралятаюць, павуціньне залатое
Абрываючы, што сонца перад намі
Распусьціла, каб знайшлі мы самі
Сьцежкі і дарожкі да сваёй Айчыны,
Дзе заўсёды сьветла й горка ад каліны...
Ты ідзеш праз поле, за табою вецер,
І здаецца, анікога ў цэлым сьвеце
Больш няма...

### Баляда кастрычніка

Ты ідзеш праз поле, за табою вецер,
А ў нябёсах хмары, сонца сонна сьвеціць,
Быццам дагарае, быццам памірае,
І ў траве зжаўцелай вечар прарастае
З кропель дажджавых, нібы з апалых зорак.
Нібы векавы курган, далёкі ўзгорак
Прад табой віднеецца, плыве ў тумане,
І глядзіш праз хвілю — ён як дзень растане.
І дамоў ты прыйдзеш, і сустрэне ціша,
І Хрыстос табе ўсьміхнецца з крыжа...

### Баляда лістапада

На могілкі ідзеш нясьпешна да дзядоў,
Нібы з парэзанае вены выцякае кроў,
І вечнасьць, як самота восеньская сьцежкі,
Спакойна напаўняе выстылыя вены,
І дрэвы чорныя, нібыта галавешкі,
І помнікі, нібы разбураныя сьцены,
Перад табой, дзе ты ні разу шчэ ня быў,
Нібы ў жыцьці не сумаваў і не любіў
Ніколі ты пад гэтым небам, што як тло,
Дзе зоркі, нібы ў попеле начным вугольле,
Якое асьвятляе тое, што было
І ў гэтым сьвеце не паўторыцца ніколі,
Як гэта восеньская сцежка да дзядоў,
Дзе лісьце як агонь,
Дзе лісьце нібы кроў...

### Баляда сьнежня

Як сусьветны патоп, зь ветрам сьнег.
Як сусьветны пажар, лістабой
У сьнягах патанае з журбой
І ўсплывае над сьнегам, як сьмех
Над самотай, якая была
У лістоце, якой не ўзьляцець,
Бо ў лістоце замерзлая медзь
Да сьсівелай травы прырасла,
Па якой дабірацца дамоў
Праз завею, нібы праз патоп,
Дзе над гурбамі поўня, як сноп
Залаты, усплывае ізноў
З-за лясоў, як зь мінулых гадоў,
Што на гэтай нам роднай зямлі
Са сьнягамі вясной адплылі
У бязьмежжа й бяздоньне вякоў,
Над якім завеі шумяць,
Бы анёлы і д'ябалы ляцяць...

*8.01.2005 — 31.01.2005*

*Гравюры Аляксандра Тарасэвіча. Глуск, 1762 год.*

# Таемнае жыцьцё Жуля Вэрна

У арыгінале капітан Нэма быў каліноўцам, які помсьціў расейцам за сьмерць сям'і і задушэньне вызвольнага паўстаньня 1863—1864 гадоў. Аднак выдавец Этцэль быў супраць: так вымагала палітычная каньюнктура. Францыя больш сябравала з Расеяй, чым з Брытаніяй. Невядомыя старонкі біяграфіі вядомага пісьменьніка.

Французы гучна адзначаюць стагодзьдзе сьмерці Жуля Вэрна — пісьменьніка, чые кнігі ведаюць усе, але пра саму асобу вядома няшмат. Нават у найноўшыя часы здараюцца сэнсацыйныя адкрыцьці, такія, як знаходжаньне рукапісу раману «Парыж у XX стагодзьдзі». Кім жа быў стваральнік Філеаса Фога, капітана Нэма, інжынэра Сайраса Сьміта і дзяцей капітана Гранта?

За часамі СССР адзінай дазволенай біяграфіяй пісьменьніка была праца навукоўца Кірылы Андрэева «Трайное жыцьцё Жуля Вэрна», у якой клясык навуковай фантастыкі паказваўся як адданы прыхільнік сацыяльнага прагрэсу, амаль сацыяліст (галоўным сьведчаньнем — сяброўства зь некалькімі ўльтра-левымі). Але рэальны Вэрн ставіўся да дэмакратыі ў лепшым выпадку абыякава і значную частку жыцьця падтрымліваў розныя манархічныя ці аўтарытарныя тэндэнцыі. Але самае галоўнае — усё жыцьцё быў антысэмітам.



WWW.JULES-VERNE-CLUB.DE

Знаходжаньне ў 1989 г. рукапісу раману «Парыж у XX стагодзьдзі», у сваю чаргу, пахіснула стэрэатыпнае ўспрыманьне Вэрна як энтузіяста тэхнічнага прагрэсу. Агульнапрынятым быў погляд, згодна зь якім толькі пад канец літаратурнай дзейнасьці Вэрн пачаў сумнявацца ў тым, што гэты прагрэс прынясе добры плён. Выявілася, што на досыць раньнім этапе творчасьці, адразу пасьля заканчэньня пераломнага раману «Пяць тыдняў на паветраным шары», Вэрн напісаў змрочную антыўтопію пра Парыж 1960 году, у якім усеўдасканая тэхніка забіла культуру і здольнасьць да перажываньня пачуцьцяў.

## Тагачасныя каштоўнасьці французаў

Парадоксаў не зразумець, калі ня ведаць часоў, у якія жыў Вэрн. Сымбалем эпохі зьяўляецца Эйфэлева вежа — праява інжынэрскай дзёрзкасьці, помнік, узьведзены сталі, пары і электрычнасьці. Сам канструктар Гюстаў Эйфэль на ўрачыстым адкрыцьці ў сакавіку 1889 г. не прысутнічаў — ён ужо месяц як сядзеў у турме. Эйфэля вінавацілі ва ўдзеле ў афэры Таварыства будаўніцтва Панамскага каналу — жульніцкай біржавой кампаніі, якая замест таго, каб будаваць канал, плаціла журналістам, паслам і міністрам, каб тыя сьведчылі аўтарытэтам, нібыта будаўніцтва сапраўды вядзецца.

У афэры былі замяшаны інжынэры — апроч Эйфэля, за кратамі апынуўся таксама Фэрдынан Лесэпс, праекціроўшчык Суэцкага каналу. Высьветлілася, што хабар бралі члены сям'і прэзыдэнта Жуля Грэві; выдатныя публіцысты і маральныя аўтарытэты, як будучы прэм'ер-міністар Жорж Клемансо ці тагачасны старшыня парляманту Шарль Фляке.

Афэра яскрава прадэманстравала квінтэсэнцыю каштоўнасьцяў, якімі жылі людзі часоў Вэрна і сам пісьменьнік: тут сьпляталіся біржа (і нявер'е ў яе сумленнасьць), дэмакратыя (і нявер'е ў яе эфэктыўнасьць), тэхніка (і страх перад злоў-жываньнямі, зьвязанымі зь ёй), а таксама чэкі з многімі нулямі, якіх адначасова прагнулі і якімі пагарджалі за тое, што яны робяць зь людзьмі.

І яшчэ важны элемэнт — габрэі. Адзін з галоўных афэрыстаў, барон Рэйнак, быў натуралізаваным габрэем. Панамская афэра засьведчыла, што антысэмітызм — паззыцыя, якой раней саромеліся, — зрабіўся модным поглядам, які тлумачыў усе хваробы францускай эканомікі і палітыкі. Некалькімі гадамі пазьней гэта прывяло да «справы Дрэйфуса», калі быў пакараны за шпіёнства афіцэр-габрэй. Хоць Дрэйфуса саслалі на Д'ябальскі востраў у францускую Гвіяну, контравыведка працягвала перахопліваць паведамленьні, што паходзілі ад той самай крыніцы, якою ў сапраўднасьці быў маёр Вальсэн Эстэргазі.

Нягледзячы на пераканаўчыя довады, многія французы лічылі, што Дрэйфус павінны застацца ў высылцы, бо гонар арміі быў важнейшы за несправядлівасьць, учыненую ў дачыненьні да нейкага габрэя. Сярод іх быў і Жуль Вэрн, удзельнік групы інтэлектуалаў, якія супраціўляліся перагляду справы.

## Сіла пераканаўньня выдаўца

Як жа сталася ў выніку, што, нягледзячы на ўсё, Вэрн так рэдка прыадкрываў уласныя погляды ў сваёй прозе? Адказ гучыць каротка і ясна: П'ер Жуль Этцэль, ягоны выдавец. Яны пазнаёміліся адзін з адным у 1862 г. Этцэль меў за сыпнай ідэалістычную маладосьць. Пераканаы дэмакрат, ён эміграваў у Бэльгію пасьля дзяржаўнага перавароту Люі Напалеона, каб выдаваць там апазыцыйныя газэты. Па меры лібэралізацыі рэжыму вярнуўся ў краіну і шукаў для сябе нейкага прыбытковага і апалітычнага занятку.

Вэрн стаўся для яго літаральна маннай нябёснай, але і будучаму фантасту патрэбен быў нехта такі, як Этцэль. У момант сустрэчы Вэрну было 35 год (Этцэлю было пад пяцьдзясят), ён зь пераменным посьпехам гуляў на біржы ўласнымі сродкамі і грашамі сваіх кліентаў, а таксама бяз посьпеху спрабаваў сілы як празаік і драматург (ён апублікаваў жахліва антысэміцкі твор «Марцін Паз»). Яму быў патрэбны пералом, якім сталася напісаньне для Этцэля «Пяці тыдняў на паветраным шары» — найвялікшага бэстсэлеру 1863 году.

Можа, упершыню ў гісторыі поп-культуры Этцэль і Вэрн утварылі тандэм, які потым рэплікаваўся ў розных краінах, сытуацыях і жанрах. «Бітлз» і Браян Эпстэйн. Элвіс і палкоўнік Паркер. З аднаго боку велізарны талент, з другога — выдатнае адчуваньне таго, што менавіта ў гэты момант патрабуе масавы спажывец.

З гэтага не вынікае, што Этцэль пісаў раманы за Вэрна, як Эпстэйн не сьпяваў за «Бітлз». Але менавіта Этцэль навязаў Вэрну нязьменны аптымізм, які праменіць зь яго раньніх раманаў. Ён адрынуў рукапіс «Парыжу ў XX стагодзьдзі» з той прычыны, што масавы малады чытач не прыняў змрочнага чытва. Вэрн звычайна бяз спрэчак згаджаўся з вэрдыктамі свайго выдаўца проста таму, што ўжо перажыў працяглы пэрыяд, падчас якога пісаў, што хацеў — але ніхто не хацеў гэтага чытаць.

Згодна з Этцэлевымі парадамі Вэрн дабаўляў камічныя элемэнты, мяняў характар героям і нават дадаваў шчасьлівыя фіналы. «Таямнічы востраў» мусіў сканчацца тым, што каляністы сапраўды ратуюцца, але да канца жыцьця іх мучае настальгія па месцы іх колішняга зьняволеньня. Замест гэтага зьявіўся — па ініцыятыве Этцэля — дзіўнаваты хэпі-энд, у якім героі выкарыстоўваюць багацьце памерлага капітана Нэма на тое, каб у сэрцы ЗША рэканструяваць дакладную копію вострава, на якім яны правялі столькі год (што мае цікавыя фрайдысцкія матывы: вызваленыя будуюць копію турмы, каб сядзець у ёй добраахвотна?).

## Капітан Нэма быў палякам

Адно з найістотнейшых умяшаньняў Этцэля (найважнейшае для чытача-паляка) тычылася капітана Нэма. У Вэрнавым рукапісе капітан быў палякам, які помсьціў Расеі за сьмерць сваёй сям'і ў выніку рэпрэсій па задушэньні паўстаньня 1863—1864 гадоў.

Этцэль не згаджаўся: па-першае, меў у Расеі шмат падпісчыкаў, а па-другое, Расея была тады блізкім саюзьнікам Францыі. Аргумэнт з расейскімі чытачамі быў нацягнуты: шмат чытачоў было ў Этцэля і ў Вялікабрытаніі, што не перашкодзіла ў канчатковым выніку зрабіць капітана Нэма індусам, які помсьціць англічанам. Найважнейшай была палітыка, гэта значыць афіцыйная французска-расейская дружба.

Сытуацыя была парадаксальная — Этцэль, яшчэ ня так даўно рэспубліканскі ідэаліст, падвяргаў цэнзуры твор пісьменьніка, які ўвогуле ня меў бунтарскіх схільнасьцяў, але якому такі сюжэт пасаваў проста паводле літаратурнай кампазыцыі (як вядома, у «20 000 льё пад вадой» нацыянальнасьць Нэма застаецца нявысьветленай, не даведваемся мы таксама, за што і супраць каго ён змагаецца; нашмат пазьнейшае тлумачэньне з «Таямнічага вострава» аказваецца бессэнсоўным: калі б Нэма быў індусам, прафэсар Аранакс павінен быў бы, прынамсі, заўважыць яго азіяцкае паходжаньне). Пазыцыя Этцэля як выдаўца бэстсэлераў была, аднак, выдатнай ілюстрацыяй таго, што не бывае больших цынікаў, як учарашнія ідэалісты.

Упершыню Вэрн узбунтаваўся супраць Этцэля сямю гадамі пазьней, рыхтуючы да выданьня ў 1877 г. раман «Гэктар Сэрвадак», у якім ён вярнуўся да свайго ўлюбёнага антысэмітызму. Раман апавядае пра групу падарожнікаў, якія выпадкова пакідаюць Зямлю на блізка пралятаючай камэце. У космасе яны сустракаюць выключна несымпатычную істоту, а менавіта яўрэйскага купца Ісаака Хакабута — пэрсанажа, які быў цалкам змаляванага з карыкатур з пазьнейшай *Der Sturmer*. Этцэль, для якога Вэрн ужо тады быў курыцай, што нясе залатыя яйкі, гэтым разам не пратэставаў, абмяжаваўшыся зьмякчэньнем некаторых акцэнтаў.

Пэсымізм, які зьяўляецца ў позьніх раманах Жуля Вэрна, такіх, як дылёгія «Робур-заваёўнік» — «Валадар сьвету», вынікаў, такім чынам, ня столькі з расчараваньня пісьменьніка тэхнічным прагрэсам, колькі зь яго вызваленьня з-пад уплыву свайго выдаўца (які памёр у 1886 г.). Сам жа Вэрн ад пачатку глядзеў на любы прагрэс — грамадзкі ці тэхнічны — без энтузіязму.

## Пахмурны прарок касманаўтыкі

Вэрнава прадбачаньне будучыні было трапным і праніклівым, асабліва на фоне фантастыкі XIX ст. У дылёгіі «З гарматы на Месяц» — «Вакол Месяца» пісьменьнік дакладна прадказаў праграму «Апалён». Ён адзначыў, што ў ЗША два месцы найбольш прыдатныя для старту на Месяц — Флорыда і Тэхас, і выбраў зь іх Флорыду. Два цэнтры НАСА месьцяцца цяпер у Х'юстане і на мысе Канавэрал. Ён прадбачыў, што пасьпяховае вяртаньне астранаўтаў на Зямлю будзе лепш ажыцьцявіць шляхам прывадненьня ў Ціхім акіяне, а таксама неабходнасьць ужываньня ў касьмічным палёце хімічных паглынальнікаў вуглякіслага газу.

Надзвычай цэльным зьяўляецца і апісаньне Парыжу ў XX ст. — Вэрн прадказаў нават тэлефакс («фатаграфічны тэлеграф»), вынаходку, пра якую ня згадвалі нават фантасты дваццатага стагодзьдзя, якія звычайна канцэнтраваліся на нечым абсурдна-непрактычным, як відэафон. Ён таксама прадбачыў мэтро, тэндэнцыю выцясьненьня з цэнтру гораду жылых дамоў на карысьць крамаў ды офісаў.

«Робур-заваёўнік» прынёс аж занадта трапнае, на жаль, прадказаньне першага сур'ёзнага прымяненьня лятальнага апарата, цяжэйшага за паветра, — у якасьці эфэктыўнай зброі.

Вэрн быў моцна аблытаны забабонамі і стэрэатыпамі сваёй эпохі, але ў будучыню глядзеў цьвяроза і глыбока, хоць і без энтузіязму. З большым энтузіязмам мы сёньня зьвяртаемся да вобразу Вэрнавай эпохі ў яго раманах, нават калі гэты энтузіязм астуджвае ўсьведамленьне таго, што іх аптымізм быў вынікам штучнай падфарбоўкі пяром выдаўца. Стагодзьдзе з дня сьмерці пісьменьніка — добрая нагода, каб паразважаць над тым, ці сапраўды гэтыя дзьве эпохі так моцна адрозьніваюцца адна ад адной.

**Паводле gazeta.pl**

# Мікрафон уласьці

З падслуханага на беларускім радыё і ў іншых месцах запісала Тацяна Барысік.

«К вялікаму сажаленію, плюралізм мненій у нашым обшчастве яшчо сьлішкам шырокі».

«60-годзьдзе перамогі — гэта сымбаль змаганьня зь верай і надзеяй».

Уражаньні дзеяча БРСМ ад сустрэчы вэтэранаў з моладзьдзю: «Сядзіт у зале маладой чалавек, і сьляза яму глаз прашыбает».

Кароткія вытрымкі з радыёвыступу дэпутата і тэатрала па сумяшчальніцтве, які спрабуе размаўляць па-беларуску: «Наш славянін — асаблівы беларус». «Сёньняшнія ідэалягічныя каштоўнасьці — гэта і ёсьць тое, чым павінен займацца тэатар». «Сьвет ня чорны і ня белы. Ён складаецца з канкрэтных тонаў». «Чаму ўсе п'есы, што піша моладзь, пра наркотыкі, гвалт? Хоць бы пра нейкае каханьне напісалі». «Зямля з блакітнымі вачыма» (пра Беларусь).

Старшыня сельсавету пра адраджэньне вёскі: «Дэмаграфічная сытуацыя ў нас стабільная, на тэрыторыі сельсавету пражываюць 21 вэтэран і тры інваліды».

Старшыня выканкаму аб неабходнасьці абавязковай падпіскі на раёнку: «У раёні далжна быць свая пячаць. А есьлі вам ня нравіцца, дык у другі раён едзьце».

### З прачытанага

Абвестка на дзьвярах пад'езду: «Паважаныя жыхары дому №31! 13.05.05 у 16:00 у памяшканьні ЖЭУ №1 будзе праводзіцца вакцынацыя сабак супраць шаленства. Яўка абавязковая».

Пісьмовы адказ на скаргу: «Прыведзеныя вамі факты хоць і мелі месца, але не адпавядаюць сапраўднасьці».

З службовай інструкцыі: «Супрацоўнікі нясуць асабістую адказнасьць за выкананьне абавязкаў і выкарыстаньне правоў у межах дзеючага заканадаўства».

### З кожным годам усё хужай

**Госьць у хату**

— Вось я ішоў, ішоў і нарэшце дайшоў! — захоплена прамаўляе вядучы праграмы «Падарожжа дылетанта».

— Ды лепш бы ты зусім не прыходзіў! — з пачуцьцем глыбокага смутку канстатуе тэлеглядач, зьнясілены ранішнім змаганьнем з пахмельным сындромам.

**Радасьць па-беларуску**

Купляюць вяскоўцы ходнік у краме. Нагледзелі, разгарнулі, упадабалі.

— Ай, які харошы, яркі! — радасна засакатала немаладая ўжо кабета. Пасьля на якую хвіліну сьціхла, уздыхнула:

— На ім мяне і паложаць.

**Досьвед**

Дваццацігадовая студэнтка разам з суседкаю-пэнсіянэркаю абіраюць сьлівы.

— Не хачу на сьлівіну без драбін лезьці, — гаворыць дзеўка. — Сёлета разьелася, дык баюся, што галіна пада мною абломіцца. А летась яшчэ лазіла.

— А што ж ты, мая галубка, думала? З кожным годам будзе ўсё хужай і хужай… — дзеліцца жыцьцёвым досьведам сямідзесяцігадовая суседка.

**Рассаднік сьвіней**

Кароткая, але зьмястоўная характарыстыка сацыяльна-эканамічнага становішча сельскага паселішча на Бабруйшчыне:

— Дзярэўня, гразь, сьвіней мы там купляලі…

**А як яны мне?**

Завітала да Марыі ў госьці сяброўка. Тут бы пасядзець, пагаманіць. Ды вось дзеці замінаюць, есьці просяць. Падышла Марыя да пліты, паглядзела — боршч укіс! Сыпнула соды. Зашыпеў боршчык.

— Дзеткі, хадзіце есьці!

— Марыечка, ты што! Ці можна дзецям такое? — захвалявалася сяброўка.

— Што яны цяпер ядуць, дык я бачу. А вось што я пад старасьць есьці буду?

**Стандарты і выпечка**

Сацыяльныя стандарты, сацыяльныя стандарты, — паслухаўшы перадачу на тэму адраджэньня вёскі, бубніць гарадзкі вясковец. — Век хлеба сьвежага не зьвсі.




**Книгі Васіля Быкава і Уладзімера Арлова на ўкраінскую мову пераклаў вядомы празаік Аляксандар Ірванец. Тамы выйшлі шматтысячнымі накладамі.**




# Знакі прыпынку



**УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ**

* * *

Зусім нечаканы для мяне ўспамін Рэваза Інанішвілі пра Віктара Барысавіча Шклоўскага…

В.Б. выступае на мітынгу пратэсту (дзе клеймавалі Амэрыку падчас Карыбскага крызісу) і кажа:

«Урэшце, хай будзе што будзе, толькі да якой пары нам цацкацца з нахабнымі капіталістамі, ударым па іх як сьлед — і прыкончым раз і назаўсёды! Я стары, але гатовы хоць сёньня апрануць шынель!..»

І далей рэмарка Інанішвілі: «У залі знаходзіліся двое маладых мужчынаў (адзін з рукой на перавязі), абодва ўсталі і дэманстратыўна пакінулі залю».

Такое адчуваньне, нібы скрозь вайна… Стары Шклоўскі ледзьве ўжо не ў шынялі, малады мужчына з рукой на перавязі… А дзея адбываецца самым звычайным мірным летам у пісьменьніцкім Доме творчасьці ў Ялце!..

Нечага ў дзеі Віктара Барысавіча Рэваз Інанішвілі не зразумеў… Не заўважыў.

* * *

Кожная з найлепшых кніг тым найлепшая, што ёсьць у ёй з таго, чаго немагчыма прачытаць, што застанецца таямніцай.

* * *

«Толькі ахвяруючы ўсім, можна заваяваць усё!» — прыдумалі футурысты, калі прыйшла рэвалюцыя.

* * *

Клерк зь японскай амбасады раптам кажа мне, што ведае, як па-беларуску «thanks». «Д-зя-куй», — кажа клерк.

Я згадваю беларуса, які на Далёкім Усходзе хадзіў каля Японіі капітанам сэйнэра. Было гэта ў канцы 1980-х, калі пачынаўся крымінальны рыбны бізнэс. Да сэйнэра савецкага швартаваўся ў моры-акіяне сэйнэр японскі — і рыба перавальвалася з борту на борт. Яно і цяпер так робіцца, але ўжо за сапраўдныя грошы, а тады — абы за што, амаль задарма. «Ну, усё?..» — пытаўся чарговы японец, разьлічыўшыся абычым. «Не, ня ўсё! — кожнага разу кожнаму японцу адказваў беларус. — Скажы яшчэ «Дзякуй».

— Вы рыбным промыслам ніколі не займаліся? — пытаюся я ў клерка зь японскай амбасады. Той усьміхаецца хітранька:

— Бацька займаўся.

Мусібыць, калі беларусаў карміць дармавой рыбай, дык і яны загавораць па-беларуску.

**АДАМ ГЛЁБУС**



# Невялікае пра вялікіх

### Сюньцзы і шлях

Назву кніг паэзіі эпохі Тан «Пастаянства шляху» ўкладальнікі зрабілі з выказваньня старажытнага мысьляра Сюньцзы (III ст. да н.э.): «Высакародны чалавек захоўвае пастаянства шляху, нікчэмныя людцы імкнуцца адно да ўласных выгод». Пры стварэньні назвы быў выкарыстаны прыём «усечаная цытата». Мяне вельмі зацікавіў гэты прыём, і я паспрабаваў перанесьці яго на беларускую паэтычную глебу. Адразу згадаліся тры рэчы: «Мой родны кут…», «Маладыя гады…», «Партызаны, партызаны…». Напэўна, выкарыстоўваць «усечаную цытату» ў беларускай літаратуры можна, абапіраючыся толькі на трох паэтаў — Коласа, Багдановіча і Купалу.

*20.01.2005, 17:06*

### Гарэцкі і 2, або Як беларусы любяць лічбу два

Калі Максім Гарэцкі пісаў аповесьць «Дзьве душы», пэўна ж, ён і думаць ня думаў, што ў беларуса будуць ажно два Дні Незалежнасьці: 25 сакавіка і 3 ліпеня. Дзьвюхдушнасьць беларуса пашырылася на ўсё чыста. У беларуса дзьве сталіцы: Мінск і Менск, ці Менск і Вільня, ці Мінск і Масква. Усё залежыць ад пераканаьняў, але ж і дзяржавы ў яго дзьве — БНР і РБ, РБ і Саюзная дзяржава. Круці ўлева ці ўправа, а дзяржавы будзе дзьве. І мовы дзьве. І граматыкі дзьве. Гербаў два — конь і капуста. Сьцягоў два. Веры дзьве, таму і Хрыстос уваскрасае ў беларускай сьвядомасьці двойчы. Новы год таксама двойчы надыходзіць. Калі беларусу сказаць: «Адзін цар, адна вера, адзін народ!» — ён адкажа: «Адна-адна, адзін-адзін, агаага…» Беларус — паэт, на тэзу ён знойдзе антытэзу ў простых паўторах. Таму і вялікіх паэтаў у беларуса два — Колас і Купала, Пушкін і Міцкевіч, Шэкспір і Быкаў… Дзьве нагі ў беларуса, дзьве рукі і два вокі. Дзьве жонкі, дзьве каханкі, два сыны — разумны і дурань, дзьве дачкі — бабіна дачка і дзедава дачка, два браты — багаты і бедны. У беларуса адзін нос, і ён страшэнна праз гэта перажывае, але супакойвае сябе тым, што ў носе дзьве дзіркі.

### Прышвін ды Інтэрнэт

Майстар лірычна-філязофскай прозы Міхаіл Прышвін, каб пазбавіцца гладкапісу і хуткапісу, часам знарок псаваў пёры сваіх асадак. Пакуль прыстасуеш надламанае пяро, колькі разоў перадумаеш, перапрацуеш і пераўзважыш тэкст. Так цяпер, пішучы на форумах у Нэце, адчуваеш супраціўленьне чужых думак і меркаваньняў. Яны спыняюць гладкапіс. Даводзіцца хоцькі-няхоцькі чытаць і дурноту чужую, і разумныя заўвагі. Прадзіраючыся праз зарасьнікі графаманіі, я, нібыта той Прышвін, пішу сапсаваным пяром.

*25.07.2003, 21:55*

# Футбол у сьпёку

Нягледзячы на зэніт лета і масавыя адпачынкі, футбалісты і ня думалі ісьці ў водпуск. На мінулым тыдні пачалося другое кола чэмпіянату Беларусі ў вышэйшай лізе, а 28 ліпеня два беларускія клюбы пераадолелі першы раўнд Кубку УЭФА. БАТЭ ў Барысаве каменя на камені не пакінула ад кутаіскага «Тарпэда» — 5:0. МТЗ–РІПА па суме двух матчаў абышоў вугорскі «Фэрэнцвараш». Піша **Алег Раявец**.

## Новы менскі «супэрклюб»

Апошнім часам і журналісты, і футбольныя спэцыялісты праяўляюць да МТЗ-РІПА цікавасьць. Створаная тры гады таму каманда прайшла за два гады шлях ад другой лігі да вышэйшай. Праўда, мінулай восеньню клюб цудам утрымаўся ў «вышцы», а вынікі некаторых матчаў далі падставу журналістам вінаваціць каманду ў несумленных гульнях. Але ня той злодзей, на каго казалі, а той, каго злавілі. МТЗ-РІПА засьпета не было.

Па сканчэньні сэзону клюб зьведаў якасныя зьмены. Прыйшлі новыя гульцы, на трэнэрскі мосьцік клюбу ўзышоў галоўны трэнэр моладзевай зборнай Юры Пунтус. Ён адразу пацьвердзіў рэнамэ самага пасьпяховага беларускага спэцыяліста: у траўні МТЗ-РІПА заваявала Кубак Беларусі і, як вынік, пуцёўку ў Кубак УЭФА. У ліпені клюб закрануў самы гучны пераход міжсэзоньня. Пры канцы месяца ў каманду перайшоў малодшы брат Аляксандра Глеба — гулец нацыянальнай зборнай Вячаслаў Глеб, які не прыжыўся ў клюбах другога эшалёну Нямеччыны.

## Літоўска-цьвярскі мільянэр

Перамены ў МТЗ-РІПА зьвязаны з асобай 58-гадовага Ўладзімера Раманава, кіраўніка літоўскай інвэстыцыйнай кампаніі «Ukio Bankas». Ураджэнец расейскай Цьвяры валодае 98% акцый менскага клюбу, які поруч з трыма літоўскімі клюбамі, у тым ліку чэмпіёнам краіны «Каўнасам», ды шатляндзкім «Хартсам» утварае холдынг. Наяўнасьць холдынгу дае пэўныя перавагі. Так, Вячаслава Глеба МТЗ-РІПА арандуе ў... «Каўнасу», а лідэр менчукоў Гамлет Мхітаран падпісаў кантракт з «Хартсам».

Раманаў мае намер пабудаваць у Заводзкім раёне сталіцы спорткомплекс з новым крытым стадыёнам (МТЗ толькі арандуе «Трактар». — **«НН»**), пляцоўкі для гульнявых відаў спорту, футбольны манэж, мэдыцынскі цэнтар для спартоўцаў, паркінг, гатэль, канцэртную арэну, выставачны цэнтар. Сума інвэстыцый — 250 млн эўра, а пытаньне абмяркоўвалася на нарадзе ў прэзыдэнта, і кіраўнік дзяржавы даў згоду.

Ня выключана, што менавіта таму, трымаючы ў галаве ініцыятывы Раманава, прэзыдэнт краіны лагодна, без адмысловых маральных настаўленьняў, у мінулую пятніцу прыняў даверчыя граматы ў новага літоўскага пасла Пятраса Вайцікунаса.

Беларускі футбол вымагае сур'ёзных інвэстыцый звонку, бо айчынныя прадпрымальнікі сядзяць як мышы пад венікам. Праяўленьне імі інтарэсу да мясцовага спорту аўтаматычна цягне за сабой цікавасьць з боку органаў дзяржкантролю. Зачараванае кола. А Раманаў — усё ж грамадзянін і жыхар іншай краіны. У найгоршым выпадку згарне тут бізнэс — і ўсё.

Таму стварэньне моцнага клюбу ў сталіцы на грошы братняй Літвы нікому не зашкодзіць. Гледачы на «Трактар» ходзяць з ахвотай. Так, на гульню з «Фэрэнцварашам» сабралася, нягледзячы на невыносную сьпёку, 10 тыс. чалавек. Гэта пры тым, што пасьля гасьцявой вікторыі зь лікам 2:0 пытаньне пра выхад у наступны этап Кубку УЭФА было амаль вырашаным. Інтрыгі ніякае.

Вось толькі каб футбалісты на полі яшчэ падтрымлівалі аўтарытэт клюбу. А тут — нават пры Пунтусу праблемы. МТЗ-РІПА хоць і прайшло ў наступны этап Кубку УЭФА, у розыгрышы чэмпіянату Беларусі загразла ў сярэдзіне табліцы.

## Месца для сустрэч

Матч у адказ супраць «Фэрэнцварашу» наведала багата футбольных спэцыялістаў, у прыватнасьці трэнэр нацыянальнай зборнай Анатоль Байдачны, экс-трэнэр Эдуард Малафееў з жонкай. Легенда беларускага футболу трэніруе 250 дзетак у школе МТЗ-РІПА. Міжнародныя матчы ў Менску — найлепшы спосаб спаткацца з тымі, каго даўно ня бачыў. Перад галоўным уваходам я сутыкнуўся з аднакурсьнікам, зь якім ня бачыўся гадоў пяць. І матч паглядзелі, і падзяліліся перажытым. У тым ліку абмеркавалі й працу Сяргея ў БДУ некалькі гадоў таму пад кіраўніцтвам Аляксандра Казуліна. Пасьля гэтай гутаркі мая вера ў чарговага правадыра сацыял-дэмакратаў, якая нарадзілася пасьля Зьезду беларусаў сьвету, зноў пахіснулася.

## Нашэсьце насякомых

МТЗ-РІПА з пачатку гульні палезла на вароты. Выдзяляліся беларуска-грузінска-армянская троіца Канцавы—Тодуя—Мхітаран. Але ад некалі вядомага «Фэрэнцварашу» засталося толькі імя ды сымпатычныя бела-зялёныя колеры. І тут варта зьняць капялюш перад вугорскімі заўзятарамі, якія,. нягледзячы на адсутнасьць шанцаў, прыехалі ў Менск і на працягу дзьвюх гадзін падтрымлівалі ўлюбёны клюб.

Пры канцы першага тайму «трактаразаводцы» нечакана «сталі», за што і паплаціліся. Спачатку Аляксандар Суліма праз разьдзяўбайства абаронцаў двойчы запар параваў удары мадзяраў, аднак праз хвіліну не пасьпеў выратаваць аднаклюбнікаў пасьля ўдару Ліпчэі.

Настрой быў сапсаваны. Паўплывала на яго й нашэсьце ў перапынку нейкіх падазроных насякомых з падоўжанымі крыльцамі, якія хвілін дваццаць атакавалі трыбуны. На наступны дзень дасьведчаныя людзі растлумачылі, што гэта пачаўся сэзон міграцыі ў мурашак.

Беларусы аднавілі раўнавагу на трэцяй хвіліне другога тайму. Пасьля выкананьня стандарту Мхітаранам гол забіў Арцём Канцавы. На 78-й хвіліне Юры Пунтус, відаць, знарок памяняў Гамлета, каб гледачы праводзілі яго авацыяй. Гэта быў апошні матч армянскага легіянэра за менчукоў. Будзем спадзявацца, што ён ня згубіцца ў Шатляндыі, чэмпіянат якой стартаваў 30 ліпеня, а «Хартс» нарэшце ўкліняцца ў разборкі паміж «Сэлтыкам» і «Рэйнджэрсам». У мінулым чэмпіянаце адставаньне «Хартсу» ад лідэраў склала 42 (!) балы.

## Сапсаванае сьвята

Натуральна, гледачы чакалі ад МТЗ-РІПА перамогі. Апроч пазытыўнага настрою заўзятараў, гэта палепшыла б таксама сумарны каэфіцыент беларускіх клюбаў на міжнароднай арэне. Але пры канцы сустрэчы вугорцы забілі яшчэ адзін мяч — 1:2.

Рабочыя трактарнага заводу, сыходзячы з матчу, не шкадавалі запасу лексыкі. Уладзімер Някляеў спускаўся па лесьвіцы, зьмрочна паглядаючы пад ногі.

Зрэшты, галоўнае — вынік. МТЗ-РІПА прайшло ў наступны этап, дзе памерацца сіламі з чэскім «Цэпліц». Першы матч дома — 11 жніўня. Ю.Пунтус так пракамэнтаваў журналістам лёсаваньне: «На мой погляд, у нас зь «Цэпліц» прыкладна роўныя шанцы. Але ня надта добра, што першы матч гуляем дома». Дадам, што з чэхамі беларусам ня вельмі шанцуе ў эўракубках.

## Панядзелкавае дэрбі

У панядзелак, 1 жніўня, МТЗ-РІПА правяло матч зь менскім «Дынама». Своеасаблівае менскае дэрбі, хоць да заўзятых дэрбі накшталт «Рома»—«Лацыё» або «Арсэнал»—«Чэлсі», падчас якіх вымірае жыцьцё на вуліцах у італьянскай і брытанскай сталіцах, нам яшчэ далёка.

Перад матчам падавалася, што гульня з «Фэрэнцварашам» была прыкрай выпадковасьцю і МТЗ-РІПА на роўных пазмагаецца з «Дынама». Прынамсі, пастараецца ўзяць рэванш за паразу ў першым коле.

«Трактарабудаўнікі» валодалі ініцыятывай хвілін з дваццаць. Яны ж першымі адкрылі лік — на 12-й хвіліне спрацаваў стандарт у выкананьні Вячаслава Глеба. Гэта першы мяч Глеба-малодшага ў вышэйшай лізе беларускага чэмпіянату. Дзіўна, але Вячаслаў у элітным дывізіёне не гуляў — ён правёў некалькі гульняў за першалігавую «Дынама-Юні».

Сяміразовы чэмпіён хутка зьбіў тэмп гульні. На 33-й хвіліне дынамавец Сяргей Кісьляк рэалізаваў пэнальці, а пасьля два галы Леаніда Ковеля канчаткова паставілі МТЗ-РІПА на месца. З сыходам Мхітарана гульня ў клюбу «не пайшла», і стварыць нешта вартае ля брамы Артура Ляська яны ня здолелі.

Хіба толькі вызначыўся Арцём Канцавы, які зарабіў чырвоную картку. Праз нейкі час чырвоную картку — з трыбуны падалося, несправядліва — атрымаў і дынамавец Ковель. Заўзятары праводзілі хлопца з поля авацыямі.

Апошнія хвілін пятнаццаць каманды адбывалі нумар. «Дынама» ўтрымлівала лік, «трактарабудаўнікі» падаваліся нейкімі соннымі. Куды цікавей было назіраць за трыбунамі, у прыватнасьці за сэктарам фанаў «Дынама», якія цэлы матч размахвалі велічэзнымі сьцягамі-харугвамі, падганялі каманду наперад. Фаны пачалі гучна падтрымліваць сваіх улюбёнцаў якраз пасьля прапушчанага голу. Пры канцы гульні яны запалілі рознакаляровыя дымавыя шашкі, а пад самы фінальны сьвісток зладзілі сапраўдны фаервэрк. Прыгожа. Шкада, што «Дынама» ня здолела прабіцца ў наступны раўнд Лігі чэмпіёнаў. Турэцкаму «Трабзанспору» і яго заўзятарам было б чаму падзівіцца на галоўнай арэне Менску.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**31 ліпеня на стадыёне парку Чалюскінцаў адбыўся традыцыйны міні-футбольны «Кубак Свабоды» памяці Генадзя Карпенкі. Перамагла каманда журналістаў, унічыю зь якой здолелі сыграць толькі футбалісты Партыі БНФ. Найлепшым бramнікам турніру быў прызнаны Дзьмітры Яненка з каманды ПКБ. Браму АГП вартаваў Анатоль Лябедзька. Гуляў і яго намесьнік Яраслаў Раманчук. Лідэры іншых партыяў на поле ня выйшлі. На здымку: Анатоль Лябедзька (сядзіць трэці справа) і ягоны намесьнік Яраслаў Раманчук (чацьверты) пасьля гульні.**

ІНФАРМАТАР

# Паштовыя і кур'ерскія службы Менску



**Белпошта**
пр.Ф.Скарыны, 10, 226–11–70
**замова тавараў па каталёгах —** вул.М.Танка, 36/2, 207–88–55
**Менская пошта**
пр.Ф.Скарыны, 10:
**даведка** — 227–84–02
**вытворчасьць** — 226–06–84
**дыспэтчарская** — вул.Вакзальная, 22, 222–71–62
**Менская белпошта** — вул.Варанянскага, 5/3, 222–75–85, ф.224–32–02

**Паштамт**
пр.Ф.Скарыны, 10:
**аддз. сувязі №50, начальнік** — 226–06–84, 227–77–24
**даведка паслуг** (электроннае фота на капэрту, капіяваньне, лямінаваньне ды інш.) — 227–84–02
**паслугі Інтэрнэту** — 222–48–92
**паслугі электроннай пошты і факсу —** 227–00–01, ф. 226–05–30
**паслугі факсымільнай сувязі, тэлеграфу** — 227–44–07, ф. 227–00–01
**замова на дастаўку сувэніраў, кветак, замова тавару па каталёгах —** вул.Сьвярдлова, 1, 227–77–71
**пасылкі, спэцыяльная ўпакоўка —** 227 25 33
**экспрэс-пошта** — 227–85–12, адм. 227–53–14

**Кур'ерская служба, паскораная пошта**
**«Дэміс»** (міжнародная экспрэс–дастаўка грузаў і дакумэнтаў) — вул.Платонава, 10, 236–80–00, 284–90–44
**«DHL Worldwide Express»** (міжнародная экспрэс–авіядастаўка) — вул.Берасьцейская, 18, 278–11–08, пр.Машэрава, 5, 289–30–68
**«Мэкус»** (экспрэс–дастаўка грузаў і карэспандэнцыі) — вул.Жукоўскага, 156, 216–26–92
**«EMS Belarus»** (міжнародная паскораная пошта) — пр.Ф.Скарыны, 10 (паштамт), 227–53–14/85–12, 222–65–11, ф.226–05–30
**«UPS»** (міжнародная экспрэс–дастаўка) — Музычны зав. 3, 227–22–33
**Вузел спэцсувязі** — вул.Чкалава, 39, 224–69–27/78–25/32–39, ф.224–46–27
**Экспрэс-пошта** (дастаўка карэспандэнцыі па гарадах Беларусі — «сёньня на заўтра») — пр.Ф.Скарыны, 10 (паштамт), 227–85–12/53–14

КАІСА

# Яшчэ раз пра адкрытыя турніры

За апошнія дзесяцігодзьдзі шахматы зрабіліся больш прадказальнай гульнёй, аднак дрэйфуюць у бок дэмакратыі (ці мо плютакратыі). Кожны, хто мае грошы, не зважаючы на рэйтынгі і званьні, можа сабе дазволіць раз на год пазмагацца з гросмайстрамі ў якой-небудзь народнай «швайцарцы». Нямала такіх ладзіцца ва Ўкраіне. Нават у гонар 792-годзьдзя «старажытнага гораду Гарадка» на Львоўшчыне запланавана спаборніцтва зь пяшчотным найменьнем «Інсталпластхв-2005»

Беларускія гульцы доўга чакалі — і дачакаліся — буйнога шахспаборніцтва ў сталіцы. У сярэдзіне ліпеня ў Менску, дзякуючы фірме «Інаўтамаркет», за шахматы селі нават тыя, хто закінуў актыўную гульню, — экс-чэмпіён Беларусі Герман Качаткоў, міжнародны майстар Вячаслаў Чакураў. Побач з «мэтрамі» гулялі і бязрэйтынгавыя шахматысты, часам пасьпяхова. У Цэнтральнай Эўропе самым масавым і знакавым турнірам стаў «Пардубіцэ-оўпэн», што ладзіцца кожнае лета. Тамтэйшыя баталіі не абмяжоўваюцца клясычнымі шахматамі: удзельнікі гуляюць і ў шашкі, і ў го. Пардубіцы пакуль больш раскручаныя ў шахматным сьвеце, чым Менск, і прызоў там болей. Нездарма адразу па заканчэньні «Інаўтамаркет-оўпэну» дэлегацыя беларускіх гульцоў зафрахтавала аўтобус і выправілася шукаць прыгод у Чэхію. Пра вынікі паведамім у адным з наступных выпускаў «Каісы».

Такія фэсты павышаюць статус шахмат у грамадзтве ды спрыяюць выяўленьню талентаў у новай генэрацыі гульцоў — асабліва гульцоў з правінцыі. Ліпеньскія баталіі ў Менску засьведчылі, што аршанская шахматная школа глядзіцца досыць самавіта: першаразраднік Станіслаў Цыганчук упэўнена здолеў вопытнага майстра ФІДЭ Віталя Карніловіча, кандыдат Уладзімер Раманаў — віцэ-чэмпіёна краіны Юр'я Ціханава. Прыемна ўразіла гульня Давіда Хачыкяна. 11-гадовы хлопчык з Баранавіч, які мае ў паслужным сьпісе 4-е месца на дзіцячым першынстве Эўропы, стартаваў выдатна: 2,5 з 3. У горшай пазыцыі ён дабіўся роўнасьці зь Сяргеем Азаравым, чый рэйтынг на паўтысячы пунктаў вышэйшы за хачыкянаўскі. Пасьля партыі судзьдзя Леанід Суднікаў, трэнэр Азарава, урачыста павіншаваў Давіда з заслужанай нічыёй. Падумалася: мо гады праз тры-чатыры ўжо гросмайстраў прыйдзецца віншаваць зь нічыёй, на якую яны ўцякуць у партыі з хлапцом…

Паглядзіце партыю, дзе кандыдат у майстры (ELO 2001) начыста перайграў майстра спорту (ELO 2371), прычым трэнэр Давіда Аляксандар Сідарэня прызнаўся нам, што супернік быў злоўлены на кручок хатняй нарыхтоўкі. Хлопчык добра засвоіў схему з падрывам цэнтру ходам f7-f6, а чэмпіён Беларусі-2004 пераацаніў пазыцыю, рынуўся ў атаку і сам пад яе патрапіў. Выснова: нават дзіця здольна абвергнуць павярхоўную гульню ў стылі «бліц»… Прынамсі, у час оўпэн-турніру.

А.Малюш — Д.Хачыкян, Менск, 11.07.2005.

1. e4 c5 2. Kc3 Kc6 3. g3 g6 4. Cg2 Cg7 5. d3 e6 6. f4 Kge7 7. Kf3 d5 8. e5 0-0 9. 0-0 f6 10. ef Cf6 11. Te1 Kf5 12. Ke2 b5 13. g4 Kfd4 14. Ked4 Kd4 15. c3 Kf3+ 16. Фf3 Фd6 17. Фg3 Cb7 18. h4 Tae8 19. h5 gh 20. g5 Cg7 21. Ch3 d4! 22. Cd2 dc 23. bc b4 24. g6? Tf6! 25. gh+ Kph7 26. Kph2 Tg6 27. Фh4 Фd3 28. Tad1 Фf3. Белыя здаліся.

**ВР**



**Як бы вы згулялі?**

С.Хаміцкі (Беларусь) — С.Паўлаў (Кіеў), III мэмарыял Набокава, 2005. Ход белых. Ці страшны шах на d3?

**Адказ:** ня страшны. Белыя прадоўжылі атаку ходам 1. g6 і пасьля 1…Kd3+ 2. Kpf3! Kb2 3. Фb2 Cf1 27. Фd2 Фe3+ 28. Фe3 Cg2+ 29. Kpf2 Te3 30. Kpe3 Te8+ 31. Kpd3 Ch1 32. Th1 дасягнулі вырашальнай перавагі ў прасторы, паступова заціснуўшы праціўніка.

ВАРТА БАЧЫЦЬ

## Пятніца, 5 жніўня

**БТ, 23:25**

«Сабака–прывід: шлях самурая».

ЗША, 1999, рэж. Джым Джармуш.

Прыгодніцкі баявік.

Сабака-прывід — ваяр, які падпарадкаваў сваё жыцьцё старажытным законам самурайскага гонару. Ён служыць свайму гаспадару, які калісьці выратаваў яго. Аднойчы гаспадар-мафіёзі пасылае Сабаку-прывіда ў няроўную бойку з цэлым злачынным сындыкатам.

Джым Джармуш («Кава і цыгарэты», «Ноч на зямлі») перанёс самурайскую гісторыю на амэрыканскую глебу, а воінам-самураем зрабіў… чарнаскурага актора Форэста Ўітэкера. Мэдытацыя, прыгажосьць і дзікія птушкі — стылёвы выбар Джармуша.

Карціна намінаваная на «Залатую пальму» Канскага кінафэстывалю, прэмію «Сэзар».

## Субота, 6 жніўня

**АНТ, 14:50**

«Мураш Анц».

ЗША, 1998, рэж. Эрык Дарнэл, Тым Джонсан.

Анімацыйны фільм для сямейнага прагляду.

Маленькі мураш лічыць, што жыцьцё яго не ўдалося. Але Анцу пашчасьціла сустрэць прынцэсу Балу. Заканы мураш ідзе на вайну з тэрмітамі — і вяртаецца пераможцам. Разам з прынцэсаю герой выпраўляецца на пошукі мурашынага раю — Насякоміі, дзе заўжды сонца й шмат ежы. На шляху пошукаў становіцца злы генэрал Мэндыбл, які марыць зьнішчыць усю мурашыную калёнію.

Дасьціпная аб'ёмная поўнамэтражная анімацыя. Ажыўленыя кампутарам пэрсанажы выглядаюць як «маленькія» амэрыканцы (беларусы, немцы) — у пошуках сваёй мары.

У арыгінале мураша Анца агучваў актор і рэжысэр Вудзі Ален, вядомы геніяльнымі вобразамі закамплексаваных (і пацешных) інтэлектуалаў. Галасы героям аддалі Крыстафэр Уокен («Мёртвая зона», «Паляўнічы на аленяў») — слынны выдатнымі ролямі псыхапатаў — і Дэн Эйкрайд («Паляўнічыя на прывідаў») — «актор-хамэлеон».

**СТВ, 14:50**

«Кін–дза–дза».

Расея, 1986, рэж. Георгі Данэлія.

Фантастычная трагікамэдыя, прыпавесьць–сатыра.

Прараб дзядзя Ваня (Станіслаў Любшын) і студэнт Гедэван (дэбют Левана Габрыядзэ — сына сцэнарыста фільму Рэзо Габрыядзэ) праз падкопы алькаша-іншапланэтніка трапляюць у дзіўную галяктыку Кін-дза-дза. Там герояў чакаюць расавая сэгрэгацыя пацакаў і чатланаў, тэхнічныя вынаходкі (знойдзеныя на сьметніцы) — і такія прыгоды, якім пазайздросьціла б і Шахеразада.

Карціна здымалася ў пустыні Каракум (дзе тэмпэратура 50—60 градусаў), а сцэны палацу Пжэ разыгрываліся на калясьніках Вялікага тэатру. Касьцюмы пазычаліся зь іншых фільмаў — ці з памыйніц. Вынікі падобнага выбару проста ашаламляльныя: бліскучая й непераўзыдзеная антыўтопія пра загнілае грамадзтва, дзе галоўная валюта — запалкі, а мова абмяжоўваецца складамі «ку» і «кю», дзе антыгравітацыйны пэпэлац праржавеў, — і найвыбітнейшая парачка пацака й чатланіна (Юры Якаўлеў і Яўген Ляванаў).

Карціна зь цяжкасьцю ўбачыла экран: у ёй бачылі намёкі на савецкую рэчаіснасьць.

Фільм аніякім чынам не састарэў і надзвычай пасуе да сёньняшняй Беларусі.

**АНТ, 17.10**

«Сьвятоша».

ЗША, 1998, рэж. Стывэн Гэрэк.

Камэдыя.

Тэлевізійнае шоў «Крама на дыване» ў глыбокім накаўце. Кіраўнік перадачы Рык Хэйман (Джэф Голдблюм — «Муха», «Парк юрскага пэрыяду») ня ведае, што й рабіць, бо гледачам абрыдла нуднарадасная рэкляма. Ад роспачы Хэйман запрашае ў перадачу новага знаёмага Джы (Эдзі Мэрфі – «48 гадзінаў») — усьмешлівага нэгра ў белым балахоне, які зьвяртаецца да людзей з казанямі… Такой рэклямы сьвет яшчэ ня бачыў…

Рэжысэр Стывэн Гэрэк («101 дальматынец») паставіў разумную й цёплую кінакамэдыю.

**СТВ, 23.50**

«У маёй скуры».

Францыя, 2002, рэж. Марына дэ Ван.

Драма, цялесны жах.

Сымпатычная дзяўчына Эстэр (Марына дэ Ван) зьбіраецца памяняць сваю працу й пасяліцца разам са сваім хлопцам Вэнсэнам. Але ўначы Эстэр упала й параніла нагу. Зь яе целам пачынаюць адбывацца пачахлівыя зьмены…

Хаця карціна Марыны дэ Ван выкарыстоўвае шокавыя моманты «цялеснага жаху», гэта адмысловая арт-хаўсная драма-дасьледаваньне.

«Цела звычайна паказваюць як прадмет жаданьня ці як сацыяльны аб'ект, на які цісьне мода, павodзіны, сэкс і культура. Я вырашыла падысьці да гэтай тэмы як мага прасьцей: цела як матэрыя», — кажа Марына дэ Ван.

Прыз за найлепшы замежны фільм на кінафэсьце «Fant-Asia» (Манрэаль).

## Нядзеля, 7 жніўня

**АНТ, 21.05**

«Трафік».

ЗША, 2000, рэж. Стывэн Содэрбэрг.

Крымінальная драма.

Судзьдзя Робэрт Льюіс (Майкл Дуглас) узначальвае ў ЗША барацьбу з наркотыкамі — і перасьледуе клан наркабарона Карласа. Але высьвятляецца, што дачка судзьдзі таксама сталася наркаманкаю…

Чатыры прэміі «Оскар»: найлепшы рэжысэр (Стывэн Содэрбэрг), найлепшая сцэнарная адаптацыя (Стывэн Гэген), найлепшы актор другога пляну (Бэнісія дэль Тора), найлепшы мантаж.

**Андрэй Расінскі**



Змучаныя халодным летам беларусы ніяк ня могуць накупацца. І чаго толькі не прыдумляюць, каб абвастрыць задавальненьне. Так, на кар'ерах бліз Заслаўя аматары экстрэмальнага купаньня замест надзіманых ці пэнапляставых колаў выкарыстоўваюць вялікія бярвёны.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## ВЫСТАВЫ

**Бэнэфіс Кашкурэвіча**
У Нацыянальным мастацкім музэі **да 25 жніўня** працуе выстава твораў Арлена Кашкурэвіча «Concerto Grosso».
У бібліятэцы імя Л.Талстога (вул. Маскоўская, 18) **да 1 верасьня** працуе выстава Арлена Кашкурэвіча — ілюстрацыі да твораў В.Быкава і А.Адамовіча.
Тамсама **да 1 верасьня** працуе выстава «Залучаны на вечнасьць». Творы Арлена Кашкурэвіча, Алены Шарыпы ды іншых, прысьвечаныя Васілю Быкаву.
Тамсама — выстава «Сямейная хроніка Пятра Машэрава».

**Стэфанія Станюта**
**Да 1 верасьня** ў Музэі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (зав.Музычны, 5) працуе выстава, прысьвечаная 100-годзьдзю Стэфаніі Станюты.

**Ад А да Я**
У музэі гісторыі беларускай літаратуры (вул.Багдановіча, 15) **да 1 верасьня** працуе выстава «Ад А да Я. З гісторыі буквара». Можна будзе ўбачыць буквары XX—XXI ст., школьную форму, падручнікі розных гадоў.

**Менск: аблічча гораду**
**Да 20 жніўня** ў гарадзкой мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49) дзейнічае выстава мастацкай фатаграфіі «Менск: аблічча гораду».

**Эцюды макрасьвету**
У Доме фота (вул.Мясьнікова, 78) **да 15 жніўня** працуе фотавыстава Ўладзімера Блінова «Эцюды макрасьвету».

**Ганна ў горадзе**
**Да 1 верасьня** ў галерэі візуальных мастацтваў «Nova» (вул.Веры Харужай, 16) — фотавыстава Ганны Драпезы «Ганна ў гарадах».

**Пушкін і шакалядніца**
У музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Скарыны, 47) **да 6 жніўня** — выстава Віталя Трафімава «Пушкін і шакалядніца».
Тамсама **зь 9 да 27 жніўня** будзе працаваць фотавыстава Віталя Бутырына (Літва). Квіткі: 2 000 руб.

## ЦЫРК

**З 14 жніўня** ў цырку пачынаецца сумесны праект Белдзяржцырку і цырку імя Ю.Нікуліна «Цырк на лёдзе».

## СПОРТ

**Футбол. Чэмпіянат Беларусі. 15 тур**
**Субота, 6 жніўня**
«Дарыда» (Ждановічы) — БАТЭ (Барысаў)
«Дынама» (Берасьце) — «Нафтан» (Наваполацак)
«Нёман» (Горадня) — «Зорка-ВА-БДУ» (Менск)
МТЗ-РІПА — «Гомель»
**Нядзеля, 7 жніўня**
«Лякаматыў» (Менск) — «Тарпэда» (Жодзіна). Хатнія паядынкі «Лякаматыў» праводзіць у Смургонях.
«Славія» (Мазыр) — «Дынама» (Менск)
«Дняпро-Трансмаш» (Магілёў) — «Шахцёр» (Салігорск)

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**Izюм** (206-66-18, 605-25-25)
**4** (чц), 22.00 — «Royalty R'n'B»: dj V (Менск, Нью-Ёрк), special project: «July Hit-parade of New-York».
**5** (пт), 22.00 — «Love Party»: dj Lexa, erotic show.
**6** (сб), 22.00 — «Fusion Party»: dj Lexa, «Иzюм» dance experiment, erotic show.
**7** (ндз), 21.30 — live: «Blues Street»; sunday dance: dj Luxury.

**Madison** (219-00-10)
**4** (чц), 22.00 — dj Nice.
**5** (пт), 23.00 — dj Nice.
**6** (сб), 22.00 — dj Nice.
**7** (ндз), 23.00 — «Бітва бармэнаў» + «Staff Party»

**Белая вежа** (284-69-22, 239-16-00)
**4** (чц), 23.00 — «White Tower»: dj Top, dj Grizzly, dj Bergamo.
**5** (пт), 23.00 — «Браты Грым», канцэрт.
**6** (сб), 1.00 — dj Dee.
**7** (ндз), 23.00 — «Blues Street».
**12** (пт), 23.00 — «Acoustic Band».

**Бліндаж** (219-00-10)
**4** (чц), 23.00 — dj Egor.
**5** (пт), 23.00 — dj Макс Лайтаў.
**6** (сб), 23.00 — dj Макс Лайтаў, dj Egor.
**7** (ндз), 23.00 — dj Макс Лайтаў, dj Egor.

**X-Ray** (223-93-55)
**5** (пт), 22.00 — «Spencer Parker» (Defected, UK), LP aka Paliony.
**6** (сб), 22.00 — dj Noche.

**Presto** (232-54-49, 232-15-79)
**6** (сб), 23.00 — dj Top, dj Bergamo.

**West World Club** (239-16-16)
**6** (сб), 22.00 — «Acoustic Band».

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Усё ці нічога» (прэм'ера): **4—7** (пт—ндз) 14.20 (іл), 16.40, 18.50, 21.10.
«Імпэрыя ваўкоў»***: **5** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **6, 7** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.

**«Бярэсьце»** (272-87-91)
«Джынсы-талісман»: **5** (пт) 14.00, 16.30 (іл), 19.00, 21.10; **6, 7** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.30, 19.00, 21.10.

**«Дружба»** (240-90-13)
«Бэтмэн: пачатак»: **5—7** (пт—ндз) 16.00 (іл), 18.30, 21.00.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Імпэрыя ваўкоў»***: **5** (пт) 16.10, 21.00; **6, 7** (сб, ндз) 13.50 (іл), 16.10, 21.00.
«Усё ці нічога» (прэм'ера): **5—7** (пт—ндз) 18.40.

**«Масква»** (203-14-48)
«Імпэрыя ваўкоў»***: **5** (пт) 16.20, 18.40; **6, 7** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.20, 18.40.
«Усё ці нічога» (прэм'ера): **5—7** (пт—ндз) 21.10.

**«Мір»** (288-22-33)
«Бэтмэн: пачатак»: **5** (пт) 15.30, 18.10, 20.40; **6, 7** (сб, ндз) 15.30 (іл), 18.10, 20.40.
«Джынсы-талісман»: **5—7** (пт—ндз) 14.30, 19.20.
«Горад грахоў»****: **5—7** (пт—ндз) 17.00, 21.20.

**«Перамога»** (203-77-66)
«Джынсы-талісман»: **5** (пт) 14.20, 16.40, 19.00, 21.10; **6, 7** (сб, ндз) 14.20 (іл), 16.40, 19.00, 21.10.

**«Піянер»** (227-64-87)
«Жмуркі»***: **5—7** (пт—ндз) 17.00, 19.00. 21.00.

**«Цэнтральны»** (200-34-16)
«Бэтмэн: пачатак»: **5** (пт) 11.00, 15.50, 18.20, 21.00; **6, 7** (сб, ндз) 11.00 (іл), 15.50, 18.20, 21.00.
«Чумавая пятніца»: **5—7** (пт—ндз) 13.30.

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## ЮНАМУ ГЛЕДАЧУ

**«Аўрора»**
«Пінокіё-3000»: **5** (пт) 10.30; **6, 7** (сб, ндз) 12.30.

**«Бярэсьце»**
«Чароўны востраў»: **5** (пт) 11.00; **6, 7** (сб, ндз) 12.00.

**«Дружба»**
«Супэрсямейка»: **5** (пт) 10.30; **6** (сб) 13.00; **7** (ндз) 11.00.
«Дыназаўр»: **5** (пт) 14.00; **6** (сб) 11.00; **7** (ндз) 13.00.

**«Масква»**
«Шрэк-2»: **7** (ндз) 12.00.

**«Мір»**
«Чалавек-павук-2»: **5** (пт) 10.30.

**«Піянер»**
«Плянэта скарбаў»: **5—7** (пт—ндз) 10.20.
«Пітэр Пэн»: **5—7** (пт—ндз) 12.20.
«Настасься Слуцкая»: **5—7** (пт—ндз) 14.00.

## КІНО НА DVD

**Master Records**
«Кулак, які крычыць»
Драма, Паўднёвая Карэя, 2005, рэж. **Ру Сын Ван.**
У ролях: **Цой Мін Сік, Ру Сын Бом.**
Стары баксер, які працуе на вуліцы «жывой грушай», і малады бандыт. Сустрэча на рынгу — шанец зьмяніцца.

«Схаваны клінок: кіпцюр д'ябла»
Драма, Японія, 2004, рэж. **Ёдзі Ямада** («Самурай з прыцемку»)
У ролях: **Масатосі Нагасе, Такака Мацу.**
Самурай Мунэза закахаўся ў замужнюю жанчыну і атрымаў загад забіць свайго сябра…
Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Прыйдзе шэранькі ваўчок

«Імпэрыя ваўкоў» («L'Empire des loups»)
Францыя, 2005, каляровы, 128 хв.
**Жанр:** маньячна-палітычны трылер.
**Адзнака:** 5 (зь 10).

Жан Крыстоф Гранжэ, аўтар «Барвовых рэк» і «Палёту буслоў», прапанаваў новы пакет францускіх страхаў. «Імпэрыя ваўкоў», пастаўленая паводле яго раману, раскажа пра правалы ў памяці, інтрыгі спэцслужбаў, забойствы і турэцкую нацыяналістычную арганізацыю «Шэрыя ваўкі».

Камісар Поль (Жасьлен Кіўрын) расьсьледуе сэрыйныя забойствы нелегальных імігрантак у турэцкім квартале Парыжу. Па дапамогу малады камісар зьвяртаецца да паліцэйскага-вэтэрана (Жан Рэно), у якога надзвычай кепская рэпутацыя і бандыцкія мэтады.

Аўтары карціны паспрабавалі запіхнуць у фільм усе магчымыя страхі, але так і ня вырашылі, чаго яны баяцца найболей. Кожная лінія патрабуе свайго стылю: тайны агент «успамінае ўсё», з помстаю — калі ласка; ахвяры маньяка — як у найлепшых трупярнях Парыжу; благі паліцэйскі — нож, пальчыкі, адрэзаў.



WWW.FR.MOVIES.YAHOO.COM

Рэжысэр Крыс Наон і апэратар Мішэль Абрамовіч затапілі сюжэтную кашу адвечнымі змрочнашэрымі залевамі, пахавалі ў сьлізкіх падземных калідорах, схавалі ў стэрыльных лябараторыях. Але карціна не набыла ад гэтага паўнавартаснай стылёвай цэласнасьці.

Жан Рэно — як стомлены абскубаны арол, у каляровай кашулі, — разыгрывае звыклую маску годнага садыста-нягодніка (і таленавітага паліцэйскага), каб потым ператварыцца ў ганарова-ўзорнага ваяку, вартага вокладак прапагандысцкіх часопісаў.

Францыя баіцца. Іміграцыя й тэрор выклікаюць страх. Але адпаведнай, завершанай формы для гэтых страхаў ня знойдзена.

**Андрэй Расінскі**

# Таму што кахаемся!



Тандэм Юшчанка—Цімашэнка запусьціў маштабную прапагандысцкую кампанію «Кохаємося». Лёлік Ушкін перайшоў да палявых дасьледаваньняў украінскага сэксу.

Прыкладна год таму «маці гарадоў рускіх» нагадвала сталіцу з оруэлаўскай Акіяніі. Што ні кілямэтар, то білборд, зь якога на цябе лыбіцца Вялікі Брат у асобе Віктара Януковіча. Праўда, былы экспэрт па крадзяжы футравых шапак з публічнай прыбіральні ў Янакіеве не нагадваў, як той Вялікі Брат, што ты, чувак, жывеш у рэаліці-шоў. Подпіс на бігмордзе (гэтак тады называлі білборды) проста канстатаваў — «Таму»: на малюнку Януковіч таму, што патрыёт, таму, што разумная асоба…

Мінуў год, і мой любімы горад зноў затыканы аднатыпнымі білбордамі. Гэтым разам фіялетавага колеру з надпісамі: «Украіне патрэбныя касманаўты. Кахаемся!», «Украіне патрэбныя футбалісты. Кахаемся!», «Украіне патрэбныя «Оскары». Кахаемся!»…

Гэта першая маштабная кампанія ў галіне сацыяльнай рэклямы, якую ініцыяваў Юшчанкаў урад. Мэта павальнага каханьня — «украінцаў павінна быць 52 мільёны чалавек». Задача не такая ўжо і валюнтарыстычная: Цімашэнка ўзьняла бонус за нараджэньне дзіцяці да некалькіх тысяч зялёных.

Аднак больш прыкольна тое, як новая кампанія адбілася на ўкраінскім сэксуальным дыскурсе.

Сёньня любы сэксуальны подзьвіг або заляцаньне трэба разумець як акт ляяльнасьці рэжыму. Клясычная схема флірту палітызуецца: «Марычка, ну давай!..» — «Добра, аднак май на ўвазе: толькі таму, што краіне не хапае касманаўтаў». Як вынік, усе людзі са здаровым сэксуальным тонусам у вачах грамадзтва становяцца «аранжыстамі».

А што ж прадстаўнікі камуністычнай і алігархічнай апазыцыі? Натуральна, як палітычныя апанэнты кіроўнай кааліцыі яны хацелі б, каб кампанія «Кахаемся» гікнулася. Інакш у выніку дэмаграфічнага росту Юшчанка і К° атрымаюць піярную бомбу ды зробяць ім на выбарах у сакавіку’2006 электаральную Хірасіму. Але як канкрэтна павінен выглядаць сабатаж? Даводзіць са спасылкай на статыстыку, што ва Ўкраіне няма столькі сала, каб пракарміць 52 мільёны ратоў? Сьмешна.

Апазыцыянэрам застаецца адно — быць вельмі асьцярожнымі да прапаноў эратычнага характару. «Марычка, ну давай!..» — «Разьбегся! А можа, ты аранжыст хрэнаў? Ідзі да Цімашэнкі». Гэтакая калектыўная асьцярожная рэакцыя апазыцыянэраў на сэксуальныя прапановы адразу стварае ім нэгатыўны імідж — фрыгідных асобаў ды імпатэнтаў.

Як бачым, манапалізацыя і індактрынацыя сэксуальнага жыцьця — сапраўды супэрход аранжавага палітычнага піяру. Цікава, ці імпартуюць айчынныя паліттэхнолягі досьвед Украіны падчас кампаніі 2006 году?

Прыкольна было б убачыць наступным годам уздоўж праспэкту білборды «Краіне не хапае мянтоў. Кахайцеся!», «Краіне не хапае пераможцаў «Дажынак». Кахайцеся!», «Краіне не хапае сяброў будаўнічых атрадаў БРСМ для рэканструкцыі Аўгустоўскага канала. Кахайцеся!». Ну а на БТ замест роліка «Будзь здольная сказаць «Не» запусьціць трэк «Заўсёды кажы «Так!».

Цяжка прагназаваць вынікі такой рэклямы, аднак у любым выпадку антылукашыстам трэба не тармазіць. Як наконт налепак з заклікам «Беларусі не хапае Скарынаў. Кахайцеся!»?



Ліцэнзія №02310100189 ад 24 траўня 2001 году

**АЛЬТУС ПЛЮС**

Наведайце разам з намі
Самыя прыгожыя замкі Ўкраіны
**Камянец-Падольскі і Хоцін**
**19—22 жніўня**

**Праграма туру**
Адпраўленьне зь Менску а 18-й.
**1-шы дзень**
Прыбыцьцё ў Камянец-Падольскі;
Разьмяшчэньне ў гатэлі турклясы;
Паездка ў **«Крышталёвыя пячоры»**;
Экскурсія ў **Хоцінскую крэпасьць**;
**2-гі дзень**
Аглядная пешаходная экскурсія па старажытным Камянцы;
Экскурсія ў Катэдральны касьцёл;
Экскурсія ў Старую крэпасьць;
**Прыбыцьцё ў Менск зранку**
Кошт туру 45 у.е. + 22 000 рублёў.
У кошт уваходзяць транспартныя паслугі, пражываньне ў гатэлі турклясы, экскурсійнае абслугоўваньне.
Уваходныя квіткі аплачваюцца дадаткова.
Адрас: Менск, вул.Кастрычніцкая, 5-320
Т.: 222-46-51

Наша Ніва

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Бацькі і сябры Антона Кішкурны** віншуюць яго з Днём народзінаў, жадаюць яму здароўя, мужнасьці, вытрымкі. Мы заўсёды будзем побач. Рэдакцыя далучаецца для віншаваньняў.

**Родныя віншуюць** шчырую беларусачку Аўгіньню Гучак з 16-годзьдзем і жадаюць ёй зьдзяйсьненьня ўсіх яе мараў.

**Андруся Сяркова** з Днём народзінаў! Жыцьцёвых посьпехаў і бясконцых усьмешак табе! Аленка

**Шукаем** беларускамоўнага тамаду на вясельле. Т.: 680-71-52

### КАНТАКТЫ

**Фэстываль «Аршанская бітва»** пройдзе 3 верасьня на звычайным месцы. Па даведкі тэл.: 319-65-74

**«Малады фронт»** за Беларусь! Далучайся да эўрапейскай моладзі! www.mfront.net. Т.: 755-69-90, 708-02-99

**Тэрмінова здыму** пакой. Найлепш — Паўднёвы Захад, Малінаўка ці ля ст.м. «Інстытут культуры». Т.: 760-76-61 альбо 249-58-70 (увечары). Алена

**Хлопец** 26 гадоў пазнаёміцца зь дзяўчынай для сумесных заняткаў танцамі. dobilas@nkm.lt

**Шукаю адзіную**, непаўторную і самую прыгожую беларусачку! Пра сябе: Алесь, 23/180, мянчук, шчыры беларус; пішу вершы, цікаўлюся гісторыяй.
Чакаю лістоў на e-mail: a.kushner@tut.by

### КНІГІ

**Запрашаем наведаць** — беларускі букініст у Інтэрнэце: http://p-ukinist.at.tut.by/

**Кнігаабмен.** Тэл. 753-91-96

**Прапаную кнігі:** «Беларускі клясычны правапіс», слоўнік Байкова—Некрашэвіча, «Матэматычная энцыкляпэдыя», «Міндоўг — кароль Літовії». Т.: 753-91-96

**Прадам кнігі:** «Беларускае народнае адзеньне» М.Раманюка, «Наша Ніва», 1910 г., факс. выд., «Наша доля», 1906 г., факс. выд., «Беларускі кнігазбор»: Гётэ, Баршчэўскі, «Філяматы і філярэты»; кнігі: Крашэўскі, Цвэйг, Маэм, Рыльке, Брэхт, Гарсія Лорка, МакКалоў, Шэксьпір, Хемінгуэй ды інш., паэзія, проза, пераклады, архітэктура, гісторыя. Т.: 753-70-05

**Куплю** часопіс «Arche»-«Кабеты» № 3, 1999 г. Тэрмінова. Тэл. 762-51-12.

### ПРАЦА

Падпіска на «ARCHE»



**Працягваецца падпіска на штодвухмесячнік «ARCHE». Падпісны індэкс 00345.**

## К О Ш Т Ы

На платныя прыватныя абвесткі
(для прыватных асобаў) на с. 24

**Рэклямныя расцэнкі:**

— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.
За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 4000 руб.
Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 см$^2$ — 650 руб.
Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.
Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.
На зваротным баку блянка паштовага пераказу у сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».

**Даведкі праз т. (017) 284-73-29**